**В.М. Хаданёнак**

Витебский государственный технологический университет

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА НЕАКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (КАСТРЫЧНІК 1915 – КАСТРЫЧНІК 1917 ГГ.)

МАНАГРАФІЯ

**Віцебск**
**2015**

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

*Установа адукацыі*
*“Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”*

Витебский государственный технологический университет

***В.М. Хаданёнак***

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА НЕАКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (КАСТРЫЧНІК 1915 – КАСТРЫЧНІК 1917 ГГ.)

*Манаграфія*

**Віцебск**
**2015**

УДК 940.3/.4
ББК 63.3(2)5
Х-14

**Рэцэнзенты:**

Коршук У. К., прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;

Дулаў А. М., загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. П.М. Машэрава", кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Шчаўлінскі М. Б., дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт", кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Рэкамендавана да выдання рэдакцыйна-выдавецкім саветам УА «ВДТУ», пратакол № 2 ад 27 лютага 2015 г.

**Хаданёнак, В. М.**
**Х 14** Сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (кастрычнік 1915 – кастрычнік 1917 гг.) : манаграфія / В. М. Хаданёнак. – Віцебск : УА "ВДТУ", 2015. – 161 с.

ISBN 978-985-481-363-9

Манаграфія прысвечана сацыяльна-эканамічнаму становішчу насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. На падставе шырокага кола архіўных крыніц разглядаецца прамысловасць, сельская гаспадарка на неакупіраванай немцамі тэрыторыі. Аналізуюцца змены ў стаўленні насельніцтва беларускіх земляў да вайны. Раскрываюцца пытанні мабілізацыі, выкарыстання мясцовых жыхароў на абарончых работах, арганізацыі медыцынскай дапамогі. Даследуюцца праблемы функцыянавання чыгункі і паштова-тэлеграфных аддзяленняў у ваенны час.

Для гісторыкаў, краязнаўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, а таксама ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй нашай Бацькаўшчыны.

**УДК 940.3/.4**
**ББК 63.3(2)5**

**ISBN 978-985-481-363-9**

© Хаданёнак В. М., 2015
© УА «ВДТУ», 2015

Витебский государственный технологический университет

# ЗМЕСТ

Уводзіны……………………………………………………………...... 4
Агульная характарыстыка работы………………… ……………….... 6
**Глава I.** Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання……………… 9
**1. 1** Гістарыяграфія пытання………………………………………......... 9
**1. 2** Крыніцазнаўчая база і метады даследавання..………………………… 144
**Глава II.** Сацыяльнае становішча насельніцтва………………………….. 24
**2.1** Стаўленне насельніцтва беларускіх земляў да вайны……………….. 24
**2. 2** Уплыў мабілізацыі на сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў. Выкарыстанне мясцовага насельніцтва на абаронных работах……………………………………………………... 34
**2. 3** Арганізацыя медыцынскай дапамогі………………………………… 42
**Глава III.** Эканамічнае становішча насельніцтва……………………....... 51
**3. 1** Стан сельскай гаспадаркі ………………………...………………........ 51
**3. 2** Гарадское насельніцтва і стан прамысловасці……………………….. 71
**3. 3** Паштова-тэлеграфная справа і чыгунка……………………………… 85
**Заключэнне**………………………………………………………………….. 103
**Пералік умоўных абазначэнняў**..............…………………………………… 106
**Бібліяграфічны спіс**……………………………………………………….. 107

Витебский государственный технологический университет

# УВОДЗІНЫ

Першая сусветная вайна, у якой прынялі ўдзел каля чатырох дзясяткаў краін з насельніцтвам больш за 1,5 млрд. чалавек, была непадобнай да папярэдніх ваенных канфліктаў і карэнным чынам паўплывала на ўсе падзеі далейшага XX стагоддзя. Яна з'явілася своеасаблівым пераломным момантам у развіцці Еўропы, пасля якога ўжо немагчыма было вярнуцца да ранейшага геапалітычнага ўладкавання свету. Спынілі сваё існаванне магутныя імперыі: Расійская, Асманская, Германская, Аўстра-Венгерская, а на іх месцы ўзнік цэлы шэраг новых дзяржаў: Польшча, Чэхаславакія, Літва, Латвія, Венгрыя, Эстонія, Фінляндыя і г. д.. У стане вайны ўпершыню апынуліся не асобныя краіны ці рэгіёны, а ўся сусветная супольнасць. Агульная колькасць ахвяр перавысіла 10 млн. чалавек, больш за 20 млн. было паранена, каля 7 млн. засталіся калекамі.

За кароткі прамежак часу (1914–1918 гг.) адбыліся істотныя змены ў прамысловай вытворчасці, тэхналогіях, узбраенні і ваеннай тэхніцы, сродках масавай камунікацыі, сістэме эканамічных і сацыяльна-палітычных адносін. Імклівымі тэмпамі развівалася аўтамабілебудаванне, авіяцыя, электраэнергетыка, металаапрацоўка і хімічная прамысловасць. Асаблівую вастрыню набыло нацыянальнае пытанне, у шэрагу краін актывізаваўся сацыялістычны і нацыяналістычны рух, назіраліся істотныя прыкметы мілітарызацыі ўсіх сфер жыцця.

У новых умовах сталі функцыянаваць не толькі дзяржаўныя, але і пераважная большасць грамадскіх інстытутаў. Улады вымушаны былі шырока выкарыстоўваць надзвычайныя органы і метады кіравання, на поўную моц мабілізаваць жыццёвыя рэсурсы краін для як мага больш эфектыўнага ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства, горада і вёскі, фронту і тылу.

Першая сусветная вайна прывяла да таго, што быў трансфармаваны не толькі звыклы лад жыцця і абрысы палітычнай карты свету. Пэўным чынам памяняўся і сам чалавек, яго ментальныя ўстаноўкі і прыярытэты. Адаптацыя да новых умоў існавання патрабавала ад яго ломкі ранейшых стэрэатыпаў свядомасці і паводзін, без якой было нялёгка выжыць у экстрэмальных умовах, на мяжы жыцця і смерці. Істотныя змены адбыліся і ў духоўнай сферы жыцця грамадства. Цэлае пакаленне, якое перажыло жахі гэтай вайны і не здолела пэўным чынам адаптавацца да мірнага часу, было названа "страчаным".

Доўгі час вывучэнне падзей Першай сусветнай вайны зводзілася пераважна да высвятлення пытання "адказнасці" за яе пачатак, аналізу

Витебский государственный технологический университет

ўзброеных сіл канфліктуючых дзяржаў, разбору значных тактыка-стратэгічных вайсковых аперацый. Будзённае ж жыццё насельніцтва часта адыходзіла на другі план ці ўвогуле заставалася па-за межамі гістарычнага даследавання. Часам даходзіла і да замоўчвання ці наўмыснага скажэння гістарычнай рэчаіснасці, таму што Першая сусветная вайна была "непапулярнай" у БССР тэмай побач з распрацоўкай праблем Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

Пытанні, звязаныя з вывучэннем Першай сусветнай вайны, да гэтага часу не знайшлі свайго шырокага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Нягледзячы на наяўнасць адмысловых прац па асобных праблемах вайны (антынямецкі ўзброены рух; бежанства; дэмаграфічныя змены ў складзе насельніцтва ў гады вайны; сялянскі, рабочы і рэвалюцыйны рух; адукацыя на акупіраванай тэрыторыі; антываенныя салдацкія выступленні і інш.), застаецца актуальнай патрэба ў комплексным вывучэнні гаспадарчага жыцця неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, у аналізе жыццёвага ўзроўню і настрояў яе асноўных сацыяльных супольнасцей.

Па-за ўвагаю гісторыкаў засталіся і больш вузкія тэмы: медыцынская дапамога і аказанне санітарна-эпідэміялагічных паслуг; функцыянаванне пошты, тэлеграфа і чыгункі на неакупіраванай тэрыторыі; стаўленне насельніцтва беларускіх земляў да вайны; выкарыстанне людзей на прымусовых абарончых работах; мабілізацыя ў рэгулярную армію; дзейнасць органаў аховы правапарадку; эвакуацыя людзей і матэрыяльных каштоўнасцей; кадравы голад і г. д., без вывучэння якіх немагчыма аб'ектыўна разглядаць гісторыю Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

Прайшло ўжо больш за 100 гадоў пасля пачатку Першай сусветнай вайны. Між тым, звязаныя з ёй падзеі пакуль займаюць досыць сціплае месца ў памяці нашых грамадзян. У краіне, дзе вайна закранула кожнага: і таго, хто ваяваў у складзе рэгулярнай арміі, і мірнага жыхара, што быў змушаны цярпець голад, холад, нястачу, пакутаваць ад хвароб, пакідаць бацькоўскую хату, – да гэтага часу амаль няма помнікаў і музеяў, прысвечаных падзеям Першай сусветнай. У святле гэтага наспела пільная патрэба на аснове новага факталагічнага матэрыялу паспрабаваць пераасэнсаваць адну з найбольш драматычных старонак нашага мінулага, скасаваць пэўныя "белыя плямы" ў нашай гістарычнай навуцы.

Витебский государственный технологический университет

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Мэтай*** даследавання з'яўляецца: паказаць уплыў Першай сусветнай вайны на сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.

У межах сфармуляванай мэты вызначаны наступныя ***задачы:***

1) ахарактарызаваць стаўленне насельніцтва беларускіх губерняў да вайны;

2) выявіць і прааналізаваць становішча гарадскога насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады вайны;

3) паказаць змены, што адбыліся ў сельскай гаспадарцы і жыцці сялян ва ўмовах ваеннага часу;

4) прасачыць уплыў мабілізацыі на сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў; прааналізаваць удзел насельніцтва Беларусі ў абарончых работах ў гады Першай сусветнай вайны;

5) разгледзець асаблівасці становішча рабочых і службоўцаў паштова-тэлеграфнага ведамства і чыгункі ў гады вайны;

6) вызначыць праблемы, якія ўзніклі пры арганізацыі медыцынскай і ветэрынарнай дапамогі ў ваенны час.

***Аб'ект*** даследавання – Віцебская, Магілёўская, частка Мінскай губерні як тылавая зона дзеючых армій у ваенныя гады. ***Прадмет*** - эканамічнае і сацыяльнае становішча насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў кастрычніку 1915 - кастрычніку 1917 гг.

***Храналагічныя рамкі работы*** ахопліваюць перыяд часу з кастрычнка 1915 г. па кастрычнік 1917 г. Яго пачатак супадае са стабілізацыяй лініі фронту і з'яўленнем выразна акрэсленых межаў неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, а канец прыходзіцца на Кастрычніцкую рэвалюцыю, якая прывяла да кардынальных змен у краіне (вывучэнне яе наступстваў выходзіць за межы работы аўтара). Варта зазначыць, што ў першай главе даследавання пасунута ніжняя храналагічная мяжа да ліпеня 1914 г. дзеля таго, каб атрымаць аб'ектыўнае ўяўленне пра тое, якім чынам адбылася эвалюцыя стаўлення мясцовага насельніцтва да ваенных дзеянняў. Усе даты ў манаграфіі прыведзены па старым стылі (па юліянскім календары).

***Геаграфічныя межы даследавання*** былі абраны з улікам прадмета і асноўнай праблематыкі работы. Яны ўключаюць у сябе тэрыторыю трох беларускіх губерняў: Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай, якія не знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй. На ўсходзе тэрытарыяльныя рамкі вызначаны межамі губерняў па іх стане да

Витебский государственный технологический университет

кастрычніка 1917 г., на захадзе – лініяй фронту Дзвінск - Паставы - Смаргонь - Баранавічы - Пінск. У шэрагу выпадкаў дзеля захавання ўнутранай логікі ў даследаванні закраналіся асобныя факты і падзеі, што пэўным чынам выходзілі за абазначаныя тэрытарыяльныя межы.

**Палажэнні, якія выносяцца на абмеркаванне**

1. На ўсім працягу вайны да яе не было адзінадушнага стаўлення. Настроі ў грамадстве мяняліся не толькі ў залежнасці ад сітуацыі на фронце, але і ўнутры Расійскай імперыі. Адрозненні ва ўспрыманні ваенных дзеянняў існавалі нават у межах асобных сацыяльных супольнасцей (рабочыя, сяляне, чыноўнікі, інтэлігенцыя, салдаты). Але ж для пераважнай большасці насельніцтва вайна несла горыч, боль і пакуты, і стаўленне людзей да яе было адпаведным.

2. Сельская гаспадарка неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны знаходзілася ў крытычным стане. Гэта выражалася ў катастрафічным недахопе працоўных рук і сельскагаспадарчых прылад працы, масавым бежанстве, пастаянных рэквізіцыях з боку ваенных і грамадзянскіх улад, неабходнасцю забяспечваць армію ўсім неабходным, у скарачэнні пасеваў і пагалоўя жывёлы, у імклівым росце цэн. На сельскагаспадарчых работах у прыватных гаспадарках актыўна выкарыстоўваліся ваеннапалонныя, што складалі высокі працэнт ад усёй колькасці работнікаў. Цяжкае становішча вёскі тым ці іншым чынам не толькі адбівалася на ўсіх сферах жыцця тагачаснага грамадства, але і ўплывала на сам ход ваенных дзеянняў.

3. Істотныя змены, абумоўленыя ваенным часам, назіраліся ў жыцці гарадскога насельніцтва. Месцічы пакутавалі ад непамерна цяжкай працы, нізкіх заробкаў, рэжыму строгай эканоміі, недахопу жылля, голаду, холаду, няспыннага росту цэн, перыядычных бамбардзіровак з нямецкага боку. Істотна змянілася і сама структура прамысловасці на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. Фабрыкі і заводы вымушаны былі стаць на ваенныя рэйкі. Малыя, у першую чаргу прыватныя прадпрыемствы у большасці выпадкаў спынілі сваю дзейнасць.

4. Правядзенне масавых мабілізацый, актыўнае прыцягненне мірнага насельніцтва неакупіраваных тэрыторый да выканання доўгатэрміновых абарончых работ надзвычай ускладнілі і без таго цяжкае жыццё жыхароў беларускіх земляў. Названыя мерапрыемствы праводзіліся са шматлікімі парушэннямі існуючага заканадаўства. Гэта

Витебский государственный технологический университет

адбывалася як з-за хібаў і недасканаласцей у нарматыўна-прававой базе, так і з-за перагібаў мясцовай адміністрацыі. Такі стан рэчаў выклікаў справядлівае абурэнне мясцовага насельніцтва, якое час ад часу пераходзіла да актыўных формаў барацьбы (разгромы прызыўных пунктаў, узброены супраціў і г. д.). Як вынік, на неакупіраваных беларускіх землях было створана "масава мабілізаванае грамадства".

5. У гады Першай сусветнай вайны рабочыя і службоўцы чыгуначных станцый і работнікі паштова-тэлеграфных устаноў сутыкнуліся са шматлікімі праблемамі многія з якіх так і не былі вырашаны. Найбольш жа яны пакутавалі ад пастаяннага недахопу харчавання, адсутнасці ўласнага жылля, жорсткага рэжыму ўсеагульнай эканоміі, збояў у сістэме выплаты заработнай платы, крадзяжоў на чыгуначных станцыях і прыпынках.

6. Насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны ў поўнай меры зазнала на сабе недахоп кваліфікаваных медыцынскіх работнікаў і амаль поўную адсутнасць фінансавання лячэбных устаноў з боку дзяржавы. Асабліва цяжка пераадольваліся наступствы інфекцыйных хвароб, такіх, як сыпны тыф, дызентэрыя, воспа, халера і інш. Актыўную дапамогу грамадзянскаму насельніцтву аказвалі мясцовыя камітэты Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам і Усерасійскага саюза гарадоў, а таксама прыватныя асобы з высокім сацыяльным і маёмасным статусам.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 1
# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

## 1.1 Гістарыяграфія пытання

Першую сусветную вайну шмат хто з навукоўцаў лічыць “пралогам XX стагоддзя”. Ёй прысвечана вялікая колькасць даследаванняў. Прычым, па асобных пытаннях гісторыкі не могуць прыйсці да паразумення і дагэтуль. У нашай манаграфіі будзе дэталёва разглядацца толькі ўсходнееўрапейская гістарыяграфія Першай сусветнай вайны, а таксама прымаюцца да ўвагі і гістарычныя праблемы, узнятыя ў заходнееўрапейскай і паўночна-амерыканскай гістарычнай навуцы.

Існуе некалькі найбольш грунтоўна распрацаваных перыядызацый гістарыяграфіі Першай сусветнай вайны. На іх аснове аўтар паспрабаваў вылучыць наступныя асноўныя этапы ў даследаванні дадзенай тэмы:

1) 20-я – першая палова 50-х гг. XX стагоддзя;
2) сярэдзіна 50-х – сярэдзіна 80-х гг. XX стагоддзя;
3) канец 80-х гг. XX стагоддзя – да цяперашняга часу.

Пазначаныя этапы разгляду вайны арганічна спалучаюцца з больш вузкай праблемнай тэмай “Сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (кастрычнік 1915 – кастрычнік 1917 гг.)”. Істотных адрозненняў і асаблівасцей у гістарыяграфічным аглядзе паміж гэтымі дзвюма тэмамі неназіраецца.

**Першы перыяд** (20-я – першая палова 50-х гг. XX стагоддзя) у СССР вызначаецца ў першую чаргу зменай метадалагічных парадыгмаў пры разглядзе Першай сусветнай вайны. На вядучыя ролі выйшла марксісцка-ленінская метадалогія. Даследаванне сацыяльна-эканамічных праблем падавалася праз прызму наяўнасці перадумоў для сацыялістычнай рэвалюцыі. Быў вызначаны і прыярытэтны падыход да вывучэння тэмы вайны, а менавіта – класавы. Дэталёва разглядаліся рабочы і сялянскі рух у ваенны час (А.Б. Бяркевіч [33], І.В. Вардзін [46], А.В. Кіржніц [221], Ф.А. Раманаў [369] і інш.), яго ўплыў на надыходзячыя рэвалюцыйныя падзеі. Астатнія сацыяльныя супольнасці былі часова адсунуты на другі план, што істотным чынам зніжала ўзровень даследаванняў.

З-за ўзмацнення ідэалагічнага ўціску і культу асобы шэраг пытанняў па асвятленні падзей Першай сусветнай вайны негалосна апынулася пад забаронай. Так, амаль не вывучаліся пытанні, звязаныя са станам рэлігіі, адукацыі і культурна-асветніцкім рухам у ваенны час. З-за малой колькасці

Витебский государственный технологический университет

рэгіянальных даследаванняў, характэрнай рысай для гэтага перыяду гістарыяграфіі Першай сусветнай вайны было тое, што высновы, зробленыя для цэнтра краіны, распаўсюджваліся на ўсю тэрыторыю імперыі; амаль цалкам ігнараваліся мясцовыя асаблівасці пры вывучэнні вайны.

Выйшлі ў свет грунтоўныя працы, дзе аналізавалася ваенна-стратэгічнае майстэрства як расійскай арміі, так і ўзброеных сіл іншых дзяржаў-удзельніц ваеннага канфлікту: “Свенцянский прорыв” [173], “Барановичи: 1916” [457], “Нарочская операция в марте 1916 г. на русском фронте Мировой войны [348]” і інш.

М.М. Пакроўскі [350; 351; 352] і А.М. Заянчкоўскі [180] заклалі глыбокі падмурак для гістарычных пошукаў у гэтым рэчышчы. Іх цікавіў у першую чаргу ваенны аспект праблемы, пытанні тактычнага і стратэгічнага разгортвання войскаў, асобы военачальнікаў і інш.

Акадэмік М.М. Пакроўскі вялікую ўвагу надаваў вывучэнню дыпламатычнай гісторыі вайны. Асноўную віну за развязванне сусветнага канфлікту ён ускладаў на краіны Антанты, а ўвесь знешнепалітычны курс Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. разглядаўся ім праз прызму барацьбы за чарнаморскія пралівы і гандлёвыя шляхі. Агрэсіўнай палітыцы цэнтральных дзяржаў адводзілася другаснае значэнне. А.М. Заянчкоўскі дэталёва прааналізаваў суадносіны сухапутных, марскіх і паветраных сіл краін перад пачаткам вайны, планы вядзення баявых аперацый. Падрабязна быў абазначаны ўвесь ход ваенных кампаній. Між тым тэарэтычныя высновы і абагульненні А.М. Заянчкоўскага адчулі на сабе даволі моцны ідэалагічны ўплыў, што пэўным чынам адбілася на якасці работы.

Прыярытэтным накірункам даследаванняў стаў разгляд падзей, звязаных з Кастрычніцкай рэвалюцыяй, праз прызму якой і разглядалася Першая сусветная вайна: “Большевики и армия в 1905 – 1917 гг.” [40], “1917 год в Беларуси и на Западном фронте” [229], “Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов, 1917” [75] і інш. Акалічнасці ваеннага часу і ўмовы жыцця насельніцтва часам адыходзілі на другі план. Вялікая ўвага надавалася ў першую чаргу рэвалюцыйным падзеям, партыйна-палітычнай барацьбе і змене ўлады. З другой паловы 1930-х гг. вывучэнне Першай сусветнай вайны знаходзілася ў рэчышчы сталінскага “Краткого курса истории ВКП(б)”. Навукоўцы павінны былі строга прытрымлівацца партыйнай лініі, што прывяло да залішняй тэндэнцыйнасці і аднабокасці даследаванняў.

Вопыт аказання медыцынскай дапамогі і вядзення гаспадаркі на неакупіраванай тэрыторыі ва ўмовах ваеннага часу быў актыўна запатрабаваны ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны [346; 363].

Катастрафічны ўплыў ваенных дзеянняў на гаспадарку краіны паказаны ў працах Г.І. Шыгаліна [506]. Ён пераканаўча абгрунтоўвае меркаванне аб тым,

Витебский государственный технологический университет

што заняпад народнай гаспадаркі краіны быў адной з асноўных перадумоваў сацыялістычнай рэвалюцыі. У рабоце “Военная экономика в первую мировую войну” Г.І. Шыгалін прыводзіць статыстычныя дадзеныя развіцця гаспадаркі, аналізуе ваенна-эканамічную падрыхтоўку Расійскай імперыі перад вайной. Асаблівая ўвага надаецца крыніцам харчовага забеспячэння арміі, вытворчасці зброі, баепрыпасаў, перабудове грамадзянскай прамысловасці на ваенны лад, зменам у складзе рабочых.

Цяжка пераацаніць ролю А.Л. Сідарава [402; 406] і А.П. Паграбінскага [345; 346; 347] ў вывучэнні эканамічнай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны. А.П. Паграбінскі разгледзеў дзейнасць органаў земскага і гарадскога самакіравання, прааналізаваў іх адносіны з урадавымі структурамі. Значнае месца ў яго работах займае праблема функцыянавання ваенна-прамысловых камітэтаў, іх эканамічная і палітычная дзейнасць. А.Л. Сідараў асвятляў пытанні, звязаныя з эвакуацыяй прамысловых аб’ектаў у тылавыя раёны, вырашэннем харчовай праблемы, функцыянаваннем чыгункі, мілітарызацыяй прамысловай вытворчасці. У дынаміцы быў паказаны рост залежнасці фабрык і заводаў ад банкаўскай фінансавай дапамогі. Працы названых аўтараў асабліва карысныя тым, што яны напісаны на аснове шырокай базы крыніц; значнае месца займаюць у іх і звесткі па эканамічнай гісторыі неакупіраваных беларускіх губерняў.

**Другі перыяд** (сярэдзіна 50-х – сярэдзіна 80-х гг. ХХ стагоддзя) пачаўся з кароткачасовага паслаблення ідэалагічнага ўціску на даследчыкаў. Пасля ХХ з’езда КПСС у навуковы ўжытак была ўведзена вялікая колькасць раней засакрэчаных архіўных крыніц, ліквідаваны асобныя “белыя плямы” ў даследаваннях перыяду Першай сусветнай вайны. Былі пашыраны магчымасці гісторыкаў пры трактоўцы тых ці іншых падзей ваеннага часу. Але захавалася моцная залежнасць гістарычнай навукі ад партыйнай дактрыны пры вырашэнні тэарэтыка-метадалагічных праблем.

Інстытутам гісторыі АН СССР была выдадзена грунтоўная абагульняльная праца “Первая мировая война” [335], дзе закраналіся праблемы дыпламатыі, эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця ў гады Першай сусветнай вайны. Істотнае месца ў ёй адведзена неакупіраваным беларускім губерням, паказана становішча як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Разгледжаны транспартная і фінансавая сістэмы, эвалюцыя гандлёвых адносін. Асобная ўвага нададзена сялянскаму і рабочаму руху.

Працягвалася вывучэнне гісторыі Першай сусветнай вайны па асноўных накірунках: ваенна-гістарычны, сацыяльна-палітычны, эканамічны: “Экономические и социальные проблемы первой мировой войны” [407], “Экономическое положение России в годы Первой мировой войны” [408], “Формирование государственно-монополистического капитализма в России в

Витебский государственный технологический университет

годы Первой мировой войны” [435] і інш. Каштоўныя звесткі па эканамічным жыцці неакупіраваных беларускіх губерняў, праўда, не вылучаючы іх з агульнарасійскага шэрага, падае ў сваім даследаванні С.В. Цюцюкін [447]. Аналізуе ён і працэс эвалюцыі грамадскіх настрояў, змены ў паводзінах і палітычных перакананнях народных мас, узмацненне рэвалюцыйных настрояў у асяроддзі рабочых.

Палітычнаму жыццю на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў згаданы перыяд прысвечана дысертацыя Э.М. Савіцкага “Революционное движение в Белоруссии в годы Первой мировой войны и русской революции (июль 1914 – март 1917 г.” [386]. Нягледзячы на пераважную скіраванасць на вывучэнне рэвалюцыйных падзей, у працы разглядаецца і эканамічнае становішча неакупіраваных беларускіх губерняў (скарачэнне цэнзавых прадпрыемстваў і колькасці рабочых, змяншэнне пасяўных плошчаў, рост цэн на прамысловыя і харчовыя прадукты). Праца багатая на каштоўны статыстычны матэрыял.

Пры вывучэнні становішча сельскай гаспадаркі ў ваенны час надзвычай каштоўнымі з’яўляюцца працы А.М. Анфімава [9; 10]. На аснове вялікай колькасці крыніц (у першую чаргу статыстычных дадзеных земскіх перапісаў), аўтар прааналізаваў уплыў Першай сусветнай вайны на сялянскую гаспадарку, паказаў істотнае маёмаснае расслаенне вясковага насельніцтва, якое неўзабаве прывяло да сацыяльнага выбуху.

Л.П. Ліпінскі ў сваіх працах [255; 256] разглядае становішча вясковага насельніцтва, яго пратэстныя настроі, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сялянскіх гаспадарак: колькасць свойскай жывёлы, выкарыстанне ўгнаенняў, памеры скарачэння пасяўных плошчаў, выкарыстанне сялян на прымусовых акопных работах. Нягледзячы на пэўны ўплыў ідэалогіі на канцэптуальную пазіцыю навукоўца, указаныя даследаванні былі аднымі з самых грунтоўных для вывучэння сельскай гаспадаркі на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

Функцыянаванне легальнага друку, уплыў дзяржаўнай агітацыі і прапаганды на настроі насельніцтва прааналізаваў у сваёй рабоце А.Ф. Беражны [32]. Была разгледжана дзейнасць царскага ўрада і ваеннага камандавання ў справе кіравання прэсай, узмацненне ваеннай цэнзуры і інш.

**Трэці перыяд** (канец 80-х гг. XX стагоддзя – да цяперашняга часу) выдзяляецца ў першую чаргу тым, што былі перагледжаны і пераасэнсаваны шмат якія аспекты гісторыі Першай сусветнай вайны. Погляд вучоных на яе стаў больш збалансаваны. Напрыклад, у працах “Рабочие России и война: новые подходы к анализу проблемы” [225], “Первая мировая война: история и психология” [337], “Политические партии России и массовое политическое сознание действующей русской армии в годы Первой мировой войны (июль 1914 – март 1918 гг.)” [494] і інш. адбыўся зварот да раней непапулярных тэм:

Витебский государственный технологический университет

адукацыя і культура ў гады вайны, менталітэт, масавая псіхалогія, сацыяльныя паводзіны, чалавек у экстрэмальных умовах.

На аснове вялікай колькасці выкарыстаных крыніц, глыбока прааналізавала уплыў вайны на становішча сялян, рабочых і салдат В.С. Поршнева [355; 356; 357]. Яна спраектавала ідэальную мадэль структуры грамадскай свядомасці асноўных сацыяльных супольнасцей. А.С. Сяняўская ўдала паспрабавала выбудаваць абагулены сацыяльна-псіхалагічны партрэт франтавікоў [398; 399; 400].

Айчыннымі даследчыкамі пры дапамозе новых метадалагічных прыёмаў стала актыўна вывучацца непасрэдна тэрыторыя Беларусі: "Антынямецкі ўзброены рух на Беларусі ў 1918 г." [13], "Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.)" [248], "Серафимовский лазарет при Минской духовной семинарии в годы Первой мировой войны (1914–1917)" [514] і інш.

Грунтоўна даследваў працэсы, звязаныя з развіццём адукацыі ў ваенны час, У.В. Ляхоўскі [261; 262; 263]. У асноўным аналізавалася акупіраваная немцамі тэрыторыя. Асаблівая ўвага была звернута аўтарам на ўплыў адукацыйнага фактару на рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

У Расіі па ініцыятыве акадэміка Ю.А. Пісарава пры аддзяленні гісторыі Расійскай акадэміі навук была створана Асацыяцыя па вывучэнні гісторыі Першай сусветнай вайны. Пры дапамозе гэтай арганізацыі былі наладжаны шчыльныя кантакты і супрацоўніцтва гісторыкаў з розных краін свету. Была праведзена вялікая колькасць сумесных канферэнцый і "круглых сталоў" ("Первая мировая война и XX век" – Масква, 1994 г.; "Россия в Первой мировой войне" – Санкт-Пецярбург, 1998 г.; "Россия и окончание Первой мировой войны" – Масква, 1998 г.; "Первая мировая война и современный мир" – Масква, 2010 г. і інш.), пабачылі свет навуковыя зборнікі і манаграфіі [341], [502], [64] і інш.

Абаронены цэлы шэраг дысертацый як расійскімі і ўкраінскімі гісторыкамі: А.В. Арановіч, Т.А. Белагурава, Д.Г. Гужва, П.А. Кюнг і інш. [11; 31; 88; 93; 235; 246], так і айчыннымі: В.Р. Карнялюк, У.В. Ляхоўскі, Л.Г. Цвыраў [216; 261; 482]. У пераважнай сваёй большасці дысертацыі расійскіх і ўкраінскіх даследчыкаў у сучасны перыяд скіраваны на вывучэнне пэўных рэгіёнаў: "Тамбовское земство в годы Первой мировой войны 1914 – 1918 гг." [7], "Отношение населения Поволжья к Первой мировой войне" [436], "Политика Российской империи в Восточной Галиции в годы Первой мировой войны" [25] і г. д.

Шматпланавасцю ў даследаванні падзей Першай сусветнай вайны на беларускіх землях вылучаюцца працы М.В. Цубы. Ён вывучае як грамадска-



Витебский государственный технологический университет

палітычны, сацыяльна-эканамічны бакі, так і ваенны [486; 487; 489]. Асабліва вылучаецца работа “Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі): 1914–1918 гг.”, напісаная на аснове новых метадалагічных падыходаў.

Бежанства, беларускую культуру і нацыянальны рух, дзяржаўна-палітычную сітуацыю ў Беларусі ў ваенны час грунтоўна аналізуе М.Б. Шчаўлінскі: “Государственно-политическое и национально-культурное самоопределение Беларуси в годы Первой мировой войны (1914 – 1918)” [513], “Беларуская культура ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – 1918 гг.)” [509] і інш.

Вялікая колькасць даследаванняў прысвечана разгляду ўмоў жыцця бежанцаў і праблемам, з якімі яны мусілі сутыкнуцца ў гады вайны: “Рух бежанцаў у гады Першай сусветнай вайны праз Беларусь: этнанацыянальныя аспекты” [377], “Проблема беженцев в Беларуси в годы первой мировой войны” [389]. Актыўна вывучае дзейнасць грамадскіх і дзяржаўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам С.Ф. Лапановіч [247; 248].

Удзел беларусаў у ваенных дзеяннях на тэрыторыі Прусіі, Галіцыі і Польшчы, умовы заключэння перамір’я на Заходнім фронце ў 1917 г., рост антываенных настрояў у арміі і інш. пытанні дэталёва прааналізаваны М.М. Смальянінавым у рабоце “Беларусь в Первой мировой войне 1914 – 1918 гг.” [414].

## 1. 2 Крыніцазнаўчая база і метады даследавання

Крыніцы, дзе разглядаюцца падзеі Першай сусветнай вайны, можна ўмоўна падзяліць на дзве вялікія групы: дакументальныя і апавядальныя. У сваю чаргу, сярод дакументальных крыніц можна вылучыць дакументы заканадаўства, матэрыялы справаводства і статыстычныя матэрыялы. Да апавядальных крыніц адносяцца мемуары, эпісталярныя крыніцы, літаратурныя і публіцыстычныя творы. Спецыфічным відам крыніц з’яўляецца перыядычны друк, які лёгка можна аднесці як да дакументальных, так і да апавядальных крыніц. Падчас працы над даследаваннем аўтарам выкарыстоўваліся архіўныя фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, дзяржаўных архіваў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей, а таксама занальнага дзяржаўнага архіва ў горадзе Полацку.

Заканадаўчыя акты з’яўляюцца адной з найбольш важных груп крыніц для вывучэння сацыяльна-эканамічнага становішча неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Пераважная большасць законаў, указаў і пастаноў таго часу апублікавана ў зборніках дакументаў, якія выйшлі ў 1914–1918 гг. Сярод іх вылучаюцца “Важнейшие законы, указы и

Витебский государственный технологический университет

распоряжения военного времени: сб. законов, манифестов, указов Правительства Сенату и министрам” [45], “Дневник войны России с Германией, Австро-Венгрией и Турцией: сборник высочайших манифестов, воззваний и телеграмм Верховного главнокомандующего, правительственных сообщений и официальных телеграмм о ходе военных действий” [165], “Законодательные акты, вызванные войною 1914–1915 гг.: законы, манифесты, рескрипты, указы, положения Совета министров, военного и адмиралтейств советов: распоряжения и постановления министров и др.” [181], “Сборник узаконений, постановлений и распоряжений по продовольственному делу (общего характера), вышедших в период времени с 1 августа 1917 г. по 15 июля 1918 г.” [392] і інш.

Цэлы шэраг нарматыўна-прававых дакументаў перыяду Першай сусветнай вайны знаходзіцца ў абласных і занальных архівах Беларусі. Так, у 5-ым фондзе ДАВВ можна знайсці пастановы камітэта харчавання аб правядзенні закона аб хлебнай манаполіі і ўстанаўленні цвёрдых цэн на муку і вотруб’е [98]. 573-і фонд ДАВВ змяшчае ў сабе загады начальніка ваенных зносін Заходняга фронта за 1917 г. па Рыга-Арлоўскай чыгунцы [119]. Дэкрэты Віцебскага губернскага савета сялянскіх, рабочых, салдацкіх і батрацкіх дэпутатаў змяшчае ў сабе 994 фонд ДАВВ [122]. Загады па Дзвінскай ваеннай акрузе, абавязковыя пастановы Галоўнакамандуючых Паўночнага і Заходняга франтоў, абавязковыя пастановы міністра гандлю і прамысловасці змяшчае ў сабе 2289 фонд ДАВВ [128; 129; 130; 131; 132; 133; 134; 135].

Пэўная колькасць нарматыўна-прававых дакументаў, якія тычацца Першай сусветнай вайны, захоўваецца ў ДАГВ. На аснове 23-га фонду можна прасачыць змены ў заканадаўстве, якія закранал і гарбарную справу [139]. Загады па Мінскай паштова-тэлеграфнай акрузе захоўваюцца ў 536-м фондзе [141].

234-ты фонд ДАМВ змяшчае ў сабе копіі цыркуляраў міністэрства харчавання і галоўнага ўпраўлення міліцыі аб размяшчэнні, ахове, аплаце працы і выкарыстанні ваеннапалонных для работы на прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы [152]. Цыркуляры Магілёўскага губернскага зямельнага камітэта аб працы павятовых і валасных зямельных камітэтаў захоўваюцца ў 629-м фондзе [160].

Цыркуляры МУС Расійскай імперыі Галоўнага ўпраўлення пошты і тэлеграфа [189] і цыркуляры па Смаленскай паштова-тэлеграфнай акрузе [194] захоўваюцца ў ЗДАП.

Але ж, пераважная большасць заканадаўчых дакументаў, якія адносяцца да падзей Першай сусветнай вайны на неакупіраванай тэрыторыі, знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Там можна знайсці цыркуляры галоўнага штаба – 586-ты фонд [299], Маніфест аб абвяшчэнні ваенных



Витебский государственный технологический университет

дзеянняў паміж Расіяй і Германіяй – 1416-ты фонд [305], указ Сената аб абвяшчэнні Віцебскай губерні на ваенным становішчы [306], указ Сената аб мабілізацыі [307], указ Сената аб ваеннай службе ратнікаў апалчэння 1-га разраду [309] і інш.

Матэрыялы справаводства складаюць адну з самых вялікіх груп дакументаў. Да іх адносяцца арганізацыйна-распарадчыя і фінансава-разліковыя дакументы дзяржаўных устаноў, пратаколы пасяджэнняў прадпрыемстваў і арганізацый, рознага кшталту інструкцыі, службовыя лісты і тэлеграмы і інш. Матэрыялы справаводства з'яўляюцца вельмі карыснымі для вывучэння гаспадарчага і грамадскага жыцця насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ва ўмовах ваеннага часу.

Пэўная колькасць матэрыялаў справаводства, на аснове якіх можна вывучаць гісторыю Першай сусветнай вайны на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, да гэтага часу апублікавана [279; 442; 495; 496; 517]. Шмат дакументаў справаводства захоўваецца ў архівах. Так, у НГАБ можна знайсці пастановы і пратаколы пасяджэнняў Мінскай губернскай харчовай камісіі, яе ліставанне з іншымі арганізацыямі і ўстановамі [288; 289; 290; 294; 298]. На аснове гэтых дакументаў можна прасачыць дакладныя цэны амаль на ўсе прадукты харчавання, барацьбу з перакупшчыкамі і спекулянтамі, захады па вырашэнні праблемы недахопу тых ці іншых неабходных прадуктаў. Санітарнае і медыцынскае абслугоўванне насельніцтва добра адлюстравана ў 1102-м (Мінскае таварыства па аказанні дапамогі хворым і праязджаючым воінам) [301; 302; 303], 2513-м (Урачэбнае аддзяленне Віцебскага губернскага праўлення) [310] і іншых фондах. Тут знаходзяцца статут, справаздачы і пратаколы пасяджэнняў Мінскага таварыства па аказанні дапамогі хворым і праязджаючым воінам; звесткі аб аплаце за ўтрыманне салдат і мясцовага насельніцтва ў шпіталях і інш.

Становішча прамысловых прадпрыемстваў і сітуацыя ў сферы гандлю на неакупаванай тэрыторыі адсочваюцца ў 924-м фондзе (фанерная фабрыка Лур'е) [300], 2707-м (Віцебская ільнопрадзільная фабрыка "Дзвіна") [311; 312; 313], 2718-м (Маслабойны завод Мнухіна і Свердліна) [314] і іншых фондах. Тут падаюцца звесткі аб тавараабароце прадпрыемстваў, паказаны няпростыя шляхі дастаўкі неабходнай сыравіны для заказчыкаў, каштарысы і квітанцыі аб выплаце заробкаў службоўцам і інш.

Цэлы шэраг каштоўных дакументаў справаводства, якія ўтрымліваюць звесткі пра падзеі Першай сусветнай вайны, захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласці (ДАМВ). Фонд 1 (Магілёўскі губернскі савет народнай гаспадаркі) змяшчае ў сабе пратэст Магілёўскай губернскай земскай управы Германскаму імперскаму канцлеру, Вярхоўнаму камандаванню германскай 10-й арміі і Магілёўскаму павятоваму ваеннаму начальніку супраць вывазу з

Витебский государственный технологический университет

межаў губерні рэквізаваных прадуктаў; даведкі аб забеспячэнні насельніцтва губерні харчаваннем і іншыя дакументы [149].

У 670-м фондзе ДАМВ знаходзяцца справы аб земскіх зборах з насельніцтва ў ваенны час [163]. 464-ты фонд змяшчае ў сабе пастановы Мсціслаўскай павятовай па воінскай павіннасці Прысутнасці аб асобах, што загінулі, зніклі без вестак або памерлі ад раненняў на вайне; ліставанне з Мсціслаўскай павятовай зямельнай управай аб рэквізіцыі прадукцыі і аб забароне высечкі лесу [157; 158]. Фонд 394-ты цікавы перш за ўсё тэлеграмамі і звесткамі органаў разведкі і начальнікаў міліцыі аб вышуку беглых арыштантаў, пошуку скрадзенай жывёлы ў прыфрантавой паласе, аб затрымцы асоб з казённымі грашыма і інш [155].

Эканамічнае становішча на неакупіраванай тэрыторыі ў гады вайны дапаможа разгледзець 629-ты фонд. Ён змяшчае ў сабе справы аб размеркаванні сенажацей сярод насельніцтва воласці ў 1917 г., а таксама тэлеграмы Магілёўскаму губернскаму зямельнаму камітэту, адозвы святароў да мясцовага насельніцтва і іншае [161]. 423-ці фонд змяшчае ў сабе шэраг дакладных запісак аб эвакуацыі дарожнай маёмасці з горада Магілёва [156]. У 671-м фондзе можна знайсці дакументы, звязаныя з фіскальнымі аперацыямі і падаходнымі падаткамі [164]. Гарбарная вытворчасць у гады вайны была надзвычай важнай справай і знаходзілася пад пільным наглядам з боку дзяржавы. Разгледзець гэтае пытанне дапаможа 62-гі фонд. Там змешчана ліставанне мясцовых органаў улады з загадчыкам збору скур, дакументы аб здачы скур прыватным прадпрымальнікам [150] і інш.

У ДАВВ знаходзіцца шмат матэрыялаў па становішчы членаў прафсаюзаў у гады Першай сусветнай вайны. Гэтай тэматыцы адпавядаюць фонды 52 і 39. У гэтых фондах змешчаны пратаколы пасяджэнняў праўлення Віцебскага губернскага аддзялення УСРМ; пратаколы пасяджэнняў агульных сходаў служачых Віцебскага гарадскога водаправода; праграма VII з'езда Усерасійскага саюза рабочых гарадоў; спісы рабочых і службоўцаў Віцебскага водаправода; заявы аб прыняцці ў члены прафсаюза металістаў; рознага кшталту анкетныя лісты; пратакол пасяджэнняў Паўночнай абласной нарады прафесійных саюзаў рабочых гарбарнай вытворчасці і матэрыялы да яго; заявы членаў прафсаюза аб паляпшэнні ўмоў працы; пратаколы пасяджэнняў канфліктнай камісіі прафсаюза рабочых металістаў; пасведчанні членаў саюза металістаў; пратаколы сходаў рабочых ігольнай фабрыкі Левінсона і іншыя дакументы [103; 104; 105].

Асаблівую цікавасць для вывучэння стану сельскай гаспадаркі на неакупіраванай тэрыторыі ўяўляюць сабой наступныя фонды ДАВВ: 5 і 954. Яны змяшчаюць у сабе цэлы шэраг каштоўных дакументаў: журналы нарад і Міністэрства харчавання па пытаннях харчу; пастановы з'ездаў прадстаўнікоў

Витебский государственный технологический университет

губернскіх харчовых камітэтаў; журналы нарад загадчыкаў нарыхтоўкай сена ў паветах Віцебскай губерні; справы аб прыёме і здачы сена ў Віцебскім павеце; маршруты рэквізіцый буйной рагатай жывёлы па Віцебскім павеце для патрэб арміі [99; 100; 101; 125;126] і інш.

Шмат матэрыялаў па функцыянаванні чыгункі ў ваенны час знаходзіцца ў ДАВВ у фондах 106 і 573. У прыватнасці, яны змяшчаюць пратаколы камісіі па раскватараванні чыгуначнікаў, якія пражывалі ў вагонах; прашэнні на імя начальніка станцыі "Віцебск" ад эвакуіраваных з Рыгі; тэлеграфныя паведамленні Упраўленню дарогі аб хуткіх, пасажырскіх і змешаных цягніках і аб перавозцы пасажыраў; палажэнне начальніка дарогі аб тэхнічна-гаспадарчых камітэтах па Рыга-Арлоўскай чыгунцы; ліставанне з цэнтральным харчовым камітэтам Рыга-Арлоўскай чыгункі аб забеспячэнні супрацоўнікаў [114; 115; 116; 121] і інш.

Звесткі аб рабоце пошты і тэлеграфа ў гады вайны змешчаны ў 263-м фондзе ЗДАгП. Ён змяшчае ліставанне са Смаленскім паштова-тэлеграфным упраўленнем; ведамасці са справаздачамі аб прыбытках паштовых аддзяленняў за лістапад-снежань 1917 г.; ліставанне з паштовымі аддзяленнямі аб руху карэспандэнцыі; ведамасці на выдачу заробкаў служачым канторы [191; 192; 195] і інш.

Шмат карыснай інфармацыі з розных сфер жыцця ў гады Першай сусветнай вайны можна знайсці ў 51-м фондзе ЗДАгП. У прыватнасці, там змяшчаюцца справы аб асігнаванні сродкаў на ўтрыманне настаўнікаў земскіх вучэльняў Полацкага павета; ведамасці на выдачу заработнай платы работнікам аддзелаў павятовага выканкама; анкетныя лісты і рэгістрацыі замежных грамадзян [184; 185] і іншае.

Найбольш важнымі крыніцамі для вывучэння сацыяльнай і эканамічнай сітуацыі на неакупіраваных беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны з'яўляюцца статыстычныя дакументы. Істотная іх частка была выдадзена яшчэ ў 1914-1918 гг. Сярод іх варта адзначыць наступныя: "Всероссийская сельскохозяйственная перепись 1916 г. Могилёвская губерния: итоги предварительного подсчета населения, скота и посевов" [72], "Положение молочного хозяйства России до и во время войны" [354], "Могилёвское губернское земство. Статистический отдел. Бюллетень № 4. Состояние хлебов и трав к 20 июня 1917 г." [280], "Труды ветеринарного съезда при Губернской земской управе 18–21 июня 1917 г." [442], "Статистический обзор Могилёвской губернии по 1914 год" [425], "Цены на главнейшие продукты, предметы сельского хозяйства в Могилёвской губернии за 1917 г." [483] і інш.

Шмат каштоўнай інфармацыі аб падзеях Першай сусветнай вайны на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі змяшчаюць у сабе наступныя зборнікі дакументаў: "Беларусь в годы Первой мировой войны (1914 – 1918)" [27],

Витебский государственный технологический университет

“Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 – 1917 гг.)” [166], “Разгром немецких захватчиков в 1918 г.: Сборник документов и материалов” [364], “Революционное движение в Белоруссии, июнь 1907 – февраль 1917” [365] і інш.

Пры вывучэнні падзей ваеннага часу нельга абыйсціся без выкарыстання апавядальных крыніц. Шмат якія ўспаміны выдатных военачальнікаў, палітыкаў, грамадскіх дзеячаў, шараговых салдат змяшчаюць у сабе звесткі аб падзеях Першай сусветнай вайны. Варта ўзгадаць А.А. Брусілава [42], М.К. Лемке [252; 253], Э. Людэндорфа [260], М. Палеолаг [332], Ю. Вітан-Дубейкаўскую [61], Р.І. Шавельскага [499] і інш. Гэтая група крыніц асабліва каштоўная тым, што дазваляе рэканструяваць асобныя малавядомыя сацыяльна-эканамічныя падзеі і працэсы, якія непасрэдна альбо ўскосным чынам паўплывалі на ўмовы існавання насельніцтва ў ваенны час. Асобныя шчырыя па духу ўспаміны, апроч таго, што маюць высокі літаратурны ўзровень, даюць нам цікавыя звесткі аб дзейнасці і функцыянаванні ў ваенны час розных грамадскіх арганізацый і ўстаноў, шпіталяў, пунктаў догляду і харчавання і інш.

Багаты факталагічны матэрыял змяшчае ў сабе праца М.К. Лемке, які ў гады Першай сусветнай вайны даволі працяглы час з’яўляўся афіцэрам Бюро друку пры Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага [252; 253]. На яго аснове можна зразумець, якія сацыяльна-псіхалагічныя настроі панавалі ў грамадстве ў пачатку і на ўсім працягу вайны і што істотным чынам паўплывала на іх эвалюцыю.

Вялікую ролю для даследчыкаў, якія вывучаюць падзеі Першай сусветнай вайны, адыгрываюць мемуары Эдварда Вайніловіча [66]. Аўтар надзвычай эмацыйна апісвае адносіны насельніцтва беларускіх земляў да ваенных дзеянняў, разважае пра акупацыйны рэжым, мабілізацыйныя мерапрыемствы, бежанства і г. д. Успаміны арганічна дапаўняюцца цэлым шэрагам афіцыйных дакументаў.

Каштоўныя звесткі аб праблемах бежанства знаходзяцца ў дзённікавых запісах Ф. Кудрынскага [244]. Ён паказвае стан гарадоў і мястэчак на самым пачатку вайны, апавядае пра дзейнасць розных дабрачынных арганізацый, што аказвалі дапамогу бежанцам. Шмат увагі Ф. Кудрынскі надае аналізу эвакуацыйных мерапрыемстваў царскага ўрада, прычым, разглядае іх з розных бакоў.

Жыццё ў горадзе Мінску падчас вайны яскрава апісвае ў сваіх дзённікавых запісах непасрэдны ўдзельнік трох рэвалюцый – І. Голубеў [85]. З іх добра бачна, з якімі цяжкасцямі прыйшлося сутыкнуцца гарадскому насельніцтву ў часы ваеннага ліхалецця (адсутнасць даху над галавой, харчовы



Витебский государственный технологический университет

і паліўны крызіс, спекуляцыя і перакупніцтва, недахоп кваліфікаваных медыцынскіх работнікаў і г.д.).

Пры вывучэнні асобных момантаў Першай сусветнай вайны важную ролю адыгрываюць таксама тагачасныя перыядычныя выданні, якія былі своеасаблівым "пульсам" падзей: "Беларуская зямля", "Вольная Беларусь", "Наша Ніва", "Новое время", "День", "Магілёўскі веснік", "Беларускі шлях" і інш. Публікацыі ў прэсе дапаўняюць наша ўяўленне аб падзеях таго часу яскравымі замалёўкамі з сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны ці асобнага рэгіёна, адлюстроўваюць грамадскую думку і інтарэсы розных сацыяльных груп.

Каштоўнымі крыніцамі з'яўляюцца і публікацыі непасрэдных удзельнікаў ваенных дзеянняў і сучаснікаў падзей 1914-1918 гг. Для дадзеных работ перш за ўсё характэрны апісальны характар, без глыбокага аналізу і асэнсавання рэчаіснасці. Абсалютная большасць прац, у прыватнасці, была прысвечана вядзенню баявых дзеянняў, апісанню аперацый, узбраення варожых бакоў, стратэгічнаму разгортванню войск, разгляду асобных геройскіх учынкаў [62; 58; 89]. Вайна яшчэ была зусім "побач" з аўтарамі, і таму ўказаныя працы змяшчаюць у сабе вялікую долю суб'ектыўнасці. Асабліва добра гэта тэндэнцыя прасочваецца пры спробе аўтараў высветліць, хто быў адказны за пачатак вайны, ці можна было яе пазбегнуць альбо адцягнуць [240; 393; 409; 455; 1; 323]. Але ж у распрацоўцы пытанняў ваеннай гісторыі яны вельмі каштоўныя.

Некаторыя работы, прысвечаныя падзеям Першай сусветнай вайны, насілі яскрава выражаны ідэалагічны характар і пісаліся перш за ўсё ў прапагандысцкіх мэтах: "Солдатская памятка о немецких зверствах", "Машинно-истребительная культура: Об источниках немецкого зверства", "Патриотизм и революционная Россия", "Великая война и женщины русские" і інш. [243; 367; 2; 12; 520; 20]. Асноўнае месца ў іх займала апісанне беспадстаўнай жорсткасці ворага, якое шырока выкарыстоўвалася для падтрымкі на належным узроўні антынямецкіх настрояў у грамадстве. Тым не менш указаныя работы, якія лёгка аднесці да публіцыстыкі, могуць быць цікавымі для разумення адносін пэўных катэгорый насельніцтва да вайны, яго сацыяльных і ментальных установак.

Былі зроблены і першыя спробы напісання абагульняльных прац [68; 71; 82; 65; 3; 360]. Шмат якія з іх былі невялікіх памераў і выдаваліся ў форме нарысаў. Але там ужо прысутнічала спроба прасачыць уплыў ваенных дзеянняў на ўсё далейшае развіццё Расійскай імперыі. Асноўным іх недахопам была недастатковая колькасць факталагічнага матэрыялу.

З агульнага шэрага вылучаецца грунтоўнае даследаванне М. Канаплёвай і Г. Вяткіна: "Работа Союза городов на Северо-Западном и Северном фронтах,

Витебский государственный технологический университет

1915 – 1916 гг.” [231], дзе аўтары з дапамогай статыстычных звестак паказалі працу Саюза гарадоў на Паўночна-заходнім фронце. Усе лічбавыя звесткі падаюцца ў дынаміцы, што дапамагае даследчыку бачыць працэс дапамогі насельніцтву з боку адпаведнай арганізацыі ў развіцці (прыведзены колькасць лякарняў, перасоўваемых медыцынскіх пунктаў і мабільных амбулаторый, чайных, харчавальных пунктаў па месяцах, колькасць хворых на стацыянары, нормы выдачы сухога пайка і г. д.).

Што ж да разгляду сацыяльна-эканамічнага развіцця неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, то гэтая праблематыка амаль цалкам засталася па-за ўвагаю даследчыкаў на вышэйпаказаным этапе. Тым больш што неакупіраваныя беларускія губерні ў той час амаль нікім не вылучаліся з агульнага шэрага адміністрацыйных адзінак імперыі. І ўсё ж можна згадаць працы А. Бялінскага, А. Вельямінава-Зярнова і Ф. Турука, якія будуць карыснымі для вывучэння пытання дапамогі навучэнцамі прыватным гаспадаркам і асобным дзяржаўным установам на палявых работах [30; 49; 445]. У іх змяшчаюцца і некаторыя статыстычныя звесткі аб становішчы ў сельскай гаспадарцы больш агульнага характару.

Даволі вялікая колькасць прац [47; 70; 268; 455] у абазначаны перыяд часу прысвечана ўвядзенню “сухога закону”. Нягледзячы на спецыфічнасць пытання, для нас яны могуць быць карыснымі тым, што на іх матэрыяле добра прасочваецца ўплыў забароны продажу спіртных напояў на правядзенне мабілізацыйных кампаній на тэрыторыі Беларусі. Таксама аўтары падаюць некаторыя статыстычныя звесткі па колькасці насельніцтва асобных населеных пунктаў, яго сацыяльным і маёмасным статусе. Акупіраваная тэрыторыя Беларусі таксама не знайшла сваіх даследчыкаў у гэты перыяд часу, за выключэннем даволі невялікай колькасці прац, якія насілі ў першую чаргу апісальны характар [55].

*Метадалагічная аснова даследавання*:

Даследаванне было праведзена на аснове метадалагічных прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці. Яны дазволілі разгледзець усе факты, з’явы і падзеі Першай сусветнай вайны на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў адпаведнасці з канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасцю, у іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. Намі шырока прымяняліся стандартныя лагічныя метады. Найбольш поўна выкарыстоўваліся такія з іх, як аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, аналогія, параўнанне і абагульненне. Аналіз дазволіў выявіць будову аб’екта вывучэння, аддзяліць істотнае ад неістотнага, складанае звесці да простага. Пры дапамозе сінтэзу ўдалося аб’яднаць атрыманыя ў выніку аналізу часткі аб’ектаў і іх уласцівасцяў у адзінае цэлае. Дэдуктыўны метад прымяняўся пасля назапашвання і тэарэтычнага абгрунтавання эмпірычнага

Витебский государственный технологический университет

матэрыялу з мэтай яго сістэматызацыі і вывядзення з яго ўсіх магчымых наступстваў.

Апроч лагічных метадаў аўтарам былі шырока выкарыстаны метады тэарэтычнага даследавання. З іх найбольш поўна прымяняліся такія, як ідэалізацыя і фармалізацыя. Пры напісанні работы ўсе гэтыя метады знаходзіліся ў дыялектычным адзінстве, узаемасувязі, дапаўнялі адзін аднаго, што дазволіла забяспечыць даволі высокую ступень аб'ектыўнасці і ісціннасці пазнавальнага працэсу. Метад ідэалізацыі дапамог мысленна сфарміраваць аб'екты з пэўнымі ідэальнымі ўласцівасцямі. Пры яго дапамозе ўдалося сканструяваць пэўныя вобразы-схемы, якія дазволілі найбольш зручным чынам спарадкаваць і сістэматызаваць эмпірычны матэрыял, атрыманы ў ходзе даследавання. Выкарыстаныя ў сукупнасці вышэйзгаданыя метады дазволілі раскрыць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці працэсаў, што працякалі на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

Метады статыстычнага аналізу дазволілі сістэматызаваць лічбавыя паказчыкі сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, прасачыць рост сацыяльнай напружанасці і дынаміку цэн на прадметы першай неабходнасці і прадукты харчавання.

Найбольш жа шырока пры напісанні работы прымяняліся спецыяльныя гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны (кампаратыўны), гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны, праблемна-храналагічны, лакальна-гістарычны. Пры дапамозе гісторыка-параўнальнага метаду былі выяўлены рэгіянальныя асаблівасці гаспадарчага і сацыяльнага становішча неакупіраваных беларускіх губерняў у гады Першай сусветнай вайны. Праблемна-храналагічны метад выкарыстоўваўся для паказу колькасных і якасных характарыстык асноўных працэсаў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, кіраванні і сацыяльнай сферы на незанятай ворагам тэрыторыі. Лакальна-гістарычны метад дапамог выявіць агульныя гістарычныя заканамернасці для сацыяльна-эканамічнага становішча краіны, а з другога боку – спецыфіку тылавых рэгіёнаў.

**Такім чынам**, нягледзячы на наяўнасць дастатковай колькасці спецыяльных работ па асобных праблемах гісторыі Першай сусветнай вайны, можна канстатаваць, што яны напісаны ў асноўным у агульнарасійскім маштабе. Адчуваецца востры недахоп прац, у якіх на аснове багатага фактaлагічнага матэрыялу разглядалася б тэрыторыя Беларусі ў ваенны час. Застаецца патрэба ў комлексным вывучэнні гаспадарчага жыцця краю, у ацэнцы жыццёвага ўзроўню і настрояў насельніцтва на неакупіраваных беларускіх землях. Патрабуюць свайго далейшага даследавання праблемы стаўлення насельніцтва да вайны, арганізацыі медыцынскай і ветэрынарнай дапамогі, правядзення мабілізацыйных кампаній, выкарыстання працы

Витебский государственный технологический университет

ваеннапалонных і г. д. Гэтыя пытанні ў недастатковай ступені разгледжаны навукоўцамі, што пакідае шырокае поле і магчымасці для іх далейшай распрацоўкі.

Крыніцы па гісторыі Першай сусветнай вайны вылучаюцца сваёй разнастайнасцю і шматпланавасцю, рознымі ўзроўнямі інфармацыйнай каштоўнасці. Крыніцазнаўчая база ўвесь час дапаўняецца раней невядомымі дакументамі.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 2
# САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА

## 2. 1 Стаўленне насельніцтва беларускіх земляў да вайны

Першая сусветная вайна пачалася даволі нечакана для абсалютнай большасці насельніцтва беларускіх земляў. У адначассе марнаваліся задумы людзей, іх імкненні і спадзяванні, планы на будучыню. Тым ці іншым чынам вайна закранула кожнага, без уліку яго нацыянальнасці, сацыяльнага і маёмаснага статусу, узросту, становішча ў грамадстве. Пазбаўленае аб'ектыўнай інфармацыі аб прычынах і характары вайны мясцовае насельніцтва далёка неаднaзначна ўспрыняло пачатак ваенных дзеянняў. Больш таго, настроі ў грамадстве не былі статычнымі, а мяняліся ў залежнасці ад сітуацыі не толькі на фронце, але і ўнутры краіны. Гэтаму спрыялі і істотныя змены самога дзяржаўна-палітычнага ладу краіны, якія адбыліся ў выніку Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый.

Большасць даследчыкаў сыходзіцца на думцы, што ў жніўні – верасні 1914 г. у грамадстве назіраўся пэўны патрыятычны ўздым [79; 64]. Прычым, настроі беларускага насельніцтва істотным чынам не адрозніваліся ад агульнарасійскіх. Той факт, што Германія першай абвясціла вайну Расіі, шмат у чым паспрыяў фарміраванню ў масавай свядомасці ўстановак яе ўспрыняцця як вайны справядлівай, абарончай, скіраванай на барацьбу з нямецкай агрэсіяй [355, с. 88]. Ваенны міністр А.І. Гучкоў вясной 1917 г. у сваім закліку да грамадскіх арганізацый і да служачых у іх афіцэраў зазначаў: "З самага пачатку вайны пачуццё высокага патрыятызму ахапіла многія грамадскія арганізацыі, якія, жадаючы прынесці дапамогу нашай арміі, сталі працаваць на ратную справу, як на фронце, так і ў тыле арміі" [133, арк. 260 адв.]. Такога кшталту ацэнка падзей была характэрна для пераважнай большасці афіцыйных выступленняў таго часу.

З ініцыятывы ўрадавых органаў, манархічных і ліберальна-буржуазных партый у Расіі адбываліся патрыятычныя маніфестацыі і сходы, на якіх прадстаўнікі гандлёва-прамысловай буржуазіі, памешчыкаў і духавенства, інтэлігенцыі выступалі з вернападданніцкімі прамовамі і заклікалі ўстаць на абарону "Цара і Айчыны", адкінуць класавую варожасць паміж эксплуататарамі і тымі, каго эксплуатуюць. Такія дэманстрацыі адбываліся на пачатку вайны і ў розных мясцінах Беларусі [81, с. 419]. Так, услед за Петраградам і Масквою ў Мінску, Магілёве, Пінску, Гомелі, іншых гарадах і мястэчках Беларусі прайшлі набажэнствы, адбыліся сходы, дзе дэкларавалася гатоўнасць да самаахвярнасці ў імя гасудара і Айчыны [79, с. 437].

Витебский государственный технологический университет

У Мінску 18 ліпеня 1914 г. натоўп навучэнцаў з 50 чалавек са спевамі і крыкамі “Далоў Аўстрыю!”, “Вітаем Расію і Сербію!” прайшоў па вуліцы да дома губернатара [255, с. 72], дзе ўручыў адрас на імя манарха. У мястэчку Ярэмічы Наваградскага павета адбылася “патрыятычная” маніфестацыя з удзелам сялян суседніх вёсак, якія ішлі з царскім партрэтам. У Пінску 30 ліпеня 1914 г. у маніфестацыі ўдзельнічала каля 5000 мяшчан, гандляроў, прадстаўнікоў духавенства, чыноўнікаў, навучэнцаў [255, с. 72]. Нягледзячы на тое, што афіцыйныя звесткі аб колькасці ўдзельнікаў урачыстых дэманстрацый былі даволі высокімі, нельга адмаўляць той факт, што далёка не ўсе яны праводзіліся ў добраахвотным парадку, без актыўнага прыцягнення адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу.

Пачатак вайны часова адсунуў на другі план асобныя ўнутраныя цяжкасці і супярэчнасці. Нават стачачнікі, якія, як меркавалі ў Расіі, фінансава падтрымліваліся Германіяй, вярнуліся да працы, як толькі абвясцілі мабілізацыю. У першыя тыдні і месяцы вайны назіралася даволі значная актыўнасць мясцовага насельніцтва, звязаная з ахвяраваннямі на карысць арміі і салдат. Некаторыя ахвяраванні былі неверагодна вялікімі. Усё гэта выклікае пэўныя падазрэнні ў іх добраахвотнасці. Савет Міністраў нават быў вымушаны восенню 1914 г. устанавіць мяжу на ахвяраванні для сельскіх таварыстваў у памеры не болей за 20 % ад наяўных запасаў зерня [19, с. 9].

Назіраліся, хаця і не так часта, і індывідуальныя праявы своеасаблівых патрыятычных пачуццяў, якія дэманстравалі поўную падтрымку ўрадавага курсу ў справе вядзення вайны. Так, з 15 кастрычніка 1914 г. Старшыня Віцебскага камітэта Усерасійскага Саюза гарадоў дапамогі хворым і параненым воінам гарадскі галава, дзеючы стацкі саветнік В.Е. Ліцеўскі, адмовіўся ад заробку і працаваў бясплатна [87, с. 194 - 195].

Але ў пераважнай большасці не асобныя людзі, а дзяржаўныя ўстановы і грамадскія арганізацыі накіроўвалі на імя цара заявы, дзе гаварылася пра адданасць і гатоўнасць выступіць на абарону імперыі. Ужо 21 ліпеня 1914 г. гласныя Віцебскай гарадской думы сабраліся на тэрміновае пасяджэнне. Там была адзінагалосна прынята пастанова, у якой гласныя прасілі “…начальніка губерні павергнуць да ног яго Імператарскай Вялікасці пачуцці бязмежна вернападданніцкай любові і адданасці” ў сувязі з абвяшчэннем вайны Расіі [87, с. 194]. Падобнага кшталту заявы не прымусілі сябе доўга чакаць і ад грамадскіх арганізацый Гомеля, Бабруйска, Мазыра, Магілёва і інш.

30 ліпеня 1914 г. Э.А. Вайніловіч, вядомы грамадскі дзеяч Мінскай губерні, старшыня Мінскага таварыства сельскіх гаспадароў, згодна з аднагалоснай прапановай землеўласнікаў падпісаў і ўручыў губернатару адрас на імя імператара. У адрасе была спасылка на падзеі Грунвальдскай бітвы, выказвалася надзея на славянскае адзінства ў барацьбе з германскай агрэсіяй,

Витебский государственный технологический университет

становучае стаўленне да трона і абвяшчалася поўная падтрымка захадаў цара [44, с. 190]. У большасці патрыятычных выказванняў і заклікаў гаварылася, што "... вайна будзе нядоўгай і скончыцца на працягу 4 – 6 месяцаў [51, с. 16].

Але ж адносіны да вайны зусім не былі аднастайнымі. Многія гісторыкі ўвогуле выказвалі меркаванне, што "Першая сусветная не мела мэты, за якую можна было памерці. …нішто не трымала чалавека на той вайне, дэзерцірства не лічылася ганьбай – бо значна больш натуральна сумаваць па доме, чым чакаць сваёй смерці. Нашмат больш патрыятычна было шчыраваць на роднай зямлі, чым сядзець у акопе і выконваць бессэнсоўныя загады камандзіраў" [83, с. 23].

Расійская імперыя не ўвайшла ў вайну на ўсеагульнай хвалі патрыятызму, не было аднадушнага стаўлення да вайны і ўнутры сацыяльна акрэсленых груп. Патрыёты і тыя, хто выступаў супраць, сустракаліся ў 1914 г. ва ўсіх слаях грамадства [391, с. 212]. З першых жа дзён праявілася незадаволенасць вайною ў форме бунтаў, але былі і іншыя формы пратэсту. У Рызе побач з партрэтамі цара рабочыя і рэзервісты неслі лозунгі "Далоў вайну!", у Плоцкім павеце на працягу першага тыдня мабілізацыі з 2 тысяч прызыўнікоў, што з'явіліся на зборны пункт, больш за 200 чалавек адразу дэзерціравала [391, с. 207].

Каб успрыняцце вайны было больш адназначным, царскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі сродкі агітацыі і масавай прапаганды. Для кожнай катэгорыі насельніцтва яны імкнуліся знайсці тое, што магло б выклікаць іх станоўчае стаўленне да баявых дзеянняў, пэўны ўздым патрыятычных пачуццяў. Для буржуазіі абяцалі новыя рынкі збыту і велізарныя прыбыткі ад ваенных заказаў, выгадныя кантракты. Памешчыкам актыўна навязвалася думка пра тое, што вайна прывядзе да класавай згоды, да змяншэння колькасці сялянскіх выступленняў і бунтаў. Рабочых і сялян спрабавалі пераканаць у якасным паляпшэнні ўмоў жыцця, у росце матэрыяльнага дабрабыту ў выпадку перамогі над ворагам.

Асноўная стаўка пры вядзенні агітацыі рабілася на ідэю славянскай салідарнасці і адзінства. Такі напрамак афіцыйнай прапагандзе быў закладзены першымі маніфестамі Мікалая II аб уступленні ў вайну з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй. Маніфесты з абвяшчэннем вайны актыўна зачытвалі ў цэрквах, пры гэтым святары суправаджалі іх адпаведнымі каментарыямі і палымянымі прамовамі. Прычым, у інтэрпрэтацыі апантанага вялікаімперскімі амбіцыямі рэжыму славянская ідэя вельмі часта набывала форму агрэсіўнага панславізму [79, с. 436]. У большасці дакументаў, падпісаных царом, змяшчаліся вытрыманыя ў духу патрыятызму заклікі: "Цар-Бацька і Маці-Радзіма не забываюцца пра сваіх слаўных сыноў, пацярпеўшых пры выкананні абавязкаў на полі бою" [257, с. 143].



Витебский государственный технологический университет

Поруч з услаўленнем рускага духу і славянскай зброі, афіцыйная прапаганда часта выстаўляла нямецкіх і аўстрыйскіх падданых у непрывабным святле, укараняла ў масавую свядомасць уяўленне аб справядлівым, абарончым характары вайны з боку Расіі і фарміравала вобраз агрэсіўнага, антыгуманнага, здатнага на зверствы праціўніка [79, с. 436]. Са старонак газет і часопісаў не сыходзілі апавяданні пра слаўныя перамогі над нямецкімі псамі-рыцарамі, атрыманыя Аляксандрам Неўскім, і аб узяцці Берліна рускімі войскамі ў 1760 г. [64, с. 126].

У антынямецкую агітацыю былі ўцягнуты прадстаўнікі ўсіх прафесій і розных родаў дзейнасці. Так, некаторыя медыкі з ўпэўненасцю сцвярджалі, што любоў немцаў да піва "паралізавала" іх маральныя ўстоі, пасля чаго яны здзяйснялі акты жорсткасці [268, с. 152]. На дэманстрацыях і шэсцях даволі часта гучалі лозунгі: "Далоў немцаў!", "Смерць немцам!" [391, с. 206]. Але ж нягледзячы на такую масавую антынямецкую агітацыю і прапаганду, яна не знайшла на беларускіх землях разумення і шырокай падтрымкі. У сваю чаргу ў сталіцы імперыі была разрабавана германская амбасада.

Царскія ўлады для фарміравання грамадскай думкі актыўна выкарыстоўвалі розныя сродкі. Шматмільённымі накладамі выдаваліся ўлёткі і рознага кшталту бясплатныя прапагандысцкія брашуры. Згодна са справаздачай Дзяржаўнага банка, толькі ў ходзе правядзення пятай ваеннай пазыкі вясной 1916 г. было надрукавана больш за 1 млн. каляровых плакатаў, выдадзена больш за 10 млн. экзэмпляраў прапагандысцкіх брашур, у тым ліку на некаторых мясцовых мовах.

Апроч таго, па прыкладзе саюзнікаў актыўна сталі выкарыстоўваць кінематограф [430, с. 131]. У такіх перыядычных выданнях, як "Минская газета-копейка", "Вестник Комитета Западного Фронта", "Могилёвский вестник" і інш., прапаведаваліся ідэі "справядлівасці" вайны. У артыкуле "Прарок славянскай барацьбы і адзінства", надрукаваным у "Могилёвском вестнике" 20 жніўня 1914 г., гаварылася, напрыклад, пра "…блізкі час славянскай урачыстасці, пра наступленне новай эры ў сусветнай гісторыі" [513, с. 16].

Нягледзячы на выдаткаванне велізарных фінансавых сродкаў, агітацыя і прапаганда не аказвала свайго належнага ўздзеяння на свядомасць народа. Ужо ў першыя тыдні вайны А.В. Пешахонаў, вядомы публіцыст, засцерагаў: што "… у Расіі яе дзяржаўная і грамадская арганізацыя зусім не прыстасавана для выражэння і рэалізацыі агульнай думкі, агульнага пачуцця, агульнай волі" [170, с. 60]. Да таго ж друкаваны матэрыял часта не мог паўплываць на грамадскую думку з-за элементарнай непісьменнасці большасці насельніцтва.

Далёка не апошнюю ролю ў фарміраванні грамадскай думкі і адносін народа да ваенных дзеянняў адыгрывала царква. Аўтарытэт яе ў насельніцтва

Витебский государственный технологический университет

быў даволі высокі. Да таго ж, нядзельныя або святочныя службы ў цэрквах і касцёлах з'яўляліся галоўнай крыніцай навін, асабліва ў мясцінах, аддаленых ад чыгуначных вузлоў і гарадскіх цэнтраў [382, с. 247]. У пераважнай большасці святары не маглі ў сваіх тлумачэннях прычын і характару вайны выйсці за межы рэлігійнай інтэрпрэтацыі, заклікаючы служыць Богу і цару: "…смела і весела ідзіце ў бой за цара, Русь святую і веру праваслаўную" [355, с. 178]. Гэты лозунг не мог трывала ўкараніцца на беларускіх землях праз размаітасць канфесійнага жыцця: значную частку насельніцтва, апроч праваслаўных, складалі каталікі і іўдзеі. Духавенства, часам даволі далёка адыходзячы ад кананічнай царкоўнай дагматыкі, усхваляла вайну як "благадаць", якая ўздымае "народную душу", як справу "Боскага суду і літасці да людзей" [513, с. 16].

Разам з узмацненнем дзяржаўнай агітацыі і прапаганды ўрадавымі ўстановамі і ваенным камандаваннем быў прыняты цэлы шэраг засцерагальных мер, каб звесці да мінімуму магчымыя пратэстныя настроі насельніцтва. Так, уводзілася турэмнае пакаранне не толькі за абнародаванне сакрэтных ваенных звестак, але і за публічныя заклікі да спынення вайны. Забараняліся негатыўныя матэрыялы аб дзейнасці ўрада і яго органаў, службовых асоб, выказванні знявагі альбо варожасці да рускай народнасці [79, с. 435] і г. д.

Згодна з абавязковымі пастановамі віцебскага губернатара і Галоўнага начальніка Дзвінскай вайсковай акругі, выдадзенымі 15 жніўня 1914 г., забаранялася "…распаўсюджваць якія-небудзь звесткі і паведамленні, што ўзбуджаюць варожае стаўленне да ўрада альбо змяшчаюць у сабе выражэнне знявагі ці варожасці да рускай (ці іншай) народнасці, што насяляе імперыю " [308, арк. 11 адв. – 12]. Апроч таго, нельга было паведамляць у друку прозвішчы тых, хто праводзіў арышты ціператрусы ў насельніцтва. Уладальнікі фабрык, заводаў, гандлёвых прадпрыемстваў і ўстаноў абавязаны былі весці падрабязны спіс, дзе пазначаліся прозвішчы і імёны служачых, іх узрост і месца жыхарства. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы падвяргаліся ў адміністрацыйным парадку грашоваму спагнанню ў суме да трох тысяч рублёў альбо зняволенню ў турме ці крэпасці на тэрмін да трох месяцаў.

2-га верасня 1914 г. выйшла абавязковая пастанова галоўнага начальніка Дзвінскай ваенай акругі. Згодна з ёй забаранялася звяртацца да воінскіх чыноў з пытаннямі, якія былі б звязаны з ваеннымі аперацыямі [308, арк. 125].

У сваім звароце да насельніцтва і воінаў ад 2-га красавіка 1917 г. Галоўнакамандуючы арміямі Паўночнага фронта генерал ад інфантэрыі М.У. Рузскі загадваў: "Будзьце пільнымі ў размовах і лістах. Не забывайцеся на тое, што кожнае неасцярожна сказанае альбо напісанае слова, якое характарызуе наша ваеннае становішча, можа дапамагчы ворагу. Памятайце, што няма заняткаў, якім бы германскі шпіён не імкнуўся прыкрыць сваю працу,

Витебский государственный технологический университет

няма вопраткі, у якую б ён не апранаўся, каб схаваць сваю дзейнасць [133, арк. 261 адв.].

Рэжым выключных законаў і адсутнасць праўдзівай інфармацыі з фронту прывёў да з'яўлення ў мясцовага насельніцтва цэлага шэрага здагадак, скажэнняў фактаў, што ніякім чынам не магло паспрыяць стабілізацыі становішча ў тыле краіны. З-за палітыкі замоўчвання асобных праблемных момантаў, тым ці іншым чынам звязаных з вайной, знізіўся ўзровень даверу не толькі да мясцовай адміністрацыі, але і да царскага двара ўвогуле [465, с.137].

Жандары абавязаны былі рэгулярна прадастаўляць звесткі аб настроях мясцовага насельніцтва ў губернскія жандарскія ўпраўленні і ў дэпартамент паліцыі. У сваім цыркуляры міністр унутраных спраў М.А. Маклакоў патрабаваў ад мінскага губернатара "…самым уважлівым чынам адносіцца да настрояў насельніцтва і да ўсіх праяў грамадскасці. Дзеля падтрымкі парадку, так неабходнага падчас вайны, – загадваў М.А. Маклакоў, – прашу не дапускаць ніякіх дэманстрацый і шэсцяў. Усялякія непарадкі павінны быць спынены ў самым пачатку, а натоўпы – рассеяны. У выпадку нязначнага супраціву натоўпу – рашуча прымаць меры, прымяняць зброю ў адпаведнасці з правіламі [513, с. 15]. Па першым патрабаванні паліцыі мясцовае насельніцтва абавязана было неадкладна "…зачыняць вокны, балконы, вароты і веснічкі дамоў, а таксама гандлёвыя і прамысловыя ўстановы [308, арк. 13]. У грамадстве панавала напружаная атмасфера, поўная ўсеагульнай падазронасці.

Нягледзячы на істотныя высілкі афіцыйнай агітацыі і прапаганды, сфарміраваць аднадушнае стаўленне да вайны ўладам не ўдалося. Да таго ж істотна адрозніваліся між сабой адносіны да ваенных дзеянняў не толькі паміж рознымі сацыяльнымі супольнасцямі, але нават і ўнутры іх. Апроч гэтага, існавала значная сацыякультурная "пробка", перагародка паміж тыпалагічна рознымі светамі "вярхоў" і "нізоў", эліты і ніжэйшых слаёў, горада і вёскі [170, с. 60].

Пераважная большасць сялян сустрэла пачатак вайны з асцярогай. Тым больш, што ўжо пачаліся ўборачныя работы, і сяляне добра разумелі, каму ў першую чаргу прыйдзецца ісці на фронт. Чым болей доўжылася вайна, тым больш негатыўным рабілася стаўленне да яе з боку вясковага насельніцтва. Сяляне ўспрымалі незразумелую ім вайну як разнавіднасць стыхійнага бедства, рок, пасланае Богам выпрабаванне [355, с. 88]. Праўда, даволі значная частка сялян пад уплывам шавіністычнай прапаганды таксама станавілася на абаронча пазіцыі. Але з прадаўжэннем вайны, калі на фронце царскія войскі сталі цярпець адно паражэнне за другім, а ўнутры краіны ўзмацнялася разруха, расла дарагоўля і абвастралася харчовае становішча, патрыятычны запал стаў паступова развейвацца [81, с. 419]. З ліста двараніна К.Т. Мрачкоўскага ад 31 жніўня 1915 г. даведваемся, што беларускі селянін у першую чаргу быў

Витебский государственный технологический университет

азадачаны тым, "…возьмуць ці не возьмуць мяне, сінебілетніка, не возьмуць – дык выселяць, немцы недалеча, а возьмуць – дзе і каму пакіну Марыну з сынком, красаўцам Аўхімам" [166, с. 824]. Клопат пра ўласную сям'ю мала стасаваўся на той час з клопатам пра бяспеку імперыі.

Пасіўнае непрыняцце вайны вясковым насельніцтвам беларускіх земляў часам набывала і больш радыкальныя формы. Пратэст выяўляўся ў розных формах, пачынаючы з выказванняў супраць вайны і цара, заклікаў не ісці на яе, адмовы даць падводы для дастаўкі запасных на чыгуначныя станцыі і заканчваючы масавымі разгромамі панскіх маёнткаў і гандлёвых пунктаў [81, с. 428].

Асабліва ў першыя гады вайны сяляне праводзілі патравы зямельных уладанняў, высечкі лесу, захоплівалі панскую маёмасць, разбуралі маёнткі, выступалі супраць хутарызацыі і кулакоў-хутаран, забівалі памешчыкаў і служачых, выступалі супраць дарагоўлі, адмаўляліся плаціць падаткі, супраціўляліся паліцыі і ўладам, адмаўляліся ад выканання ваенных работ і павіннасцей [81, с. 431]. Найбольшая колькасць сялянскіх выступленняў прыйшлася на 1915 г. Аднак нельга сказаць, што ўсе яны насілі антываенны характар. Большасць савецкіх гісторыкаў адносіла нават пагромы вінных лавак да антываенных выступленняў, чым значна павышала іх працэнтны паказчык.

Існавалі, хоць і ў не вялікай колькасці, у вясковым асяроддзі і тыя, хто чакаў ад вайны пэўных змен у лепшы бок. Гэта былі ў першую чаргу нежанатыя сяляне маладога веку, якія трапілі пад уплыў урадавай агітацыі і прапаганды і ўспрымалі вайну як баявую прыгоду, магчымасць паказаць сябе. Яны лічылі, што ваенныя дзеянні хоць часова зменяць іх цяжкі, будзённа-шэры лад жыцця. Многія з іх нават добраахвотна запісваліся ў войска. Сямейныя ж салдаты, гаспадары, былі падаўлены, перажывалі скруху і адчай [355, с. 179].

Абурэнне сялянства выклікалі змены і дапаўненні, якія былі ўнесены 3 ліпеня 1916 г. у закон "Аб доглядзе ніжніх воінскіх чыноў і іх сем'яў". Цяпер сем'і ніжніх чыноў, аб якіх даходзілі звесткі, што яны добраахвотна, без выкарыстання зброі здаліся ў палон ворагу альбо ўцяклі са службы, пазбаўляліся права на атрыманне харчовага забеспячэння з дня наступлення чарговай выдачы пайка. Пра такія выпадкі парушэння гэтымі ніжнімі чынамі абавязкаў службы і вайсковай прысягі губернатары паведамлялі павятовым і гарадскім папячыцельствам альбо адпаведным ім установам для выключэння членаў азначаных сем'яў з раздатачных ведамасцяў і прымалі меры да хуткага апавяшчэння насельніцтва пра такія дзеянні праз належныя ўстановы і асоб, якія загадвалі выдачай пайка, а ў вясковых мясцовасцях таксама і праз асоб сялянскага ўпраўлення [133, арк. 154 адв. – 155 адв.].

З паведамлення прадвадзіцеля дваранства Барысаўскага павета мінскаму губернатару ад 11 лістапада 1916 г. даведваемся, што: "настрой сялянскага

Витебский государственный технологический университет

насельніцтва, ахопленага ў першы год вайны патрыятычным уздымам пачуццяў і жаданнем давесці вайну да пераможнага канца, за апошні год значна пагоршыўся, а ў цяперашні час пачынае прыкметна прымаць непажаданы кірунак" [166, с. 792]. Гэтаму спрыялі не толькі непапулярныя змены і дадаткі да існуючых законаў, але і бясконцыя нарады на ваенныя перавозкі грузаў на вялікія адлегласці, доўгатэрміновыя акопныя работы, недахоп прадметаў першай неабходнасці, неабгрунтавана высокі рост цэн, нізкая эфектыўнасць кіравання і няўзгодненасць дзеянняў дзяржаўнага апарату.

Такім чынам, у пераважнай сваёй большасці сялянства крайне негатыўна ўспрыняло пачатак ваеннай кампаніі. На працягу вайны час ад часу ўспыхвалі сялянскія выступленні. Яны мелі неарганізаваны, стыхійны характар і даволі часта супадалі з сезоннасцю сельскагаспадарчых работ і правядзеннем мабілізацый у рэгулярную армію. Вясковае насельніцтва вельмі хутка астыла да ідэі нацыянальнага адзінства, бо яно ахвяравала сабой і нічога не атрымлівала за гэта: ні паляпшэння жыцця, ні надзеі на гэтае паляпшэнне ў будучыні [170, с. 60].

Большасць гарадскога насельніцтва, у адрозненне ад вясковага, у першыя месяцы вайны трапіла пад уздзеянне "сцягамахальнага энтузіязму" [391, с. 205]. Адзначаліся нават асобныя выпадкі прад'яўлення рабочымі патрабаванняў аб выдаленні з прадпрыемстваў працаваўшых там нямецкіх і аўстрыйскіх майстроў, на фабрыках і заводах праводзіліся зборы сродкаў для дапамогі салдацкім сем'ям, удзельнічалі рабочыя і ў некаторых праўрадавых дэманстрацыях [64, с. 127]. У Клімавічах, напрыклад, "…некаторыя службоўцы рабілі добраахвотныя адлічэнні на карысць параненых і сем'яў запасных у эмерытальную касу" [164, арк. 10].

Праўда, у пачатку вайны царызму ўдалося на непрацяглы час кансалідаваць пралетарыят на платформе агульнаімперскага патрыятызму [79, с. 436]. Сведчаннем гэтаму было рэзкае скарачэнне колькасці скаргаў, пададзеных у другой палове 1914 г. у фабрычную інспекцыю [355, с. 140].

Безумоўна, былі і такія гараджане, што сустрэлі вестку аб пачатку вайны акцыямі пратэсту. Але іх выступленні насілі ў асноўным спарадычны і анархічны характар [391, с. 204]. Большая частка гараджан заняла пазіцыю стрыманага, пасіўнага чакання. Для іх вайна аказалася непатрэбнай, адрынутай, як перашкода звычайнай плыні паўсядзённага жыцця. Прыкладна так і даволі хутка пасля спаду патрыятычнай эйфарыі, якая была ў першыя месяцы вайны, успрымалася яна ў свядомасці большасці людзей [170, с. 61]. Мяшчане імкнуліся "не пускаць" вайну ў сваё асабістае жыццё. Гэта добра бачна з уцалелых дзённікаў, лістоў, успамінаў, дзе вайна ўвогуле "знікае" з поля зроку аўтараў да пачатку 1917 г., калі тэма вайны стала апасродкавана ўсплываць у

Витебский государственный технологический университет

форме раздражнёнай крытыкі ўлады з-за матэрыяльнай нястачы, дэзарганізацыі [170, с. 62].

Са зводкі назіранняў ваенных цэнзараў за карэспандэнцыяй у сакавіку 1917 г. бачна, што "…амаль зусім знікла цікавасць да баявых дзеянняў на фронце, аб вайне пісалі мала…" [166, с. 913]. Яшчэ больш расла незадаволенасць рабочымі вайной з-за неабходнасці здаваць асобныя зборы "для салдат у акопы" ў памеры аднадзённага заробку [104, арк. 19], звыштэрміновых работ, адставання росту заробку ад росту цэн, рэпрэсій улад супраць рабочых арганізацый і г. д. [64, с. 134]. З пратакола пасяджэння праўлення Гомельскага прафсаюза прыказчыкаў і канторшчыкаў ад 20 снежня 1917 г. добра бачна, як праводзіліся "…прымусовыя спагнанні на чырвоны падарунак для арміі" [147, арк. 68].

Яшчэ больш, чым рабочыя, у першыя месяцы вайны паддаліся дзяржаўнай агітацыі і прапагандзе навучэнцы ўстаноў розных тыпаў. Яны ахвотна ўдзельнічалі ў арганізаваных мясцовымі ўладамі патрыятычных дэманстрацыях. Неслі партрэты імператара, упрыгожаныя сцягамі, спявалі "Боже, царя храни" [391, с. 206]. Навучэнцы, натхнёныя патрыятычным пачуццём і жаданнем паслужыць дзяржаве ў цяжкі час, шукалі пасільнай для сябе і карыснай для дзяржавы дзейнасці, з ахвотай адгукаліся на ўсялякае запрашэнне, якое давала ім магчымасць прыняць той ці іншы ўдзел у барацьбе і паслужыць радзіме [30, с. 2 - 3]. Сродкі масавай інфармацыі былі перапоўнены звесткамі аб дзецях і падлетках, што самавольна пакінулі родны дом, каб трапіць на фронт [127].

Якім жа чынам ставіліся да вайны непасрэдныя ўдзельнікі баявых дзеянняў на франтах? Каштоўны матэрыял для назіранняў за настроямі ў арміі даюць штомесячныя справаздачы ваеннай цэнзуры. На адным толькі Заходнім фронце было больш за 800 цэнзараў [170, с. 62]. У асноўным армія складалася з сялян, якія "…недастаткова праніклiся патрыятызмам і таму не ўяўлялі сабой грамадзян-салдат, неабходных для перамогі ў сучасных войнах" [391, с. 203]. Вельмі часта стыхійны патрыятызм салдат спалучаўся з поўным неразуменнем прычын і мэт вайны, са спробамі даць ёй рацыянальнае тлумачэнне па сваёй сістэме каштоўнасцей. Многія франтавікі гаварылі: "Каб мне знаць, у чым справа, з-за чаго народы, такія мірныя, перабіліся. Не інакш як за зямлю" [44, с. 190].

У асяродку салдат, як узгадваў пазней у сваіх мемуарах генерал А.А. Брусілаў, "…хто такія сербы, не ведаў амаль ніхто, што такое славяне – было таксама цёмна, а чаму немцы з-за Сербіі надумалі ваяваць – было зусім невядома" [42, с.82]. Многія салдаты ўвогуле не ведалі, што такое Германія і Аўстрыя. Яны ведалі "…свой павет і, бадай, губерню, ведалі, што ёсць Пецярбург і Масква, і на гэтым іх знаёмства са сваёй айчынай заканчвалася [42,

Витебский государственный технологический университет

с. 83]. Многія салдаты гаварылі: “Мы – тульскія (альбо вяцкія, калужскія і г. д.), да нас немец не дойдзе [64, с. 125].

Доўгая пазіцыйная вайна без асаблівых змен і надзей на лепшае з цягам часу ўсё болей і болей паслабляла баявы дух салдатаў. Салдаты і афіцэры зняверваліся ў мэтазгоднасці працягу вайны, у магчымасці дасягнення перамогі і масава здаваліся ў палон [79, с. 439]. У войску расла колькасць дэзерціраў, пачасціліся выпадкі “самастрэлаў” і калектыўнай здачы ў палон [64, с. 139]. У сакавіку 1915 г. на фронце ў велікодныя красавіцкія дні камандаваннем быў зарэгістраваны першы выпадак братання рускіх салдат з праціўнікам [19, с. 12 - 13].

Становішча на неакупіраванай тэрыторыі было дужа неспакойным. Да салдат былі скіраваны сотні адозваў і ўлётак, у тым ліку рэвалюцыйна-радыкальнага зместу. Асаблівую ўвагу агітацыі сярод салдат надавала партыя бальшавікоў. Да прыкладу, на 466-й вярсце Аляксандараўскай чыгункі арцельным старастам 6-га ўчастка службы пуці Прохарам Машкаром у чэрвені 1915 г. была знойдзена пракламацыя “Таварышы салдаты”, адным з асноўных лозунгаў якой быў “Далоў вайну” [365, с. 260 - 261]. Пра большасць такіх выпадкаў мясцовае начальства лічыла за лепшае не паведамляць.

16 студзеня 1915 г. жандармскі унтэр-афіцэр з мястэчка Скідзель паведамляў наступнае памочніку начальніка Гродзенскага жандармскага ўпраўлення ў Гродзенскім, Слонімскім і Ваўкавыскім павеце аб антываенных настроях мясцовага насельніцтва і салдат: “… паміж насельніцтвам і салдатамі (апалчэнцамі) выказваецца незадавальненне цяперашняй вайной, а менавіта беднякі, насельніцтва абураюцца дарагоўляй, салдаты ж паміж сабой выказваюцца такім чынам, што вайна хоць і скончыцца на карысць Расіі, але хто служыў да вайны батраком у паноў, той будзе батраком і пасля вайны” [365, с. 257].

Салдаты не жадалі падаўляць антываенныя настроі мясцовага насельніцтва. Так, у журнале № 11 пасяджэння Магілёўскага губернскага харчовага камітэта чытаем: “…салдаты рашуча ўхіляюцца ад прымянення крутых мер да сялян…” [159, арк. 31 адв.].

Нягледзячы на тое, што згодна з пастановай Савета Міністраў ад 15 красавіка 1915 г. аб “…пазбаўленні пайка сем’яў ніжніх чыноў, што здзейснілі ўцёкі са службы” [128, арк. 10], сем’і беглых салдат ставіліся ў невыносна цяжкае становішча, колькасць дэзерціраў увесь час павялічвалася. У сродках масавай інфармацыі падаваліся падрабязныя спісы аб асобах, што збеглі з дзеючай арміі [127]. Тэлеграма навагрудскага павятовага спраўніка мінскаму губернатару ад 15 верасня 1914 г. загадвала: “…усіх ніжніх чыноў Лідскага палка прызнаць беглымі з тэатра ваенных дзеянняў” [166, с. 876]. У цыркуляры Дэпартамента паліцыі губернатарам і граданачальнікам ад 17 снежня 1914 г.

Витебский государственный технологический университет

зазначалася:”…за апошні час назіраюцца масавыя выпадкі пабегаў з санітарных цягнікоў лёгка параненых ніжніх чыноў…” [166, с. 877].

Здараліся і масавыя дэзерцірствы. З тэлеграмы начальніка Жлобінскага гарнізона Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту даведваемся, што “са Жлобіна са зброяй у руках збегла большая частка II-га Лабінскага казачага палка” [155, арк. 18]. Часта салдаты заставаліся ў германскім палоне па сваім жаданні [195, арк. 86].

Витебский государственный технологический университет

## 2. 2 Уплыў мабілізацыі на сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў. Выкарыстанне мясцовага насельніцтва на абарончых работах

Правядзенне мабілізацый і шырокае выкарыстанне мясцовага насельніцтва на абарончых работах істотным чынам паўплывала не толькі на змены ў сацыяльнай структуры грамадства, але і прывяло да ліквідацыі звыклага ладу жыцця. Гэтыя працэсы амаль цалкам пазбавілі гаспадарку краіны працоўных рук, адарвалі вялікую колькасць жыхароў ад выканання ўскладзеных на іх непасрэдных абавязкаў. Тысячы сялян, рабочых, настаўнікаў, урачоў былі прызваны ў армію альбо актыўна выкарыстоўваліся пры правядзенні акопных работ. Гэта прывяло да таго, што асобныя пасады, у першую чаргу тыя, што патрабавалі высокай кваліфікацыі і ведаў, заставаліся вакантнымі даволі працяглы час. Амаль ва ўсіх сферах жыцця адчуваўся востры недахоп вопытных кадраў.

Мабілізацыя насельніцтва ў армію пачалася 18 ліпеня 1914 г. Яна праводзілася згодна з імянным указам Мікалая II Сенату. У гэтым дакуменце загадвалася “…прызваць на дзеючую службу: усіх афіцэрскіх і класных чыноў запасу арміі, а таксама ўсіх іншых чыноў таго ж запасу, якія стаяць на афіцэрскім уліку; афіцэрскіх і класных чыноў запасу флоту, у тым ліку і ніжніх чыноў кандуктарскіх званняў” [166, с.783].

Царскі ўказ ад 18 ліпеня 1914 г. увесь час дапаўняўся і ўдакладняўся. Гэта рабілася з мэтай павялічыць колькасць вайсковага кантынгенту, прыцягнуць да службы новыя катэгорыі насельніцтва, а часам і – выправіць асобныя хібы, дапушчаныя раней. Толькі 28 ліпеня ва ўсе губерні былі разасланы правілы, якія забаранялі прыём на службу асоб, маладзейшых за 18 і старэйшых за 43 гады [391, с. 207]. Праўда, праз некаторы час гэтыя правілы былі адменены спачатку фактычна, а затым і заканадаўча.

Ва ўсіх гарадах былі створаны мабілізацыйныя пункты, якія прымалі не толькі навабранцаў з гэтай мясцовасці, але і з усіх бліжэйшых вёсак і мястэчак.

Таму вонкава “…горад набыў від ваеннага лагера, запоўніўся натоўпамі сельскага насельніцтва, якое праводзіла сваіх мужчын з плачам і прычытаннямі…” [44, с. 189]. Большасць прызыўнікоў імкнулася правесці апошні дзень перад адпраўкай на явачны пункт разам з сям’ёй, каб развітацца і хоць нейкім чынам уладкаваць свае справы, якія мусілі быць закончаны ўжо без іх. Здаралася і так, што мабілізацыю праводзілі ў аўральным рэжыме, не звяртаючы ўвагі на выкананне featureзнага кшталту неабходных адміністрацыйных працэдур. Часта вясковы старшыня ў вуснай форме распараджаўся наступным чынам: “Каб не марнаваць час на вазню са спісамі, хто адчувае сябе здаровым і гатовым служыць Айчыне, павінны сабрацца 18-га чысла ў 9 гадзін ля дома павятовага ваеннага каменданта, я раю вам узяць з сабою 2 пары бялізны, усё астатняе вам выдадуць [391, с. 205].

Не былі рэдкасцю выпадкі, калі прызыўнікі пакутавалі ад бюракратызму і злоўжыванняў чыноўнікаў, недахопу харчавання на явачных пунктах, ад дрэнна наладжанай сістэмы перасылкі да месца службы. Але здараліся і больш сур’ёзныя хібы пры правядзенні мабілізацыйных кампаній. Так, з загаду № 691 па Дзвінскай ваеннай акрузе ад 9 снежня 1915 г. даведваемся, што “ў датэрміновы прызыў навабранцаў, праведзены мабілізацыйным парадкам, аказаліся прынятымі на ваенную службу некаторыя маладыя людзі: а) не дасягнуўшыя прызыўнога ўзросту, гэта значыць тыя, хто нарадзіўся пазней за 1896 г.; б) якія належаць да насельніцтва, вызваленага ад выканання ваеннай павіннасці” [128, арк.11 адв.].

Толькі з сярэдзіны ліпеня 1917 г. было канчаткова вырашана пытанне з механізмам прызыву на вайсковую службу добраахвотнікаў. У першыя дні пасля пачатку мабілізацыі дзяржаўныя і ваенныя асобы проста не прадугледзелі таго, што ў ваенны час могуць быць людзі, якія самахоць і свядома жадаюць выканаць свой грамадзянскі абавязак. Толькі 23 ліпеня ўрад зацвердзіў правілы аб залічэнні добраахвотнікаў на службу. Кола патэнцыйных ахвотнікаў служыць было значна звужана, у першую чаргу за кошт забароны ваеннаабавязаным ісці ў добраахвотнікі. Большая частка іх складалася з ратнікаў II разраду, студэнтаў, што мелі адтэрміноўку, і з асоб, якія належалі да нацыянальнасцяў, вызваленых ад прызыву.

З 5 ліпеня 1917 г. запіс добраахвотнікаў стаў праводзіцца выключна абласным выканаўчым камітэтам па фарміраванні рэвалюцыйных ударных батальёнаў Паўночнага фронту і камісарамі, камандзіраванымі па ўзгадненні з гэтым камітэтам у розныя гарады [134, арк. 145]. Да гэтага ж часу нярэдкімі былі выпадкі, калі асобныя чыноўнікі, не маючы ніякіх паўнамоцтваў, самавольна набіралі тых, хто жадаў ісці на фронт, але, не маючы ўказанняў, куды трэба пераправіць набраных людзей, і з-за адсутнасці харчу, кідалі іх на волю лёсу.

Витебский государственный технологический университет

На ўсім працягу вайны неаднаразова ўносіліся змены і ў катэгорыі навабранцаў, што мелі адтэрміноўку ці ўвогуле вызваляліся ад прызыву. Так, беручы пад увагу катастрафічнае становішча з забеспячэннем арміі фуражом, з'езд прадстаўнікоў Губернскіх харчовых камітэтаў, які праходзіў у Маскве, прыняў наступную пастанову: "Прадаставіць адтэрміноўкі па прызыве ў войска наступным катэгорыям служачых у арганізацыях і ўвогуле работнікаў па нарыхтоўцы сена для войска і насельніцтва:

а) раённым загадчыкам і іх памочнікам;

б) загадчыкам прэсавальных пунктаў і іх памочнікам;

в) тэхнікам па прыёмцы і адпраўцы сена;

г) бухгалтарам, сакратарам і загадчыкам справаводства;

д) прэсавальшчыкам;

е) пастаянным возчыкам, якія заключылі дамовы на перавозку;

ж) па пастановах губернскіх харчовых камітэтах, пастаўшчыкам сена" [99, арк.11].

Да таго ж было прынята рашэнне хадайнічаць пра найхутчэйшае вяртанне з войска ўсіх аграномаў і тэхнікаў незалежна ад адукацыйнага цэнзу і пасады, якую яны займалі на ваеннай службе [99, арк.11].

Варта зазначыць, што далёка не ўсе хадайніцтвы і просьбы пэўных устаноў аб вызваленні ад прызыву задавальняліся. "Апошняй інстанцыяй" па вырашэнні названай праблемы было Мабілізацыйнае аддзяленне Галоўнага ўпраўлення Генеральнага штаба (МАГУГШ) [300, арк. 76 - 77]. Адтэрміноўкі і вызваленне ад прызыву ў асноўным даваліся толькі рабочым і службоўцам прамысловых прадпрыемстваў, што выконвалі тэрміновыя заказы Ваеннага і Марскога ведамства; работнікам устаноў, якія забяспечвалі вышэйназваныя прадпрыемствы сыравінай, паўфабрыкатамі; рабочым вугальнай, нафтавай, жалезаруднай, марганцавай, меднай, а таксама металургічнай прамысловасці [300, арк. 76 - 77].

Кожная ўстанова, што мела вызваленых ад прызыву грамадзян, мусіла складаць на іх дэталёвыя спісы. Там у абавязковым парадку пазначалася званне, імя, імя па бацьку, прозвішча і ўзрост ратнікаў, якія падлягалі вызваленню; год прызыву; пасада работніка на прадпрыемстве. Усе спісы павінны былі быць засведчанымі выключна ўрадавымі прыёмшчыкамі ці назіральнікамі з чыноў Артылерыйскага, Ваенна-тэхнічнага, Інтэнданцкага ўпраўленняў і Марскога ведамства. Асобныя выключэнні рабіліся для такіх рабочых, што займалі на прадпрыемствах пасады, дзе патрабаваўся тэхнічны навык і падрыхтоўка, якія не маглі быць набыты ў кароткі тэрмін, г. зн. толькі кваліфікаваныя службоўцы, сыход якіх з прамысловых прадпрыемстваў мог шкодна адбіцца на прадукцыйнасці работ [470, с. 32].

Витебский государственный технологический университет

Шмат лістоў паступала ў ваеннае ведамства не толькі ад дзяржаўных прадпрыемстваў, але і ад прыватных фірмаў і ўстаноў. Іх кіраўнікі і ўпраўляючыя ўвесь час наракалі на тое, што на прадпрыемствах катастрафічна не хапала рабочых сталага веку, што негатыўна ўплывала на якасць і эфектыўнасць працы.

Цэлы шэраг дробных прыватных устаноў і фірмаў спынілі сваё існаванне таму, што ў армію быў прызваны іх уладальнік і кіраўнік. Але часам яны працягвалі функцыянаваць, бо ўсе справы, згодна з натарыяльнымі даверанасцямі, вялі іх жонкі [312, арк. 7 адв.].

Варта зазначыць, што ў той час, як значная колькасць моладзі, якая мела адтэрміноўку ці вызваленне ад службы, імкнулася на прызыўныя пункты для запісу ў добраахвотнікі, многія з іх суайчыннікаў, наадварот, усяляк ухіляліся ад прызыву. Шмат у якіх вёсках і гарадках людзі масава даносілі на суседзяў, якія пазбеглі прызыву ці дэзерціравалі з арміі. Такіх даносаў у 1915 г. было так шмат, што ваенны міністр А.А. Паліванаў прыйшоў да высновы: Міністэрства ўнутраных спраў надае занадта шмат увагі ўхіленню ад прызыву, і напісаў пра гэта міністру ўнутраных спраў [391, с. 209].

Падчас правядзення прызыўных кампаній на беларускіх землях нярэдкімі былі выпадкі ўзброеных выступленняў навабранцаў. Прычым, яны насілі як сацыяльна-класавы характар, так і неслі ў сабе пэўны стыхійны элемент. Напярэдадні правядзення мабілізацый усе сілы жандармерыі і паліцыі прыводзіліся ў поўную баявую гатоўнасць. Урадавыя ўстановы і маёнткі памешчыкаў, размешчаныя каля шляхоў перасылкі навабранцаў, браліся пад ахову паліцыі. Каманды мабілізаваных адпраўляліся з прызыўных пунктаў толькі ў суправаджэнні жандармаў [488, с. 42]. Але ж нягледзячы на прынятыя меры, толькі падчас першых мабілізацый, з 19 па 25 ліпеня 1914 г., у Беларусі было разбурана каля 60 панскіх маёнткаў і сядзіб заможных вяскоўцаў, дзясяткі вінных і харчовых крам і складоў. У той ці іншай ступені гэтыя хваляванні ахапілі 20 з 35 беларускіх паветаў [81, с. 436].

У некаторых месцах навабранцы ўступалі ў сутычкі з паліцыяй, збівалі афіцэраў, што суправаджалі партыі мабілізаваных [286, с. 450]. Самым буйным было выступленне салдат і матросаў 22 і 26 кастрычніка на Гомельскім перасыльным пункце ў 1916 г. Яно адбылося пад уплывам рэвалюцыйнай прапаганды членаў Палескага камітэта РСДРП (б) і салдат-бальшавікоў, якія акцэнтавалі ўвагу на ваенных паражэннях, цяжкім становішчы тылу, здзеках з боку афіцэрскага корпуса. Нягледзячы на тое, што ў гэтым выступленні ўзялі ўдзел каля 4-х тысяч чалавек, яно было жорстка падаўлена: 9 чалавек асуджаны да смяротнага пакарання, астатнія адпраўлены на катаржныя работы ці ў арыштанцкія аддзяленні на розныя тэрміны. Усяго на Беларусі ў перыяд вайны адбыліся 62 значныя хваляванні салдат.

Витебский государственный технологический университет

Найбольш зазналі на сабе негатыўныя наступствы прызыўных кампаній уладальнікі панскіх маёнткаў. Цэлая хваля разгромаў сядзібаў мабілізаванымі на вайну сялянамі пракацілася па Мазырскім, Ігуменскім, Мінскім, Гомельскім, Рэчыцкім, Лепельскім і іншых паветах Беларусі [79, с. 435]. Згодна з рапартам мазырскага павятовага спраўніка мінскаму губернатару ад 29 ліпеня 1914 г., у павеце за непрацяглы перыяд часу мабілізаванымі былі разрабаваны наступныя маёнткі: Буда-Сафіеўка, Міхалкі, Людзяневічы, Букча, Юзэфін, Вялікі-Бокаў, Прудкі, Санюкі [206, с. 246 - 247].

Пры падаўленні выступленняў прызыўнікоў царскія ўлады не грэбавалі прымяняць самыя жорсткія меры. Актыўна працавалі ваенна-палявыя суды, у раёны беспарадкаў накіроўваліся карныя атрады, якія выкарыстоўвалі агнястрэльную зброю. Найбольш актыўныя ўдзельнікі салдацкіх выступленняў па прыгаворах ваенна-палявых судоў былі пакараны смерцю [286, с. 441].

Шматлікія выступленні прызыўнікоў прымусілі ваеннае ведамства больш дэталёва і адказна падыходзіць да фарміравання кантынгенту навабранцаў. Павятовыя вайсковыя чыноўнікі сталі цікавіцца мінулым будучага салдата, яго ўдзелам у палітычных партыях і арганізацыях. За хібы ў правядзенні прызыўной кампаніі і ўзнікненне пратэстных настрояў непасрэдную адказнасць неслі і губернатары прыфрантавых губерняў. Гэта прымушала іх прымаць рознага кшталту дадатковыя меры. Да прыкладу, у паведамленні мінскага губернатара начальнікам паліцыі ўказвалася на неабходнасць "…дадатковай праверкі палітычнай добранадзейнасці навабранцаў, прызначаных у войска гвардыі і 1-ы чыгуначны полк [166, с.790].

Колькасць прызыўнікоў у працэнтных суадносінах паміж беларускімі і іншымі губернямі Расійскай імперыі даволі істотна вагалася. Калі ў Фінляндыі мабілізацыя ўвогуле не праводзілася [266, с. 154], то ў мэтах ачысткі прыфрантавой паласы ад "нядобранадзейных элементаў" і на выпадак свайго адступлення, каб пазбавіць ворага жывой рабочай сілы, царскія ўлады падвяргалі найбольш масавай мабілізацыі менавіта беларускія губерні. Калі ў цэлым па 50-ці губернях Расійскай імперыі на працягу вайны было мабілізавана 47,4% працаздольных мужчын, то ў Магілёўскай губерні – 50,7%, у Віцебскай – 52,2% [488, с.42]. Тыя ж заходнія раёны Беларусі, якія затым апынуліся пад нямецкай акупацыяй, зведалі на сабе амаль татальную мабілізацыю.

За ўсю вайну з Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і неакупіраваных паветаў Віленскай губерняў у царскую армію было прызвана 682,2 тыс. чалавек. Гэта складала прыкладна 51% ад колькасці дарослых працаздольных мужчын і 12-13% – ад колькасці ўсяго насельніцтва. З улікам мабілізаваных у заходнім рэгіёне Беларусі да яго акупацыі немцамі можна дапусціць, што ўсяго ў расійскую армію было прызвана не менш за 800 тыс. беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі [79, с. 436]. Асобныя даследчыкі прыводзяць куды больш высокія

Витебский государственный технологический университет

лічбы (да 923200 чалавек) [215, с. 177 - 180]. Па сваім сацыяльным становішчы абсалютную большасць прызыўнікоў з беларускіх земляў склалі сяляне. Каля 1/3 з іх былі непісьменнымі [263, с.18].

Такім чынам, правядзенне мабілізацый, патрабаванне штомесяц аддаваць аднадзённы заробак "для салдат у акопы" [104, арк. 19] выклікалі хвалю абурэння мясцовага насельніцтва. Але ж наяўнасць моцнага паліцэйска-адміністрацыйнага апарату, падмацаванага ваеннай сілай, дазволіла паспяхова правесці мабілізацыю ў вызначаныя тэрміны. Яўка мабілізаваных на прызыўныя ўчасткі была вельмі высокай (у Віцебскай губерні дасягала 95 %) [79, с. 436]. Але ж пры правядзенні прызыўных кампаній не абышлося без шматлікіх хібаў і парушэнняў, многія з якіх так і не былі пераадолены да самага заканчэння вайны.

Апроч мабілізацыйных кампаній, царскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі насельніцтва неакупіраваных беларускіх земляў на рознага кшталту абарончых работах: рыццё акопаў, праца па ўзвядзенні фартыфікацыйных збудаванняў, рамонт дарог і мастоў, ахова ваенных аб'ектаў, перавозка грузаў, збор зброі на палях бітваў і г. д.

Правядзенне абарончых работ надзвычай ускладнялася адсутнасцю нарматыўна-прававой базы, якая б дэталёва рэгламентавала іх выкананне. Часам усё залежала ад указанняў мясцовай ваеннай ці грамадзянскай адміністрацыі, якія часта разыходзіліся з агульнадзяржаўнымі пастановамі. Так, згодна з загадам Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту ад 24 красавіка 1917 г. за № 1704 працоўны дзень, у выпадку пільнай патрэбы, мог быць працягнуты і да 12 гадзін актыўнай працы ў суткі, і рабочыя не мелі права адмовіцца ад гэтага [130, арк. 321].

У найбольш складаных умовах вымушаны былі працаваць акопныя рабочыя. Інжынернае ведамства магло перакідваць іх з месца на месца і суткамі трымаць на вакзалах галоднымі без усялякага харчавання [231, с. 29]. Неаднаразова рабочыя ў незакончаных акопах падвяргаліся абстрэлам ці бамбардзіроўкам з боку праціўніка. Такое становішча штурхала акопных рабочых на напісанне рознага кшталту скаргаў і прашэнняў, каб аблегчыць невыносныя ўмовы працы. Так, напрыклад, сяляне Ваўкавыскага павета накіравалі наступны ліст гродзенскаму губернатару: "…пакорнейша просім вызваліць нас ад працы, паколькі мы на рабоце без змены з 15 траўня, працавалі на перадавых пазіцыях за Ліпскам. Цяпер мы вярнуліся ў Гародню, і нас ваеннае ведамства зноў пасылае на працу. Мы знасілі сваю вопратку, узятую толькі на 2 тыдні" [166, с. 821].

Сяляне Слонімскага павета справядліва наракалі: "…мы, сяляне слонімскага павета ў колькасці 160 пешых і 17 падвод, высланы былі на работу па ўмацаванні пазіцый 1-га Ганіяндскага ўчастка ў вёсцы Крэчы на 2 тыдні.



Витебский государственный технологический университет

Пасля 2-х тыдняў мясцовая паліцыя абяцала даць нам змену. Прайшло ўжо 3 тыдні, а мы змены не атрымалі. Дома ў нас рабочых не засталося, і палі нашы няўбраныя, нягледзячы на дрэнны ўраджай у нашым павеце" [166, с. 822].

Сяляне вёскі Забалоцце Ігуменскага павета 17 лістапада 1915 г. скардзіліся мінскаму губернатару: "Нягледзячы на тое, што на палях нашых бульба засталася няўбраная і псавалася ад замаразкаў, мы хадзілі на работы і працавалі старанна, але ні адной капейкі да цяперашняга часу за сваю працу і за свае фурманкі не атрымалі. Інжынер Цвікель і дзясятнік Вайбуза нам часта абяцалі, што тады і тады грошы будуць выплачаны. Але надышоў прызначаны тэрмін, а грошы нам не выдавалі. Працы ўжо 3 тыдні як закончаны, а кіраўнікі работ невядома куды з'ехалі, не заплаціўшы нам грошай" [166, с.832]. Пераважная большасць такіх скаргаў і прашэнняў так і засталася без адказу і адпаведнай рэакцыі з боку начальства.

Рабочыя часта капалі акопы за некалькі кіламетраў ад пасяленняў, у мясцовасцях, дзе нельга было атрымаць ні ежы, ні даху над галавой. У пераважнай большасці яны размяшчаліся пад адкрытым небам, і толькі цёплы летні час дапамагаў пераносіць цяжкасці, звязаныя з гэтай працай [231, с. 20]. Восенню і зімой умовы працы рабіліся проста невыноснымі. Толькі 15 красавіка 1917 г. загадам Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту за № 1671 было вызначана, што "…пры адсутнасці альбо недахопе жылых памяшканняў паблізу месцаў працы для рабочых, прыцягнутых да працы для ваенных патрэб, як прымусова, так і па вольным найме, павінны быць пабудаваны адпаведныя памяшканні для жылля, а ў летнія месяцы – шалашы ці лёгкія навесы з заплеценымі сценамі ці іншыя, якія адпавядаюць мясцовым умовам, абараняюць ад дажджу, ветру і начнога холаду" [130, арк. 295]. З-за тэрміновасці і неадкладнасці абарончых мерапрыемстваў гэты загад у большасці выпадкаў заставаўся на паперы.

Даволі часта да выканання акопных работ прыцягваліся дзеці, падлеткі, жанчыны, старыя і нямоглыя людзі, якія былі няздольныя выконваць цяжкую працу. Ваенныя ўлады абавязаны былі плаціць мясцоваму насельніцтву за работу. Але заробак быў вельмі нізкі і далёка не кампенсаваў тыя страты, што неслі работнікі. Да таго ж праз махлярства, абіральніцтва падрадчыкаў і вытворцаў акопных работ людзі часта аказваліся ашуканымі, з імі рабіўся няпоўны разлік, а часам зусім нічога не плацілі [81, с. 423].

У раёне дзеяння арміі мясцовыя жыхары актыўна выкарыстоўваліся пры зборы вінтовак на палях баёў. Знойдзеныя вінтоўкі павінны былі адразу ж здавацца начальнікам этапна-гаспадарчых часцей арміі, этапным і чыгуначным камендантам, якія выплочвалі за кожную прынятую "нашу" вінтоўку па 6 рублёў і за непрыяцельскую – па 5 рублёў. Утойванне любой зброі, знойдзенай на палях баёў, забаранялася і перасследавалася [308, арк.188].



Витебский государственный технологический университет

Надзвычай абцяжарваў мясцовае насельніцтва неакупіраваных беларускіх земляў і абавязак ахоўваць чыгуначныя лініі, масты, тэлеграфы, участкі дарог, важныя аб'екты ваеннага і гаспадарчага прызначэння. Ён быў уведзены з самага пачатку вайны. Да выканання гэтай павіннасці прыцягвалася насельніцтва мясцовасцей, што прымыкалі да чыгунак на адлегласці каля 5 вёрстаў. Толькі ад адной Віцебскай губерні патрабавалася штодзённа выстаўляць на гэтую патрэбу каля 1000 чалавек [81, с. 423].

У адрозненне ад іншых сацыяльных супольнасцей сяляне, прыцягнутыя да аховы чыгуначных і тэлеграфных ліній, мастоў і іншых аб'ектаў, за сваю працу нічога не атрымлівалі, паколькі адбывалі натуральную павіннасць [81, с. 423].

Але ж нягледзячы на ўсе высілкі мясцовай адміністрацыі і загады ваеннага ведамства, людзей для выканання абарончых работ усё роўна не хапала. Канцылярыі губернатараў былі проста завалены разнастайнымі прашэннямі і патрабаваннямі аб высылцы людзей на рознага кшталту работы. Так, начальнік этапна-гаспадарчага аддзялення V арміі даслаў мінскаму губернатару наступнага зместу тэлеграму: "Прашу распараджэння аб нарадзе інжынера Алеарскага, будаўніка пад'ездаў да маста на Бярэзіне ў Бабруйску, 400 рабочых з мясцовых жыхароў і 200 падвод для падвозкі зямлі на час да 4-х тыдняў" [166, с. 822].

Гродзенскі губернатар патрабаваў ад Ваўкавыскага павятовага спраўніка: "Не марудзячы, вышліце ад павета 400 рабочых, адпраўце ў распараджэнне палкоўніка Таранава-Белазерава. Перад адпраўленнем рабочых пераканайце іх, што за ўхіленне альбо ўцёкі яны будуць падвергнуты турэмнаму зняволенню і адразу ж па вызваленні адпраўлены на работы на ўдвая больш працяглы час, а ў выпадку паўторнага ўхілення альбо ўцёкаў – выселены як нядобранадзейныя" [166, с. 821].

Праўда, даволі часта мясцовыя сельскія старшыні дапамагалі сваім аднавяскоўцам тым ці іншым чынам пазбегнуць удзелу ў абарончых работах: "… адзіная толькі Бартнікоўская воласць прыслала 56 рабочых і 97 падвод; астатнія ж амаль нічога не прыслалі, абмежаваўшыся толькі складаннем спісаў. Любаніцкі старшыня зусім не прыняў ніякіх мер да нарадаў людзей і падвод, а прыслаў толькі запісаныя ім акты аб тым, што сяляне не пажадалі ісці на працы па абароне Бабруйскага раёна" [166, с. 832 - 833].

Здаралася і так, што мясцовае насельніцтва аказвала рашучае супраціўленне не заўжды законным патрабаванням мясцовай адміністрацыі. За гэта ў дачыненні да рабочых прымяняліся розныя рэпрэсіўныя меры. 22 студзеня 1917 г. 16 чалавек сялян вёскі Панізоўе Бараньскай воласці за ўхіленне ад выканання прымусовых нарадаў па перавозцы дроў пастановай магілёўскага губернатара зняволены на 10 сутак кожны [166, с. 835]. Наглядчыкі за

Витебский государственный технологический университет

выкананнем работ пра ўсе парушэнні дысцыпліны неадкладна дакладвалі мясцоваму спраўніку, а ў выпадку яго адсутнасці – губернатару [133, арк. 248 адв. – 250 адв.].

Маштабы прыцягнення мясцовага насельніцтва да выканання абарончых работ уражвалі. На працы, звязаныя з патрэбамі арміі, у прымусовым парадку пасылаліся пешшу і з фурманкамі тысячы сялян прыфрантавых паветаў, не зважаючы на самыя пільныя патрэбы ўласных гаспадарак і сямей. Летам 1916 г. у Мінскай губерні на прымусовых ваенных работах былі заняты 219300 мужчын і жанчын, у Віцебскай губерні – 121200 пешых рабочых і 44000 фурманак [286, с. 444]. Толькі на будаўніцтва ўмацаванняў Гродзенскай крэпасці было прыцягнута 26000 акопных рабочых Сенненска-Лепельскага раёна [231, с. 69].

## 2. 3 Арганізацыя медыцынскай дапамогі

Адной з асноўных праблем, якую прыходзілася вырашаць у гады вайны, было апекаванне над хворымі і параненымі. Колькасць іх няспынна расла разам з істотным напłывам бежанцаў. Арганізацыя медыцынскай дапамогі, аказанне ветэрынарных і санітарна-эпідэміялагічных паслуг на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі праходзілі са шматлікімі цяжкасцямі, якія перш за ўсё былі звязаны з блізкасцю фронту, з адсутнасцю неабходнай колькасці кваліфікаванага персаналу, з крытычным недахопам матэрыяльных сродкаў, лекаў і медыкаментаў, будынкаў і памяшканняў для хворых ці параненых.

Істотным чынам змяніліся і шляхі атрымання насельніцтвам медыцынскай дапамогі. Шмат якія стацыянарныя лякарні перасталі функцыянаваць. Замест іх пачалі сваю актыўную дзейнасць губернскія і павятовыя камітэты Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам і Усерасійскага саюза гарадоў [79, с. 437 - 438]. Пры дапамозе ЗемГора ствараліся санітарныя пункты. Урачы Усерасійскага земскага саюза аказвалі медыцынскую дапамогу як параненым і бежанцам, так і мясцоваму насельніцтву праз разгалінаваную сетку ўстановаў: харчова-назіральныя пункты, інфекцыйныя баракі, эпідэмічныя і воспапрышчапляльныя атрады, шпіталі, лазні, лазарэты, зубаўрачэбныя кабінеты [255, с. 139].

Так, па хадайніцтве Віцебскай думы Усерасійскім Саюзам гарадоў Віцебску была аказана істотная дапамога. На сродкі Саюза былі зроблены інфекцыйныя баракі на 250 ложкаў з дэзінфекцыйнымі камерамі, значна пашырана гарадская інфекцыйная лякарня (з 30 да 100 ложкаў), арганізаваны

Витебский государственный технологический университет

гарадскі санітарны атрад для дэзынфекцыі і перавозкі параненых. У розных частках горада для насельніцтва былі пастаўлены 7 кіпяцільнікаў і 5 новых водазаборных будак [87, с. 195].

Эфектыўна функцыянавала ад моманту свайго заснавання Мінскае таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам (МТАДВ). Яно было арганізавана 28 жніўня 1914 г. і мела ў сваім складзе 183 дзейныя члены і 269 супрацоўнікаў [300, арк. 1]. Сярод іх былі такія ўплывовыя асобы, як начальнік Мінскай ваеннай акругі генерал ад кавалерыі барон Е.А. Раўш фон Траўнберг, начальнік Лібава-Роменскай чыгункі, сапраўдны стацкі саветнік А.Г. Генрыхсан, мінскі губернскі прадвадзіцель дваранства Далгаво-Сабураў і іншыя. Згодна са статутам, мэтай таварыства было аблегчыць становішча хворых і параненых воінаў, якіх правозілі па чыгунках праз горад Мінск з тэатра ваенных дзеянняў, шляхам прадастаўлення ім неабходных прадметаў вопраткі, абутку, харчавання, перавязачных сродкаў і інш. [302, арк. 3].

Асноўны капітал арганізацыі складалі грошы, атрыманыя ад ахвяраванняў, наладжванні дабрачынных канцэртаў, членскіх узносаў. Прычым, фінансавыя магчымасці таварыства былі даволі істотнымі. Толькі ад арганізацыі 14 верасня 1914 г. продажу нацыянальных сцяжкоў 6-ці саюзных краін быў атрыманы прыбытак каля 5000 рублёў [303, арк. 5 – 5 адв.].

Пра маштабы дзейнасці МТАДВ можна меркаваць па звестках, што змяшчаюць у сабе прыходна-расходныя кнігі цэнтральнага склада таварыства, які размяшчаўся на рагу Захар'еўскай вуліцы і Захар'еўскага завулка ў новым доме Земляробчага таварыства ўзаемнага страхавання. У табліцы 2. 1 прыведзены статыстычныя падлікі на 23 снежня 1914 г. [303, арк. 20 – 20 адв.].

Са складу харчовага пункта МТАДВ, які размяшчаўся на Віленскім вакзале, на 1 студзеня 1915 г. было выдаткавана 8487 рублёў 28 капеек ахвяраваных грошай, яшчэ 2329 рублёў і 4 капейкі знаходзілася ў касе [304, арк. 1]. А за 4 месяцы існавання гэтым таварыствам было раздадзена 92 715 булак, агульнаю вагою 89 пудоў, 34 фунты цукру, 46 фунтаў чаю, 37 фунтаў масла, 32 фунты солі, 7 фунтаў кавы, 9 пудоў манных і аўсяных круп, 8 пудоў хлеба [304, арк. 1 адв.]. Як бачна, маштабы дзейнасці і эфектыўнасць працы МТАДВ былі ўражлівымі.

Витебский государственный технологический университет

Табліца 2. 1- Вытрымкі з прыходна-расходнай кнігі цэнтральнага склада МТАДВ

| Найменне | Набыта | Выдадзена | Маецца на складзе |
|---|---|---|---|
| кашулі | 1036 | 663 | 373 |
| цёплыя кашулі | 494 | 435 | 59 |
| споднікі | 978 | 579 | 399 |
| цёплыя споднікі | 244 | 154 | 90 |
| фуфайкі | 372 | 177 | 195 |
| ватнія курткі | 100 | 55 | 45 |
| цёплыя курткі | 369 | 235 | 134 |
| нагавіцы | 439 | 265 | 174 |
| шапкі | 311 | 295 | 16 |
| пальчаткі | 919 | 634 | 285 |
| башлыкі | 106 | 92 | 14 |
| напульснікі | 99 пар | 58 | 41 |
| панчохі | 176 пар | 166 | 10 |
| анучы | 600 пар | 524 | 76 |
| шкарпэткі | 523 пары | 371 | 152 |
| шытыя шкарпэткі | 140 пар | 130 | 10 |
| чаравікі | 223 пары | 135 | 88 |
| валёнкі | 200 пар | 100 | 100 |
| мыліцы | 295 | 190 | 105 |
| цёплыя шалікі | 210 | 140 | 70 |
| коўдры | 55 | 40 | 15 |
| цыгарэты | 32910 | 30910 | 2000 |
| махоркі | 670 фунтаў | 470 | 200 |
| курыльная папера | 13 пачкаў | 13 | - |
| запалкі | 1985 пачкаў | 1265 | 720 |
| мыла | 62 фунты | 27 | 35 |
| цукар | 287 фунтаў | 260 | 27 |
| бумазея | 45 | 45 | - |
| байка | 65 аршын | 35 | 30 |
| каленкор | 60 аршын | 60 | - |
| зефір | 152 | 92 | 60 |

Актыўна працавала і арганізацыя Чырвонага Крыжа. Яна займалася фарміраваннем санітарных цягнікоў, уладкаваннем ваенных лазарэтаў,

Витебский государственный технологический университет

забеспячэннем медыкаментамі, вяла барацьбу з эпідэмічнымі захворваннямі [255, с. 79]. У сваю чаргу дзяржава аказвала некаторую матэрыяльную дапамогу гэтай арганізацыі. Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 1 верасня 1914 г., былі павялічаны ўстаноўленыя на карысць Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа зборы з праязджаючых па чыгунках пасажыраў (да 10 капеек – для білетаў 3-га класа, да 15 капеек – для білетаў 2-га класа і да 20 капеек – для білетаў 1-га класа) [45, с. 194].

На патрэбы медыцыны часам ахвяравалі даволі істотныя сумы грошай як асобныя людзі, так і грамадскія аб’яднанні і таварыствы. Так, Мінскае таварыства ўзаемнага страхавання ад агню ахвяравала ў студзені 1915 г. 400 рублёў для аказання дапамогі хворым і параненым. С.Н. Рубінштэйн вылучыў 78 рублёў, сабраных ім падчас дабрачыннай музычнай вечарыны ў зале дэпутацкага сходу [303, арк. 21 - 26].

Аказвалі медыцынскую дапамогу насельніцтву і мабільныя ўрачэбна-харчовыя атрады, якія мелі запасы медыкаментаў [231, с. 9]. Стацыянарна ж працавалі харчова-перавязачныя размеркавальныя пункты. Так, напрыклад, праз Мінскі пункт да 1 сакавіка 1915 г. прайшло 159 тысяч чалавек. Такія ж пункты, але значна меншых памераў, былі арганізаваны ў Пінску, Барысаве, Бабруйску, Асіповічах, Мазыры, Лунінцы, Рэчыцы, Слуцку, Сіняўцы, Горках, Ляхно, Лубенцы [255, с. 80].

Імкнуліся дапамагчы з размяшчэннем бежанцаў і аказаннем ім медыцынскай дапамогі мясцовыя памешчыкі. Але ж з-за недахопу фінансавання гэта не заўжды атрымлівалася на належным узроўні. Да прыкладу, памешчык Бабруйскага павета Станкевіч у лісце да старшыні Савета Міністраў наступным чынам апісваў становішча: “У маім двары і садах размяшчаецца 20 – 40 тысяч няшчаснага народу, халоднага і галоднага, халера забірае штодзень масу ахвяр, ляжыць розная падла, якую ніхто не прыбірае, у флігелі туляцца дзясяткі хворых, санітарнай дапамогі ніякай, паветра жахлівае, народ з’язджае, а тыя, хто зноў прыехаў, займаюць іх месцы ў суцэльным брудзе і тут жа паміраюць. Нябожчыкаў закопваюць тут жа на ½ аршына глыбінёй на двары маім, за тры сажні ад ганка жылога дома” [Цыт. па 256, с. 215].

Часам асігнавалі грашовыя сродкі на ўрачэбныя мэты і гарадскія думы. Так, 23 ліпеня 1915 г. Віцебская дума тэрмінова вылучыла 4 700 рублёў на будаўніцтва пры гарадской лякарні разборнага барака для хворых. Пачалі працаваць аддзяленні на 25 ложкаў пры інфекцыйнай лякарні, два баракі для хворых на халеру на 70 чалавек [87, с. 195].

У асобных гарадах функцыянавалі хіміка-бактэрыялагічныя лабараторыі. Яны мелі наступныя функцыі: бактэрыялагічныя і клінічныя даследаванні, аналіз вады, вызначэнне прыдатнасці вакцыны, даследаванне стэрыльнасці

Витебский государственный технологический университет

перавязачнага матэрыялу, забеспячэнне шпіталяў дыстыляванай вадой, фізіялагічным растворам і агар-агарам [231, с. 91].

Ніжнія чыны і мясцовае насельніцтва магло атрымліваць медыцынскую дапамогу і ў лякарнях "грамадскага догляду". Але ж гэта было не бясплатна. Прычым, расцэнкі істотна вагаліся ў залежнасці ад губерні. Розніца ў аплаце паслуг добра бачна на прыкладзе табліцы 2.2 [299, арк. 99 адв.].

Табліца 2. 2 - Кошт паслуг у лякарнях "грамадскага догляду"

| Губерні | За ўтрыманне хворага ў суткі (без аплаты за медыкаменты) у капейках | За пахаванне памерлага | За выраб і ўстаноўку надмагільных крыжоў |
|---|---|---|---|
| Віцебская | 94 | 4 р. 44 к. | 1 р. 95 к. |
| Магілёўская | 96 | 5 р. 83 к. | 3 р. 51 к. |
| Мінская | 1 р. 6 к. | 6 р. 53 к. | 4 р. 34 к. |

Да ліку найбольш пашыраных хвароб на неакупіраванай тэрыторыі адносіліся: воспа, халера, сухоты, сыпны тыф, дызентэрыя, пнеўманія, дыфтэрыя, шкарлятына, рожа і інш. Асабліва цяжка было спраўляцца з гэтымі хваробамі з-за пастаяннага наплыву бежанцаў. Рэзка знізіліся гігіенічныя нормы, і стварылася болей магчымасцей для частага і шчыльнага кантакту з бацылярнымі хворымі [363, с. 36]. Бежанцы не мелі ні часу, ні дастаткова магчымасцей, каб пахаваць памерлых у дарозе ў адпаведнасці з санітарна-гігіенічнымі нормамі.

Эдвард Вайніловіч пісаў пра гэта так: "Рады прыдарожных магіл пазначалі той шлях, па якім цягнуліся натоўпы ўцекачоў, захопліваючы ўсё большы абшар, каб расстарацца сродкаў для існавання сабе і свайму "жывому інвентару" [450, с. 8]. У гарадах і мястэчках для іх размяшчэння катастрафічна не хапала месца. Прынамсі, у Полацку ў кастрычніку 1915 г. пасля санітарнага агляду горада і ў прыватнасці бежанскіх баракаў на Ільінскай плошчы высветлілася, што баракі разлічаны на 600 чалавек, а размяшчалася ў іх 1330 бежанцаў [255, с. 80]. Зразумела, што такое становішча было вельмі спрыяльным для развіцця рознага кшталту інфекцыйных захворванняў.

Сапраўдным няшчасцем для насельніцтва была воспа. Небяспека, звязаная з хуткім распаўсюджаннем гэтай хваробы, была добра ўсвядомлена яшчэ да пачатку вайны. Так, 21 чэрвеня 1914 г. царом быў зацверджаны закон "Аб устанаўленні палажэння аб папярэджвальным воспапрышчапленні" [310, арк. 9]. Згодна з ім, прышчэпкі ад воспы хоць і не сталі абавязковымі, але ж за прафілактыкай захворвання ўстанаўліваўся пільны кантроль. Рэкамендавалася праводзіць першую прышчэпку ад воспы ўсім дзецям па дасягненні імі аднаго

Витебский государственный технологический университет

года. Сама працэдура прышчэпкі разглядалася як хірургічная аперацыя і павінна была праводзіцца з усімі асэптычнымі перасцярогамі.

Пачатак баявых дзеянняў прывёў да значнага росту захворванняў на воспу, асабліва ў прыфрантавой паласе. Вялікая колькасць бежанцаў і антысанітарныя ўмовы пражывання спрыялі найбольш хуткаму распаўсюджванню хваробы. Зразумела, што ва ўмовах ваеннага часу і катастрафічнага недахопу дактароў прышчэпкі ад воспы рабіць не было каму. Таму масава пачалі арганізоўваць адмысловыя курсы з мэтай даць асобам без медыцынскай адукацыі неабходную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку для воспапрышчаплення [310, арк. 16].

Такія курсы арганізоўваліся пераважна прыватнымі асобамі і грамадскімі арганізацыямі, часам на бясплатнай аснове. Курсантамі маглі стаць толькі асобы, якія знаходзіліся ў рускім падданстве, не маладзейшыя за 18 гадоў і якія пры гэтым не мелі супрацьпаказанняў да азначанага віду ўрачэбнай дзейнасці. Загадчыкам курсаў мог быць толькі доктар, на практыцы знаёмы з воспапрышчапленнем, які пэўны час займаў пасаду на ўрадавай ці грамадскай службе. У праграму навучання ўваходзіла абавязковае азнаямленне з элементарнымі звесткамі па гігіене, па працяканні захворвання на натуральную воспу, тэхніка аперацыі воспапрышчаплення людзям, медыцынскія практыкаванні пад наглядам урача. Па заканчэнні курсаў праводзіўся іспыт (абавязкова ў прысутнасці прадстаўніка ад мясцовай урачэбнай інспекцыі) і выдавалася адмысловае пасведчанне. Яно давала права праводзіць воспапрышчапленне пад наглядам доктара.

Аналізуючы дакументы медыцынскіх аддзяленняў губернскіх праўленняў, можна бачыць памеры і эфектыўнасць прафілактычнага воспапрышчаплення. Той факт, што асобныя павятовыя і гарадскія ўправы прадастаўлялі інфармацыю аб воспапрышчапленні нерэгулярна і не ў поўным аб’ёме, уносіць пэўную недакладнасць у звесткі (хоць у цэлым гэта не можа істотна паўплываць на агульныя высновы). Так, за першае паўгоддзе 1916 г. у Віцебскай губерні былі зроблены прышчэпкі ад воспы 29925 чалавекам. З гэтай колькасці дзяцей да аднаго года было – 10161, ад 1да 5 гадоў – 5226, ад 5 да 10 гадоў – 4865, людзей іншага ўзросту – 9676. З агульнай колькасці ўпершыню прышчэпленых вынік быў пракантраляваны ў 13 973 чалавек (у 11806 – паспяхова, а ў 2167 – няўдала) [310, арк. 2].

Перыядычна праводзіліся і паўторныя прышчэпкі ад воспы (рэвакцынацыя). Але папярэджвальнае воспапрышчапленне не набыло масавага характару ў першую чаргу з-за недахопу кваліфікаванага медыцынскага персаналу і цяжкасцей ваеннага часу. Для прыкладу, за першае паўгоддзе 1916 г. у Віцебску было прышчэплена ўсяго толькі 149 чалавек, а ў Полацку – 108 [310, арк. 2]. Усяго ж па Віцебскай губерні за 1916 г. было прышчэплена

Витебский государственный технологический университет

каля 1,5% насельніцтва. Усё гэта стварала значныя цяжкасці для змагання з распаўсюджваннем хваробы і недапушчэннем перарастання яе ў маштабную эпідэмію. У Віцебскай губерні за першае паўгоддзе 1916 г. з 10558 народжаных – 2011 памерлі ва ўзросце да аднаго года [310, арк. 4]. Па Магілёўскай і Мінскай губерні назіраліся амаль такія ж паказчыкі.

Хуткімі тэмпамі расла і колькасць хворых на цынгу як сярод грамадзянскага насельніцтва, так і сярод вайскоўцаў. Так, у жніўні – верасні 1914 г. у рускай арміі было зарэгістравана ўсяго толькі 90 выпадкаў хваробы на цынгу, у 1915 г. – 770, у 1916 г. – 78250, а ў студзені – верасні 1917 г. – 283646 выпадкаў [363, с. 37 - 38].

Згодна з загадам Вярхоўнага галоўнакамандуючага, адмяняліся звальненні салдат у гарады, бо там амаль не спынялася эпідэмія сыпнога тыфу [133, арк. 246].

У гады вайны лячэнне інфекцыйных хвароб было на першым месцы, бо існавала пагроза буйнамаштабных эпідэмій. Амаль усе лякарні, санітарныя і фельчарскія пункты арганізоўваліся як заразныя [231, с. 89]. Але нягледзячы на значныя высілкі, змаганне з тыфам, воспай, халерай не заўжды было паспяховым і эфектыўным.

У гады вайны катастрафічна не хапала грошай на арганізацыю медыцынскай дапамогі. Фінансаванне дзяржаўных лячэбных устаноў праводзілася па астаткавым прынцыпе. Адсутнічалі медыкаменты і неабходныя прэпараты. Да прыкладу, службоўцы Чавускай павятовай земскай управы зазначалі, што “… няма магчымасці расплочвацца як з пастаўшчыкамі медыкаментаў і прадуктаў для земскіх лякарняў, так і са службоўцамі земства. Управа будзе пастаўлена ў безвыходнае становішча і ў самай недалёкай будучыні ёй прыйдзецца закрыць земскія лячэбніцы, фельчарскія пункты і г. д., а таксама распусціць усіх земскіх службоўцаў, з-за чаго ўсё насельніцтва павета застанецца без медыцынскай дапамогі” [163, арк. 10].

Будзённымі сталі справаздачы ўрачоў наступнага плану: “Пачала працу лякарня на 52 ложкі ў будынку валаснога праўлення. Памяшканне вельмі цеснае, бруднае, халоднае. Цяплім тры разы на дзень, але нагрэць вельмі цяжка, з усіх бакоў дзьме. Перавязачна-хірургічны пакой вельмі малы. Інфекцыйнага аддзялення наладзіць няма дзе, хаця ўсе навакольныя вёскі нядобранадзейныя па тыфе, іншых памяшканняў няма” [231, с. 69 - 70].

Апроч недастатковага фінансавання, адчуваўся і востры недахоп не толькі кваліфікаваных медыцынскіх кадраў, але і санітараў. Вялікіх намаганняў каштавала запрасіць на працу ўрача. Больш за ўсё ў лякарнях мусілі працаваць асобы, якія толькі што скончылі курсы і былі яшчэ слаба знаёмыя з арганізацыяй грамадскай медыцыны. Амаль усе вольнапрактыкуючыя ўрачы неакупіраванай тэрыторыі Беларусі былі прызваны на вайну, і на месцах

Витебский государственный технологический университет

засталіся толькі адзінкі або старыя фельчары [231, с. 171]. Таму нават у вялікіх гарадах часам не было ніводнага вузкага спецыяліста. Да прыкладу: у Полацку ў 1915 г. былі ўсяго толькі 2 зубныя ўрачы [231, с. 90].

Не хапала сядзелак для догляду за хворымі і параненымі. Рапарт шараговага службоўца пошты Вараб'ёва ў Гомельскі камітэт паштова-тэлеграфных службоўцаў ад 4 кастрычніка 1917 г. нагляднае таму пацвярджэнне: "…у жонкі маёй пераламана костка на левай назе, і яна знаходзіцца на лячэнні ва Увараўскай земскай лячэбніцы. З-за таго, што ў азначанай лячэбніцы ёсць толькі адна сядзелка, якая не можа аказаць паслугі маёй жонцы, якой неабходна пастаянная дапамога, а таксама і для ўладкавання дамашніх спраў прашу мясцовы камітэт дазволіць мне 10-дзённы адпачынак, які мне патрэбны і неабходны" [145, арк. 795 – 795 адв.].

Не лепшай была справа з забеспячэннем кадрамі і ў ветэрынарыі. Да прыкладу, Магілёўскі губернскі земскі сход прыняў наступную пастанову: "З-за прызыву ў дзеючую армію ветэрынарнага ўрача, загадчыка Шамаўскім ветэрынарным участкам, і ветэрынарнага фельчара, які знаходзіцца ў яго распараджэнні, участак гэты прыйшлося тэрмінова ліквідаваць, прычым, медыкаменты перададзены ў распараджэнне Мсціслаўскага ветэрынарнага ўрача, а хірургічныя інструменты і іншая маёмасць знаходзяцца апячатанымі на захаванні ў Шамаўскім валасным праўленні. Паколькі цяпер знайсці іншы персанал для пазначанага ўчастка не ўяўляецца магчымым, то губернская ўправа, не ўносячы на ўтрыманне гэтага ўчастка ніякіх асігнаванняў па каштарысе на наступны год, вырашыла Шамаўскі павятовы ветэрынарны ўчастак пакінуць закрытым да заканчэння вайны" [496, с. 3].

Апроч вышэйзгаданых цяжкасцей, урачы на неакупіраванай тэрыторыі мусілі змагацца з наступствамі новых, раней невядомых ці слабавывучаных хвароб. У шпіталях была маса людзей, якія пакутавалі ад уздзеяння атрутных хімічных газаў або знаходзіліся ў шокавым стане пасля артабстрэлаў. Дарэчы, сам тэрмін "shellshock" – шок ад артабстрэлаў, – быў уведзены англійскім псіхіятрам Чарльзам Майерсам толькі зімой 1915 г. [372, с. 315].

**Такім чынам**, можна сцвярджаць, што на ўсім працягу вайны да яе не было адзінадушнага стаўлення. Патрыятычны ўздым даволі хутка змяніўся насцярожанасцю і няўпэўненасцю насельніцтва. Гэтаму паспрыяла пагаршэнне эканамічнага становішча, няспынны рост цэн, паражэнні на франтах. Беларускія землі немагчыма было схіліць да масавага самаахвяравання пад лозунгамі "За веру, Цара і Айчыну". Тым больш што, у адрозненне ад іншых земляў імперыі, у беларускіх губернях вайну не называлі "Айчыннай". Мары і спадзяванні на хуткае і пераможнае заканчэнне вайны, як і прагназавалі асобныя ваенныя тэарэтыкі, не спраўдзіліся.



Витебский государственный технологический университет

Мабілізацыі і абарончыя работы істотным чынам адбіліся на жыцці мясцовых жыхароў. Названыя мерапрыемствы праводзіліся з парушэннямі заканадаўства, што выклікала справядлівую хвалю абурэння сярод насельніцтва. Пры падаўленні пратэстных настрояў царскія ўлады прымянялі рашучыя меры.

Насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны напоўніцу зазнала на сабе ўвесь цяжар інфекцыйных хвароб (сыпны тыф, халера, воспа, дызентэрыя), пакутавала ад недахопу кваліфікаваных і вопытных медыцынскіх работнікаў, недахопу перавязачнага матэрыялу, медыкаментаў, амаль поўнай адсутнасці з боку дзяржавы фінансавання лячэбных устаноў. З іншага боку, назіраліся істотныя праявы людской салідарнасці, рабіліся ахвяраванні як прыватнымі асобамі, так і грамадскімі арганізацыямі і аб’яднаннямі.

Витебский государственный технологический университет

# ГЛАВА 3
# ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА

## 3. 1 Стан сельскай гаспадаркі

Витебский государственный технологический университет

У апошнія перадваенныя гады ў сельскагаспадарчым жыцці беларускіх земляў назіраліся наступныя тэндэнцыі: малазямельныя сяляне пераходзілі ў стан батракоў ці перасяляліся ў гарады. У выніку набыцця зямлі павялічвалася яе канцэнтрацыя ў руках заможнага сялянства. Усё большая колькасць памешчыцкіх гаспадарак пераходзіла на капіталістычны лад. Істотным чынам выраслі выдаткі на агрaномію, ствараліся механізаваныя машынапракатныя станцыі і зернеачышчальныя пункты. Вырасла культура апрацоўкі зямлі, шырока сталі прымяняцца мінеральныя ўгнаенні.

Першая сусветная вайна нанесла сельскай гаспадарцы неакупіраванай тэрыторыі Беларусі вялікую шкоду. У выключна цяжкім становішчы апынулася ўсё вясковае насельніцтва. У 1915 – 1916 гг. пэўным стабілізуючым фактарам яшчэ былі вынікі даволі добрых ураджаяў папярэдніх гадоў [355, с. 95]. Але ж, пачынаючы з канца 1916 г. сітуацыя на вёсцы стала катастрафічна пагаршацца. Да таго ж, дзяржава не аказвала істотнай фінансавай дапамогі вясковаму насельніцтву. І гэта пры тым, што ад эфектыўнай і якаснай працы сялян залежаў не толькі харчовы дабрабыт у краіне, але і забеспячэнне арміі харчам і фуражом.

Наступствы ваеннага часу прывялі да руйнавання механізмаў тавараабмену ўнутры краіны. А спекулятыўная гульня паноў, вясковай буржуазіі і хлебагандляроў на падвышэнні цэн значна паслаблялі ранейшыя стымулы для рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі [328, с. 484]. Як вынік сяляне сталі масава вяртацца ад рынкавай да натуральнай гаспадаркі, а харчовыя прадукты перасталі паступаць у лаўкі і крамы, выклікаўшы неймаверна імклівы рост цэн і зніжэнне жыццёвага ўзроўню ўсяго насельніцтва.

Надзвычай востра адчуваўся на вёсцы недахоп працоўных рук. Бо менавіта сялянства стала асноўным рэзервам для папаўнення арміі: да восені 1917 г. з 15,8 млн. усіх мабілізаваных у Расійскай імперыі звыш за 12,8 млн. былі прызваны з вёскі [355, с. 88]. Колькасць жа прызваных з беларускіх земляў у працэнтных адносінах была яшчэ больш высокай. Калі па 50-ці губернях імперыі ў цэлым на працягу вайны было мабілізавана 47,4 % працаздольных мужчын, то ў Магілёўскай губерні – 50,7 %, а ў Віцебскай – 52,2 %. Толькі з вёсак Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай губерняў было мабілізавана на вайну да верасня 1917 г. 634,4 тыс. чалавек [255, с. 75]. Гэта пры тым, што ў 1913 г. у

паветах Віцебскай губерні пражывала ўсяго толькі 811100 мужчын (менш за ўсё ў Беларусі), у паветах Магілёўскай губерні – 1090600, Мінскай – 1370000 [166, с. 29]. А мужчынскага насельніцтва ў Віцебскай і Магілёўскай губернях было менш, чым жаночага.

Такім чынам, больш за палова працаздольных мужчын была мабілізавана і адпраўлена на фронт. У выніку шмат сялянскіх гаспадарак (асабліва дробных) увогуле засталося без работнікаў. Не лепшай была сітуацыя з гэтым і ў панскіх маёнтках. Істотным чынам і на даволі працяглы перыяд часу змянілася полаўзроставая структура вясковага насельніцтва: удзельная вага жанчын і старых стала дамінуючай.

Апроч пастаянных мабілізацый на фронт, сяляне масава забіраліся на розныя дапаможныя работы: ахова чыгуначнага палатна і тэлеграфных ліній, разнастайных аб'ектаў ваеннага і гаспадарчага прызначэння, узвядзенне абарончых і фартыфікацыйных збудаванняў, рамонт дарог і мастоў, перавозка казённых грузаў і вайсковага дапаможнага інвентару на вялікія адлегласці. Як вынік, гаспадарак без працаздольнай мужчынскай сілы налічвалася ў 1917 г. у Віцебскай губерніі – 32,5% а ў Мінскай – 30,1% [81, с. 420].

Не аказвалася істотная дапамога і матэрыяльная падтрымка сялянству і з боку грамадзянскіх улад. А часта здараліся і цалкам адваротныя выпадкі. Так, селянін вёскі Паташня Веліжскага павета У.І. Цехачанкоў скардзіўся віцебскаму губернатару ў сакавіку 1917 г.: "З некаторага часу я і іншыя мае суседзі падвяргаюцца немагчымым выпрабаванням і гвалту з боку стражнікаў. Азначаныя ўлады (станавы прыстаў, валасны старшыня) прыязджаюць да нас забіраць нас прымусова, быццам бы на акопныя работы, без усялякай чаргі, без усялякіх спісаў, вяжуць нам рукі, вязуць прымусова, забіраюць авёс і корм для коней, пагражаючы ўсё спаліць, калі мы не будзем даваць усяго для іх бясплатна" [108, арк. 75]. Такія прыклады былі далёка не адзінкавымі, бо вясковая адміністрацыя ўсё часцей і часцей вырашала рознага кшталту праблемы праз істотнае павелічэнне ўціску і эксплуатацыі сельскіх жыхароў.

Шмат вясковага насельніцтва вымушана было назаўжды пакінуць родныя мясціны, маёмасць і рушыць на ўсход, як мага далей ад лініі фронту. Даволі часта здараліся і прымусовыя эвакуацыі, пры дапамозе якіх царскія ўлады хацелі знізіць у прыфрантавой паласе сацыяльную напружанасць і рэвалюцыйныя настроі, якія імкліва пашыраліся з-за поспехаў бальшавіцкай агітацыі і прапаганды.

Каб хоць трохі палепшыць сітуацыю з забеспячэннем вёскі працоўнымі рукамі, асобныя настаўнікі і кіраўнікі навучальных устаноў пачалі ствараць добраахвотныя дружыны з навучэнцаў дзеля аказання імі пасільнай дапамогі сялянам. Варта зазначыць, што рух гэты ўзнік стыхійна і не быў арганізаваны ўладамі, якія часта баяліся ўзяць на сябе адказнасць і ініцыятыву. Больш таго,

Витебский государственный технологический университет

асобныя кіраўнікі ставіліся да гэтага руху з вялікай доляй скепсісу і сарказму і часта не падтрымлівалі добрыя памкненні і мясцовую ініцыятыву. Напрыклад, у Магілёўскай гімназіі была створана пробная дружына, у якую ўваходзіла каля 60 чалавек, якія выявілі жаданне працаваць на дапаможных сельскагаспадарчых работах. Але Магілёўскае павятовае земства сустрэла гэту ініцыятыву надзвычай негатыўна. Калі ж мясцовае начальства ўсё ж такі "давала дабро" на стварэнне і працу такіх дружын, то вельмі часта "… не было грошай, невядома было, дзе ёсць патрэба ў працоўных руках, не было і кіраўнікоў, якія б накіроўвалі працу па правільным рэчышчы" [30, с. 3].

Вельмі часта дружыну фарміравалі ў адным месцы, а на працу накіроўвалі кожны дзень на розныя аб'екты, якія размяшчаліся за дзясяткі кіламетраў ад месца яе дыслакацыі, прычым, дабірацца туды навучэнцы мусілі ўласнымі сродкамі: "Штодзень ад'язджалі вярсты за 3-10 ад дому" [30, с. 36]. А ад гэтага цярпелі эфектыўнасць і якасць працы.

Апроч гэтага, мог быць значна лепшы і сельскагаспадарчы інвентар, калі яго ўвогуле давалі "дружыннікам": "…навучэнцаў забяспечвалі такімі інструментамі (косамі і граблямі), што ні адзін рабочы не згадзіўся б імі працаваць" [30, с. 37]. Па-рознаму было і з аплатай за зробленую працу. Большая частка навучэнцаў атрымлівала толькі памяшканне для пражывання і харч, а некаторым плацілі "…30 рублёў у месяц і давалі 15 рублёў на боты" [30, с. 3].

За некаторымі выключэннямі, якія былі выкліканы дрэннымі ўмовамі надвор'я, рабочы дзень школьных памагатых праходзіў амаль ва ўсіх дружынах па адным раскладзе. "З 6-ці гадзін раніцы да 12 гадзін дня з перапынкам да гадзіны на немудрагелісты абед і затым да 7 - 8 гадзін вечара з паўгадзінным перапынкам на гарбату" [49, с. 12]. Колькасць жа вучняў у працоўных дружынах у сярэднім не перавышала 15 чалавек, з рэдкімі ваганнямі ад 7 да 33 [49, с. 15]. Варта зазначыць, што па сваіх узроставых характарыстыках у склад працоўных дружын уваходзілі ў асноўным 14 – 16-гадовыя навучэнцы.

Некаторыя школьнікі пасля цяжкага працоўнага дня яшчэ займаліся тым, што вучылі чытаць і пісаць сялянскіх дзяцей, развучвалі песні і вершы, тлумачылі ім арыфметычныя дзеянні. Гэта было надзвычай актуальна, бо ўжо ў 1915 г. з беларускіх земляў больш за 4000 настаўнікаў былі прызваныя ў дзеючую армію, а ў працэнтных адносінах па асобных паветах гэты паказчык дасягаў 75 % [17, с. 20].

У выніку даволі імклівага пашырэння добраахвотных дружын у пачатку 1915 г. была створана спецыяльная камісія. Яна складалася з начальнікаў вучэбных устаноў горада Мінска, членаў землеўпарадкавальнай камісіі, павятовых аграномаў і іншых асоб. Гэтая камісія выпрацавала "Асноўныя правілы арганізацыі працоўных дружын з навучэнцаў старэйшых класаў

Витебский государственный технологический университет

вучэбных устаноў Міністэрства народнай асветы ў Мінскай губерні” [458, с. 28]. Пасля гэтага рух па стварэнні працоўных дружын набыў значна больш шырокія маштабы. Ды і плён ад іх дзейнасці стаў намнога больш заўважным і карысным. Адна толькі брыгада з навучэнцаў Магілёўскай гімназіі за 38 дзён рассартавала 2100 падвод, 600 з якіх былі пагружаны на чыгуначныя платформы, вывезла з лесу некалькі вазоў з бярвеннем 6 – 9 - 12 аршынаў, выкасіла 12,5 дзесяцін лугавой і садовай травы, канюшыны і вікі, выкасіла і звезла ў хлявы 1700 пудоў сена, было звязана ў снапы жыта на 8-мі дзесяцінах і г.д. [30, с. 36].

Калі да стварэння добраахвотных працоўных дружын з навучэнцаў дзяржава мела даволі слабае дачыненне, то праца ваеннапалонных на сельскагаспадарчых работах адразу ж была ўзята не толькі ваеннымі, але і грамадзянскімі ўладамі пад пільны кантроль.

Ужо 28 лютага 1915 г. царом былі зацверджаны “Правілы аб водпуску ваеннапалонных на сельскагаспадарчыя работы”. Згодна з імі, у сельскай мясцовасці пажадана было выкарыстоўваць асоб “…не нямецкага і не мадзьярскага паходжання” [151, арк. 1]. Прадстаўнікоў гэтых нацыянальнасцей часцей за ўсё ссылалі далёка ўглыб імперыі, каб мець менш праблем у выпадку імклівага наступлення ворага.

На земскія ўправы, якія займаліся размеркаваннем ваеннапалонных, ускладаўся цэлы шэраг абавязкаў: неадкладная дастаўка да месца працы; забеспячэнне харчаваннем і медыцынскай дапамогай ваеннапалонных з часу іх прыёму да перадачы ў асобныя гаспадаркі; назіранне за атрыманнем ваеннапалоннымі харчавання, па магчымасці роўнага з харчаваннем для ніжніх воінскіх чыноў, а таксама вопраткі і абутку, неабходных для захавання іх здароўя; назіранне за санітарным станам на месцах працы; тэрміновае вяртанне ваеннапалонных па першым патрабаванні ваеннага начальніка ў пункты іх прыёму і г. д. [151, арк. 1- 1 адв.]. Апроч таго, земскія ўправы абавязаны былі арганізаваць наём на працу і яе аплату вартаўнікам, якія сачылі, каб не было ўцёкаў. Агульнае ж кіраўніцтва аховай ваеннапалонных ускладалася на чыноў мясцовай паліцыі.

Вялікія цяжкасці існавалі і з перавозкай ваеннапалонных. Пры яе ажыццяўленні часцей за ўсё не выконваліся нават самыя элементарныя санітарныя патрабаванні. Толькі 2 сакавіка 1917 г. з Петраграда павятовым земскім управам Магілёўскай губерні, Магілёўскай і Гомельскай гарадскім управам была даслана ваенная тэлеграма за № 29. У ёй зазначалася, што з мэтай назірання за санітарным станам партый ваеннапалонных, якіх перавозілі з адных пунктаў у іншыя, і для своечасовага прыняцця папярэджвальных мер пры з’яўленні ў іх заразных захворванняў патрэбна, “каб з пунктаў фарміравання і адпраўлення партый ваеннапалонных загадзя прадастаўляліся

Витебский государственный технологический университет

па тэлеграфе Галоўнаму санітарнаму ўпраўленню паведамленні, калі адпраўляецца партыя, якім нумарам эшалона ці якім цягніком ідзе партыя, якім маршрутам, у якім колькасным складзе, які канчатковы пункт прызначэння” [152, арк. 5]. Па прыбыцці ў пункт прызначэння загадана было падвяргаць каранціну партыі на працягу трох тыдняў перад іх далейшай рассылкай. Гэтыя меры прывялі да пэўнага паляпшэння эпідэміялагічнай абстаноўкі.

У першыя гады вайны ваеннапалонныя шырока выкарыстоўваліся землеўладальнікамі і прадпрымальнікамі для ўласных патрэб. Але цыркулярнай тэлеграмай Міністэрства ўнутраных спраў ад 25-га студзеня 1917 г. за № 75 губернскім уладам прапанавана было: “… паклапаціцца пра тое, каб неадкладна забраць у прыватных асоб ваеннапалонных, занятых для асабістых паслуг у якасці дамашняй прыслугі, прыказчыкаў, канторшчыкаў і г. д. і перавесці такіх ваеннапалонных на сельскагаспадарчыя работы” [152, арк. 18].

Але ж рабочых рук у сельскай гаспадарцы ўсё роўна не хапала. На работах пачалі выкарыстоўваць нават не да канца ачунялых ад раненняў ці хваробы ваеннапалонных. 21 студзеня 1917 г. Галоўным упраўленнем Генеральнага штаба (аддзяленне эвакуацыі і размеркавання ваеннапалонных) было распаўсюджана наступнае ўказанне: “З-за вострай патрэбы ў рабочых руках у сельскай гаспадарцы, галоўным чынам у доглядзе за свойскай жывёлай, праца, якая не патрабуе вялікага напружання фізічных сіл і можа быць выканана такімі палоннымі, якія не падыходзяць для фабрычных, завадскіх і асабліва рудніковых работ, прызнаецца пажаданым як мага шырэй выкарыстоўваць кантынгент слабых палонных як для згаданай патрэбы ў сельскай гаспадарцы, так і для іншых больш лёгкіх работ. Палонныя гэтыя могуць быць прыцягнуты да работы пры той умове, калі будуць дапушчаны дактарамі, будуць здольнымі выконваць пэўныя работы, якія не патрабуюць вялікай сілы, і калі самі пажадаюць працаваць. Палонных гэтай катэгорыі варта ўтрымліваць на асобым уліку, маючы на ўвазе, што ўмовы, у якіх яны будуць знаходзіцца на работах, могуць садзейнічаць іх выздараўленню і ўмацаванню іх сіл, пасля чаго яны могуць быць з поспехам выкарыстаны і для прызначэння па нарадах” [152, арк. 3]. Зразумела, што асаблівага плёну ад укаранення гэтага ўказання не было. Наадварот, вырас працэнт смяротнасці пры правядзенні работ.

Павятовыя земскія ўправы ўвесь час хадайнічалі ў губернатараў аб выдачы ім ваеннапалонных. Але іх просьбы альбо пакідаліся без адказу, альбо выдавалася ў разы меншая за неабходную колькасць ваеннапалонных. Так, Мсціслаўская павятовая ўправа, дзе становішча ў сельскай гаспадарцы было надзвычай складаным, замест патрэбных 700 ваеннапалонных атрымала толькі 100 [151, арк. 170- 177].

Витебский государственный технологический университет

Шматлікія злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі здараліся падчас размеркавання ваеннапалонных паміж прыватнымі гаспадаркамі. Так, 1 сакавіка 1917 г. у маёнтак Фралова графіні Салтыковай прыбыў 21 чалавек (з іх чэхаў – 12, палякаў – 7, русінаў – 2 [152, арк. 8 – 8 адв.]. Столькі ж ваеннапалонных атрымалі за ліпень-жнівень 1916 г. Бахоцкая і Любавіцкая воласць, разам узятыя. Гэта пры тым, што патрэбу ў працоўных руках у дадзеных валасцях мелі такія буйныя маёнткі, як Пепелеўка, Буда, Антонаўка, Бачэнкі, Навіны, Баравец, Жалязняк, Міноўка, Рай, Тыкліна, Дубасна, Петраполле [152, арк. 57 – 58 адв.].

Аплату працы ваеннапалонным за ўсе без выключэння віды работ было ўстаноўлена праводзіць наступным чынам: з заработнай платы ваеннапалонных, памер якой вызначаўся згодна з мясцовымі цэнамі для кожнай катэгорыі работ, на рукі выдавалася ад 20 да 50 капеек за рабочы дзень кожнаму, іншая ж частка заработнай платы за выняткам усіх выдаткаў павінна была здавацца на карысць дзяржавы [153, арк. 18]. Для прыкладу, мясцовы касец-мужчына за дзень зарабляў 3 рублі 50 капеек, а жанчына – 2 р. 50 капеек. У "гарачую пару" меней чым за 5 рублёў у дзень і за харчаванне ішлі на працу неахвотна [151, арк. 170].

На кожнага ваеннапалоннага заводзілася асобная разліковая кніжка. Заработная плата, утрыманая з ваеннапалонных з-за іх "нядбайнасці або па іншых прычынах", размяркоўвалася земскай управай па заканчэнні работ паміж ваеннапалоннымі, якія, дзякуючы сваёй стараннай працы, заслугоўвалі матэрыяльнага заахвочвання [151, арк. 1- 1 адв.].

Часта ўзнікалі рознага кшталту канфліктныя сітуацыі паміж ваеннапалоннымі і землеўладальнікамі, на якіх яны працавалі. 23 красавіка 1917 г. на пасяджэнні Манастыршчынскага валаснога выканаўчага камітэта была выслухана скарга ваеннапалоннага Ёзэфа Хапкуса, які знаходзіўся на сельскагаспадарчых работах у землеўладальніка маёнтка Слівіна Іосіфа Іванавіча Дзябоя. У ёй Хапкус наракаў на крайняе прыцясненне работамі, вельмі дрэннае харчаванне, грубае і жорсткае абыходжанне, адсутнасць бялізны і верхняй вопраткі, невыносныя ўмовы жыцця. Высветлілася, што Дзябой паводзіў сябе з ваеннапалонным Хапкусам крайне жорстка, груба, амаль зусім не апранаў яго. На пасяджэнне камітэта Хапкус прыйшоў у рыззі, маючы знясілены выгляд [152, арк. 19].

У Мсціслаўскую павятовую земскую ўправу ад палоннага падданага германскай імперыі Яна Шпандзеля паступіла наступная скарга: "Я знаходзіўся ў горадзе Мсціслаўлі ў мешчаніна Васіля Дзям'янавіча Валюжэніча на работах, а ён не дае харчоў і вопраткі" [152, арк. 20]. Як вынік, з тэлеграмы міністра земляробства ад 31 сакавіка 1917 г. за № 38 на імя губернскіх камісараў добра

Витебский государственный технологический университет

бачна, што "…істотна пачасціліся выпадкі ўцёкаў ваеннапалонных, аддадзеных для сельскагаспадарчых работ у прыватныя гаспадаркі" [151, арк. 17].

Значна пагаршала сітуацыю ў сельскай гаспадарцы неакупіраванай тэрыторыі Беларусі масавае бежанства. Прычым, далёка не заўжды яно было добраахвотным. Для тых, хто не хацеў пакідаць родную хату, прымусова ствараліся ўмовы, пры якіх заставацца далей каля лініі фронту было немагчыма з-за шматлікіх рэквізіцый і прымусовых абарончых работ. Тым, хто не з'язджаў з дому, пакідалі адну карову і сена на адзін месяц, астатнюю жывёлу і фураж канфіскоўвалі.

Акрамя таго, на жыхароў ваеннага тылу вялікім цяжарам леглі абавязкі ўтрымліваць за свой кошт маршавыя роты, якія не вельмі добразычліва ставіліся да насельніцтва [273, с. 60]. Часам, адступаючы, рускія войскі пры дапамозе грубай фізічнай сілы прымушалі жыхароў пакідаць свае населеныя пункты. У першую чаргу высялялася мужчынскае насельніцтва ва ўзросце ад 15 да 45 гадоў.

Вялікая колькасць бежанцаў проста не мела магчымасцей і фінансавых сродкаў, каб рухацца далей углыб краіны, і заставалася жыць у прыфрантавой паласе. Гэта ўскладняла і без таго катастрафічную сітуацыю ў сельскай гаспадарцы. Хворых, знясіленых, галодных, адарваных ад сваіх блізкіх людзей яшчэ і прымушалі працаваць амаль задарма. Так, у красавіку 1916 г. начальнікам Мінскай губерні быў разасланы мясцовым уладам новы цыркуляр аб мабілізацыі бежанцаў на сельскагаспадарчыя работы пад пагрозай пазбаўлення пайка. Згодна з ім месячная плата ўстанаўлівалася ў наступных памерах: мужчыну – 13 рублёў, жанчыне – 9 рублёў, падлетку – па ўзгадненні (у пераважнай большасці выпадкаў гэта азначала: за адно харчаванне, без грашовых выплат). У Магілёўскай губерні вясной 1916 г. з бежанцаў ствараліся гэтак званыя "рабочыя дружыны", якія накіроўваліся ў маёнткі прымусова [255, с. 84].

Бачачы катастрафічную сітуацыю, якая склалася са становішчам бежанцаў, пэўныя высілкі па паляпшэнні сітуацыі пачала прымаць дзяржава. У 1915 г. быў створаны Саюз земстваў і гарадоў, які сумесна з арганізацыямі Чырвонага Крыжа ўзяў на сябе ініцыятыву забяспечваць бежанцаў харчаваннем і медыцынскай дапамогай [255, с. 79]. Армейскім колам было загадана фінансаваць харчовыя пункты па шляхах адыходу бежанцаў. Для выканання гэтых мер была зацверджана Асобая Нарада па ўладкаванні бежанцаў пад старшынствам міністра ўнутраных спраў. Кожнай бежанскай сям'і выдавалі на рукі 30 рублёў у месяц.

Усяго да 1916 г. дзейнічала каля 1300 устаноў і таварыстваў па аказанні дапамогі бежанцам, без уліку земскіх і гарадскіх упраў. Найбольш уплывовымі з іх з'яўляліся Таццянінскі камітэт, Земгор. Аддзелы Таццянінскага камітэта



Витебский государственный технологический университет

былі створаны ў кожным губернскім горадзе, дзе знаходзіліся бежанцы. З дапамогай Земгора, акрамя харчовых пунктаў, адкрываліся санітарныя, гужавыя, дзе рамантаваліся колы, падкоўваліся коні, дзейнічалі школы-сталовыя, дзе навучаліся дзеці-бежанцы, аказвалася юрыдычная дапамога ў пошуках дзяцей і іх бацькоў, родзічаў. На Паўночна-Заходнім фронце дзейнічала больш за 40 школ-сталовых, фінансаваннем якіх займаўся Земгор [273, с. 61].

Самым бедным сем'ям, грамадзянскім жонкам і пазашлюбным дзецям сялян земствы час ад часу аказвалі дадатковую грашовую дапамогу. Сельскія таварыствы, у сваю чаргу, спрыялі сем'ям прызваных і бежанцаў не толькі калектыўнымі "дапамогамі", але і пазыкамі з хлебазапасных крамаў [355, с. 98 - 99].

Але ж дапамога ўсё роўна была недастатковая. Бежанцы масава гінулі ад холаду, голаду, эпідэмій. Натоўпы ўцекачоў у асноўным ішлі пешшу, бо не заўсёды хадзілі цягнікі, не хапала падвод і цягнікоў, білеты каштавалі вельмі дорага [273, с. 60]. Такія групы бежанцаў немцы пастаянна абстрэльвалі і бамбілі. Да таго ж, мясцовае вясковае насельніцтва, якое аддало фронту больш за палову сваіх работнікаў, часта выказвала да ўцекачоў сваё варожае стаўленне [170, с. 62]. Згодна з рознымі падлікамі, колькасны склад бежанцаў з беларускіх земляў склаў каля 1, 2 млн. чалавек [444, с. 10].

Бадай ці не самым вялікім злом, якое істотным чынам уплывала на маёмаснае становішча вясковага насельніцтва прыфрантавой паласы, былі рэквізіцыі. Яны праводзіліся амаль бесперапынна. Гэтаму садзейнічала тое, што існавала не адна, а цэлы шэраг мясцовых рэквізіцыйных камісій, да іх дзейнасці час ад часу далучаліся і асобныя франтавыя аддзяленні.

У сялян канфіскоўваўся хлеб, фураж, свойская жывёла, прадукты харчавання. Прычым, аб'ёмы і памер рэквізіцый увесь час павялічваліся, а не былі строга вызначаны заканадаўствам. Урэшце гэта прывяло да значнага павелічэння колькасці гаспадарак, якія ўвогуле не мелі ні кароў, ні коней.

Як ставіліся сяляне да падобных аперацый, можна зразумець па тым факце, што рэквізіцыйным камісіям давалася ў дапамогу "...50 чалавек узброенай каманды і 5 чалавек конных для сувязі" [100, арк. 105]. Прычым, рэквізоўваўся не толькі фураж, хлеб, жывёла і прадукты харчавання, але нават прэсавальныя апараты і падводы. Адбывалася гэта згодна з загадам ад 12 ліпеня 1917 г. за № 13: "Губернскім (абласным) ці, па іх даручэнні, павятовым і валасным харчовым органам надаецца права ладзіць рэквізіцыі прэсаў, прэсавальнага ці ўвязачнага дроту, вагаў, брэзенту ці іншага інвентару, неабходнага пры правядзенні вытворчых работ па нарыхтоўцы сена і саломы, а таксама і памяшканняў для прэсавання і захоўвання гэтых прадуктаў" [99, арк. 17 адв.].

Витебский государственный технологический университет

Па рэквізіцыі буйной рагатай жывёлы па кожным павеце складаўся падрабязны план. У табліцы 3.1 прыведзены такі план для Віцебскага павета [101, арк. 104].

Табліца 3. 1 - Маршрут правядзення рэквізіцыі буйной рагатай жывёлы па Віцебскім павеце для патрэб войска

| Назва воласці | Колькасць галоў, неабходных для рэквізіцыі | Час, прызначаны для правядзення рэквізіцыі | Пункт згону і прыёмкі рэквізаванай жывёлы |
|---|---|---|---|
| Мішкаўская | 137 | 30 лістапада – 1 снежня | г. Віцебск |
| Вярхоўская | 80 | 2 снежня | г. Віцебск |
| Шчарбінская | 112 | 3 снежня | г. Віцебск |
| Сялюцкая | 120 | 4 снежня | г. Віцебск |
| Бабініцкая і частка Курынскай | 133 | 5 і 6 снежня | г. Віцебск |
| Жарабыцкая | 142 | 7 і 8 снежня | ст. Сіроціна |
| Ляскавіцкая | 74 | 9 снежня | ст. Сіроціна |
| Старасельская | 91 | 10 снежня | ст. Сіроціна |
| Храпавіцкая | 114 | 12 снежня | ст. Лосвіда |
| Лосвідская | 82 | 13 снежня | ст. Лосвіда |
| Курынская | 209 | 14 снежня | ст. Лосвіда |
| Веляшкоўская | 232 | 16 і 17 снежня | ст. Лёзна |
| Каралеўская | 231 | 18 і 19 снежня | ст. Лёзна |
| Янавіцкая | 150 | 21 і 22 снежня | м. Янавічы |
| Вымнянская | 100 | 23 і 24 снежня | м. Янавічы |

Як бачна з вышэйпрыведзенай табліцы, менш чым за адзін месяц 1917 г. у сялян Віцебскага павета павінны былі забраць болей за 2000 галоў буйной рагатай жывёлы. Для іншых паветаў сітуацыя была аналагічнай.

Асабліва пакутавала ад пастаянных рэквізіцый насельніцтва, якое пражывала непасрэдна ў прыфрантавой паласе. Яно заставалася амаль без усялякіх сродкаў для існавання. Згодна з загадам Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту ад 8 верасня 1917 г. за № 2090 эксплуатацыйным камісіям варта было "…неадкладна прыступіць да рэквізіцыі жывёлы ў земляробчага насельніцтва ў 30-вёрстнай прыфрантавой паласе. Па заканчэнні рэквізіцыі

Витебский государственный технологический университет

жывёлы ў той жа прыфрантавой паласе правесці рэквізіцыю бульбы і гародніны, а затым у насельніцтва той жа паласы рэквізаваць хлеб і фураж" [132, арк. 20 – 20 адв.]. Начальнікі этапна-гаспадарчых аддзяленняў і корпусныя інтэнданты сваімі загадамі стваралі пастаянныя эксплуатацыйныя армейскія і дывізіённыя камісіі. Ім было даручана як мага больш поўна канфіскоўваць "мясцовыя сродкі" ў вясковых раёнах Заходняга фронту. Прычым, пад "мясцовымі сродкамі" на той момант разумелася "…ўсё, што неабходна для нашых войскаў" [132, арк. 22].

Мясцовае насельніцтва не заўжды спакойна рэагавала на такія дзеянні рэквізіцыйных камісій. Часам рэквізіцыйным камісіям нават прыходзілася выкарыстоўваць зброю. Значны памер набылі і сутыкненні сялян з мясцовымі ўладамі. Выступленні сялян супраць рэквізіцыі хлеба з хлебанарыхтоўчых крамаў па цвёрдых цэнах, а таксама жывёлы, падвод, аўса і г. д. суправаджаліся сутычкамі з земскімі службоўцамі і паліцыяй. Застрэльшчыкамі вельмі часта станавіліся жанчыны-салдаткі, якія паўставалі на ахову хлебазапасных крамаў, не падпускалі да іх прадстаўнікоў земстваў. Матывам такіх дзеянняў сялян быў не толькі пратэст супраць нізкіх нарыхтоўчых цэн і прымусовых рэквізіцый, але і шырока распаўсюджанае сярод іх перакананне, што хлеб пойдзе не на фронт, а рабочым абаронных заводаў, якія хаваюцца ад мабілізацыі, а таксама земскаму начальству, якое перапрадае хлеб прыватным скупшчыкам [355, с. 113]. Па меры зацягвання вайны супрацьстаянне сялян з мясцовымі ўладамі станавілася ўсё больш жорсткім.

Сітуацыя ў сельскай гаспадарцы для насельніцтва прыфрантавой паласы ўскладнялася яшчэ і тым, што апроч уласнага забеспячэння, яно ўвесь час мусіла пастаўляць прадукты харчаванння, фураж, падводы, жывёлу для патрэб фронту. Прыходзілася карміць і ўтрымліваць больш за двухмільённы кантынгент вайскоўцаў [255, с. 78].

З раёнаў вядзення баявых дзеянняў у тыл ішлі пастаянныя патрабаванні і заклікі аб больш якасным і хуткім забеспячэнні арміі харчаваннем. Галоўнакамандуючы арміямі Заходняга фронту генерал ад інфантэрыі Балуеў пісаў: "…імкліва насоўваецца жахлівая бядота поўнага знікнення запасаў хлеба і фуражу на давераным мне Заходнім фронце. З-за слабай пастаўкі на месцах, маруднай пагрузкі і разладжвання чыгуначнага руху арміі фронту за апошнія 2 месяцы атрымліваюць толькі чвэрць таго, што належыць. Мінулыя запасы скончацца на днях, і армію чакае голад. Звяртаюся да ўсіх рускіх людзей з палымяным заклікам: забудзьцеся на вашыя спрэчкі, узгадайце пра сваіх братоў на фронце. Няўжо за больш чым трохгадовую самаахвярную барацьбу вы дасце ім памерці ад голаду. У імя радзімы прыміце ўсе меры да ўзмацнення пастаўкі хлеба і фуражу, паскарэння пагрузкі і адпраўкі на фронт" [126, арк.17 - 17 адв.].

Витебский государственный технологический университет

Беларускія прыфрантавыя губерні Магілёўская, Віцебская, часткова Мінская ў найбольшай меры зазналі на сабе ўвесь цяжар фуражных нарыхтовак. Гэта пры тым, што корму для коней, якія знаходзіліся на палях баталій, заўжды не хапала.

У цыркуляры, які даслала міністэрства харчавання (аддзяленне нарыхтоўкі хлеба і фуражу) з Петраграда ў Віцебскі губернскі харчовы камітэт, чытаем: "Пагрузка сена для войска ўпала да 35% ад прызначанага нарада і ў гэтай норме праходзіць ужо другі месяц… Жахлівы стан, які назіраецца за ўказаны перыяд 1917 г. і асабліва ў 1915 г., калі ў выніку недахопу фуражу коням былі скормлены саламяныя дахі пабудоў і калі, нягледзячы на ўсе меры, падзеж коней дасягнуў велізарных памераў…" [99, арк. 39]. Пераважная большасць тэлеграм на імя загадчыка па нарыхтоўцы сена ў Віцебскай губерні Зейна была наступнага зместу: "Коні войска гінуць ад недаядання. Патрабую неадкладнай узмоцненай адпраўкі сена на фронт. Невыкананне патрабавання пацягне за сабою ліквідацыю фронту і гібель краіны" [100, арк. 94].

Не лепшымі былі справы з кормам жывёлы, якая знаходзілася па адваротны бок ад лініі фронту. Калі на кожнага "артылерыйскага каня, згодна з загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, належала выдаваць па 15 фунтаў сена ці яравой саломы, а на астатніх коней – па 10 фунтаў сена ці яравой саломы" [99, арк. 37], то для патрэб гаспадаркі на неакупіраванай тэрыторыі Віцебскім Губернскім Харчовым камітэтам на пасяджэнні 2 верасня 1917 г. былі ўстаноўлены наступныя гадавыя нормы запасаў сена і саломы:

"Конь старэйшы за 1 год – 180 пудоў сена і 70 пудоў азімай саломы;

конь маладзейшы за 1 год – 100 пудоў сена і 40 пудоў азімай саломы;

карова старэйшая за 1 год – 140 пудоў сена, 80 пудоў яравой саломы і 70 пудоў азімай;

цяля маладзейшае за 1 год – 80 пудоў сена, 50 пудоў яравой саломы і 50 пудоў азімай;

авечка, каза – 40 пудоў сена, 20 пудоў яравой саломы і 20 пудоў азімай саломы" [99, арк. 50 адв.].

Для коней, якія былі заняты на прэсавальных апаратах ці выконвалі нарады па перавозцы грузаў на вялікую адлегласць, аддзел нарыхтовак устанавіў наступны рацыён: " ...не болей за 30 фунтаў сена і 5 фунтаў канцэнтраванага корму на суткі" [99, арк. 51].

Вельмі негатыўна на працэс сенанарыхтовак паўплываў яшчэ і той факт, што на пачатку імі было дазволена займацца выключна "…агентам губернскага харчовага камітэта і мясцовым грамадскім органам – павятовым і валасным харчовым камітэтам" [99, арк. 5]. Асаблівага даверу да гэтых арганізацый мясцовае насельніцтва не аказвала, бо вельмі часта фураж закупляўся імі па заніжаных цэнах. Усякі ж удзел падрадчыкаў прыватных камісіянераў і іншых

Витебский государственный технологический университет

асоб быў строга забаронены [99, арк. 5]. Урадавыя органы рэзка выказваліся супраць актыўнай нарыхтоўкі сена асобнымі вайсковымі часцямі, бо яны давалі насельніцтву больш высокую плату, чым Губернскі харчовы камітэт.

Пэўныя праблемы складваліся яшчэ і з-за нерэальнасці планавых паказчыкаў, якія зусім не адпавядалі сапраўднаму стану рэчаў. Да прыкладу, прывядзём наступныя статыстычныя звесткі.

На 13 ліпеня 1917 г. у Віцебскай губерні мелася наступная колькасць нарыхтаванага і непагружанага сена:

Віцебскі павет – 10000 пудоў;

Веліжскі – 40000 пудоў;

Полацкі – 6000 пудоў;

Дрысенскі – 5000 пудоў;

Невельскі – 16000 пудоў;

Гарадоцкі – 6000 пудоў.

Меркавалася ж да канца кампаніі па гэтых паветах сабраць наступную колькасць сена:

Віцебскі павет – 200000 пудоў;

Веліжскі – 300000 пудоў;

Полацкі – 150000 пудоў;

Дрысенскі – 200000 пудоў;

Невельскі – 200000 пудоў;

Гарадоцкі – 200000 пудоў.

А ўсяго па Віцебскай губерні планавалася нарыхтаваць 2250000 пудоў сена [99, арк. 4 адв.; 5 адв.]. Як бачна, планавыя паказчыкі былі надзвычай завышаны і адарваны ад рэчаіснасці. А Вярхоўнае Галоўнакамандаванне ўводзілася ў зман легкаважнымі абяцанкамі нарыхтоўшчыкаў сена.

Прычым, ажыццяўляць некаторыя аперацыі (прэсоўка сена, яго тэхналагічная апрацоўка) якасна маглі толькі кваліфікаваныя рабочыя. Навучаны горкім вопытам, сход загадчыкаў па нарыхтоўцы сена "…катэгарычна выказаўся за неабходнасць арганізацыі пастаянных кадраў прэсоўшчыкаў. І ўзбудзіў хадайніцтва аб водпуску неабходнай колькасці ваеннапалонных або вайсковых каманд (з разліку па чатыры чалавекі на кожны ручны і конны прэс) для задавальнення гэтай патрэбы" [99, арк. 6 адв.]. Дзеля паляпшэння харчавання пастаянных прэсоўшчыкаў было прынята рашэнне аб выдачы ім салдацкага пайка са сродкаў інтэнданцтва.

Нягледзячы на меры, якія прымалі ўлады, патрэбы паветаў Віцебскай губерні ў рабочых, прыёмшчыках, арцельшчыках, конях на сярэдзіну ліпеня 1917 г. былі вялікімі. Гэта добра бачна з табліцы 3.2 [99, арк. 7, 9].

Витебский государственный технологический университет

Табліца 3. 2 - Колькасць неабходных рабочых, коней, прыёмшчыкаў, арцельшчыкаў для правядзення сенанарыхтовак

| Назва паветаў | Неабходная колькасць рабочых | Неабходная колькасць коней | Неабходная колькасць прыёмшчыкаў | Неабходная колькасць арцельшчыкаў |
|---|---|---|---|---|
| Віцебскі | 48 | 14 | 5 | 6 |
| Веліжскі | 96 | 19 | 7 | 7 |
| Гарадоцкі | 64 | 19 | 4 | 6 |
| Дрысенскі | 56 | 12 | 3 | 3 |
| Лепельскі | 60 | 24 | 4 | 5 |
| Люцынскі | 32 | 29 | 5 | 6 |
| Невельскі | 68 | 14 | 4 | 5 |
| Полацкі | 36 | - | 4 | 4 |
| Рэжыцкі | 32 | 29 | 5 | 5 |
| Себежскі | 44 | 14 | 3 | 3 |
| Усяго | 536 | 174 | 43 | 50 |

Витебский государственный технологический университет

Такая сітуацыя з недахопам спецыяльных работнікаў была характэрна для ўсіх без выключэння неакупіраваных немцамі тэрыторый беларускіх губерняў.

Існавалі і значныя праблемы з матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем нарыхтовачных пунктаў. Асабліва востра адчуваўся недахоп ручных і конных прэсаў, якія амаль цалкам належалі прыватным асобам. Таму спецыяльная нарада, праведзеная ў Міністэрстве харчу, лічыла неабходным: “…надаць загадчыкам сенанарыхтоўчых пунктаў права рэквізіцыі ўсіх ручных сенных прэсаў, якія ёсць у павеце. Бо ўладальнікі прэсаў у арэнду іх не здадуць, будзе вялікі перапынак у нарыхтоўцы сена і будзе страчаны самы зручны для прэсоўкі час” [99, арк. 9 адв.].

Яшчэ горшым было становішча з падвозкай фуражу на станцыі і прыстані перад яго далейшай адпраўкай на фронт. Як сведчыць выпіска з нарады загадчыкаў па нарыхтоўцы сена ад 12 – 13 ліпеня, “…мясцовае насельніцтва або зусім адмаўляецца ад дастаўкі сена, або патрабуе неймаверна высокіх цэн за яго продаж” [99, арк. 4 адв.]. Надзвычай цяжка было знайсці падводы ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. Валасным харчовым управам была дадзена наступная інструкцыя: “…карыстаючыся сваім аўтарытэтам, запэўніць насельніцтва і пераканаць яго ў неабходнасці пастаўкі сена для войска, прыняць усе меры для таго, каб насельніцтва даставіла закупленае і спрэсаванае сена да станцый і прыстаняў” [99, арк. 5]. Нягледзячы на меры, якія прымаліся ўрадам і

мясцовымі органамі кіравання, сітуацыя з транспарціроўкай сена істотным чынам не паляпшалася.

Часам здараліся выпадкі, калі нарыхтаванае сена доўгі тэрмін ляжала пад адкрытым небам і псавалася ад дажджоў, расцярушвалася ветрам. Бо адчувалася пільная патрэба не толькі ў складскіх памяшканнях адпаведных памераў для яго захавання, але нават і ў брызенце. Сведчаннем таму служаць наступныя статыстычныя звесткі, змешчаныя ў табліцы 3. 3 [99, арк. 8].

Табліца 3. 3 - Патрэба паветаў Віцебскай губерні ў брызентах

| Назва паветаў | Маецца брэзентаў у наяўнасці | Патрабуецца яшчэ |
|---|---|---|
| Віцебскі | 5 | 5 |
| Веліжскі | 10 | 30 |
| Гарадоцкі | 3 | 10 |
| Дрысенскі | - | 10 |
| Лепельскі | 3 | 12 |
| Невельскі | 5 | 7 |
| Полацкі | 3 | 7 |
| Рэжыцкі | - | 20 |
| Себежскі | 6 | 10 |
| Люцынскі | 3 | 20 |
| Усяго | 38 | 131 |

З табліцы бачна, што патрэбу ў забеспячэнні брызентам мелі ўсе паветы Віцебскай губерні, а ў Дрысенскім і Рэжыцкім паветах брызент увогуле адсутнічаў. Не лепшай была сітуацыя і ў іншых паветах неакупіраваных беларускіх губерняў.

Справа сенанарыхтовак для войска істотна ўскладнялася яшчэ і тым, што фураж быў шырока запатрабаваны прадпрыемствамі і грамадскімі арганізацыямі, якія працавалі на карысць фронту. Так, на льнопрадзільнай фабрыцы “Дзвіна” працавала 27 коней, на лесапільным заводзе Дзвінскага ваенна-акруговага кватэрнага ўпраўлення – 70. Нават губернская Земская лякарня мела патрэбу ў сене для 2 коней, а таксама для набіўкі сеннікаў і падушак для псіхічна хворых.

Сена і фураж, якія пастаўляліся ў грамадскія ўстановы і арганізацыі, звычайна былі значна горшай якасці, чым тыя, якія ішлі на фронт. З Лужаснянскага ніжэйшага сельскагаспадарчага вучылішча ў аддзел нарыхтовак Віцебскай губернскай управы прыйшла скарга наступнага зместу: “Сёння

Витебский государственный технологический университет

дастаўлена ад спадара Неналтоўскага 40 пудоў канюшыны 2-га гатунку, як значыцца ў квітанцыі. Не жадаючы браць на сябе нават маральную адказнасць, паведамляем, што гэта не канюшына, а гной, які ані коні, ані каровы не кранаюць. Карміць такім кормам жывёлу, ад якой чакаецца малако, немагчыма. Корм не падыходзіць нават для падтрымкі жыцця самых галодных жывёл" [101, арк. 59].

Да таго ж, даволі цяжка было мясцоваму насельніцтву трымаць пастаянны псхіхалагічны ціск на сабе з боку ўрадавых органаў, якія ўвесь час патрабавалі неадкладнага павелічэння нарыхтоўкі фуражу, даючы народу пустыя абяцанні. Да прыкладу прывядзём тэкст ліста, дасланага загадчыкам па нарыхтоўцы сена ў прыфрантавыя губерні: "Войска даядае апошнія крошкі. Пачаўся масавы мор коней. Маюцца канкрэтныя ўказанні, што, калі ў самым бліжэйшым будучым войскі не будуць забяспечаны харчам і фуражом, салдаты пакінуць фронт і натоўпы галодных, дэмаралізаваных людзей, нішчачы ўсё на сваім шляху, хлынуць углыб краіны. З-за геаграфічнага становішча насельніцтву Віцебскай губерні ў першую чаргу прыйдзецца зазнаць на сабе ўсе вусцішныя жахі нашэсця галоднага натоўпу. Калі нават вытворчыя губерні пранікнуцца ўрэшце ўсведамленнем абавязку перад войскам і павязуць харчаванне да станцый для адпраўкі на фронт, на падвоз харчу і фуражу з поўдня спатрэбіцца больш ці менш працяглы час, войска не можа чакаць ніводнага дня. Аддзелу нарыхтовак вядома, што Віцебская губерня не можа надоўга забяспечыць фронт харчаваннем і фуражом, але карміць войска на працягу аднаго – двух тыдняў, да падвозу хлеба і фуражу з поўдня, губерня ў стане. Калі мы зараз дадзім фронту перажыць гэткія цяжкія часы, фронт і Расія не забудуцца на нас і падтрымаюць у цяжкую хвіліну. Грамадзяне, памятайце, што за натоўпамі галодных салдат ідуць ворагі нашы – немцы. Вашы жонкі і сёстры знаходзяцца ў смяротнай небяспецы. Гэта не словы – гэта жахлівая голая праўда" [99, арк. 83].

Зразумела, што забяспечваць армію ўсім неабходным прыфрантавыя беларускія губерні доўгі час самастойна не маглі. У гэтым ім аказвалі дапамогу, хоць і не заўжды своечасова і ў поўнай меры, іншыя "тылавыя" губерні Расійскай імперыі. Гэта добра бачна са статыстычных звестак валасных праўленняў, прыведзеных у табліцы 3. 4 [126, арк.14 - 14 адв.].

З-за перагружанасці чыгуначных ліній тавары і харчаванне з тылавых губерняў Расіі на вялікі тэрмін затрымліваліся ў дарозе, асобныя прадукты харчавання – псаваліся, планы па перавозцы – не выконваліся.

Витебский государственный технологический университет

Табліца 3. 4 - Ведамасць пагрузкі харчу і фуражу для фронту з 29 верасня па 28 кастрычніка 1917 г.

| Вытворчая губерня | Колькасць вагонаў | Род грузу | Станцыя прызначэння |
|---|---|---|---|
| Тамбоўская | 8 | жыта | Полацк |
| Таўрыцкая | 29 | пшаніца | Полацк |
| Тамбоўская | 16 | жытняя мука | Віцебск |
| Палтаўская | 5 | пшанічная мука | Віцебск |
| Таўрыцкая | 10 | вотруб'е | Віцебск |
| Таўрыцкая | 11 | пшанічная мука | Віцебск |
| Таўрыцкая | 3 | макароны | Віцебск |
| Таўрыцкая | 6 | пшаніца | Віцебск |
| Таўрыцкая | 1 | крупы | Віцебск |
| Таўрыцкая | 1 | ячмень | Віцебск |
| Харкаўская | 5 | пшанічная мука | Віцебск |
| Харкаўская | 2 | вотруб'е | Віцебск |
| Варонежская | 2 | жмых | Віцебск |
| Тамбоўская | 1 | жытняя мука | Гарадок |
| Тамбоўская | 1 | жыта | Гарадок |
| Палтаўская | 3 | пшанічная мука | Гарадок |
| Таўрыцкая | 3 | пшаніца | Гарадок |
| Варонежская | 1 | жмых | Гарадок |
| Тамбоўская | 2 | жытняя мука | Дзвінск |
| Таўрыцкая | 1 | пшанічная мука | Дзвінск |
| Таўрыцкая | 3 | пшаніца | Дзвінск |
| Варонежская | 1 | жмых | Дзвінск |
| Палтаўская | 4 | пшанічная мука | Дзвінск |
| Таўрыцкая | 1 | пшанічная мука | Рушоны |
| Тамбоўская | 1 | жытняя мука | Дрыса |
| Таўрыцкая | 4 | пшаніца | Дрыса |
| Варонежская | 1 | жмых | Дрыса |
| Таўрыцкая | 4 | пшаніца | Рэжыца |
| Тамбоўская | 1 | жытняя мука | Рэжыца |
| Варонежская | 1 | жмых | Рэжыца |

Акрамя пастаўкі фуражу, хлеба і жывёлы непасрэдна на фронт, насельніцтва прыфрантавой паласы павінна было ўтрымліваць розныя маршавыя роты і асобныя вайсковыя часці, якія перасоўваліся бліжэй да тэатра

Витебский государственный технологический университет

ваенных дзеянняў. Што гэта несла сялянам, бачна з успамінаў жыхароў вёскі: "У верасні 1915 г. у садах Лябёдкі спыніўся 40-вы корпус рускай арміі разам з артылерыяй і абозам. Пасля яго адступлення ад расаднікаў засталося гумно, ад дрэваў – голыя шкілеты" [444, с. 200]. Салдаты паводзілі сябе такім чынам, быццам бы мелі поўнае права карыстацца маёмасцю мясцовых жыхароў. Іх не страшыла нават вышэйшая мера пакарання за марадзёрства.

Вясковаму насельніцтву прыфрантавой паласы катастрафічна не хапала прылад працы і сельскагаспадарчых машын. Цэны на гэтыя прадметы істотна выраслі ўжо ў першыя гады вайны. Асабліва востра недахоп сельскагаспадарчых машын адчуваўся ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У Ляскавіцкай, Вымнянскай, Курынскай, Сялюцкай валасцях і ў Суражскай, Старасельскай, Лосвідскай харчовых управах адсутнічалі нават склады для сельскагаспадарчага інвентару [123, арк. 8 - 10]. З агульнага шэрага вылучалася толькі Жарабыцкая валасная харчовая ўправа, дзе мелася 20 малацілак ручных, 5 малацілак з конным прывадам, 25 веялак і 2 машыны жнейкі [123, арк. 23]. Але ж і гэта належала прыватным землеўладальнікам, а не дзяржаўным сельскагаспадарчым арганізацыям. Гаспадары меркавалі за лепшае трымаць пры сабе і чакаць яшчэ большага росту цэн, чым аддаваць дзяржаве веялкі, сарціроўкі, малацільныя гарнітуры, нават калі не мелі ў іх надзённай патрэбы.

Урад рэгуляваў рынак металаў у перыяд вайны і амаль скасаваў прыватны гандаль сельскагаспадарчымі машынамі. Гэта прывяло да таго, што сталі закупляць больш лёгкі інвентар (адпаведна, ён хутка выходзіў са строю), у якім найбольшае прымяненне знаходзілі драўляныя часткі.

Па заказах Аддзела Забеспячэння можна меркаваць, якімі сельскагаспадарчымі машынамі і інвентаром карысталіся на вёсцы ў перыяд Першай сусветнай вайны. Гэта былі адналямешныя плугі (беспeрадковыя; беспeрадковыя з паўвінтавым валам; рамныя плугі на 2-х колах; перадковыя плугі маркі "АБЖІ"; плугі тыпу Сакка); шматлямешныя плугі (двухлямешны на 2-х колах без пад'ёму; двухлямешны з рычажным пад'ёмам; чатырохлямешны букер з сеялкай і рычажным пад'ёмам); бароны (драўляныя з жалезнымі зубамі; жалезныя тыпу "Зіг-Заг"); культыватары (пяцілапчатыя; тыпу "Планет" рассоўваемыя; акучнікі з драўляным градзілем; пружынныя і дыскавыя бароны); сеялкі раскідвальныя 8 і 10 футаў; уборачныя машыны (сенакасілкі; конныя граблі; самаскідкі; снопавязалкі); малацілкі і прывады (двухконныя; чатырохконныя; ручнаконныя); веялкі (рыжскія; Аўля; Клейтан № 5; саратаўскія; уфімскія); саламарэзкі (ручныя дыскавыя; ручныя барабанныя; конныя барабанныя) [123, арк. 28–29].

На аснове ведамасцей павятовых земстваў можна скласці прыкладнае ўяўленне і пра колькасць сельскагаспадарчага інвентару, які прыходзіўся на адну такую ўстанову: бароны пружынныя – 7, бароны розныя – 7, граблі

Витебский государственный технологический университет

конныя – 37, граблі розныя – 22, жаткі – 85, жатвенныя апараты – 2, косы – 564, ільномялка – 1, ільномалацілка – 1, ільнотрапалка – 1, ільночысцілка – 1, маслаапрацоўнікі – 3, сепаратары – 25, акучнік – 1, плуг Разеўскага – 2, плуг Сакка – 3, плуг Берліна – 99, плуг Сухені – 6, прывады – 3, палольнікі – 5, сярпы – 96, веялкі – 4, трыеры – 1, тукадрабілкі – 1, бульбадавілкі – 2, саламатрасы – 2 [123, арк. 64].

Карысталася мясцовае насельніцтва і імпартнымі сельскагаспадарчымі прыладамі працы і інвентаром. Толькі восенню 1917 г. каля "…50000 амерыканскіх машын было перавезена праз акіян. Але яны не здолелі прыняць удзел у сезонных работах з-за таго, што спазніліся з іх дастаўкай на месцы" [123, арк. 28 адв.].

Каб забяспечваць армію прадуктамі харчавання і фуражом, патрабавалася дасканалае вядзенне рознага кшталту справаздачнай дакументацыі. Але з гэтым існавалі пэўныя праблемы. Не хапала фінансавых сродкаў нават на выплату заробку для канцылярскіх службоўцаў харчовых упраў: "…служачыя Суражскай харчовай управы трэці месяц не атрымліваюць ніякай аплаты" [124, арк. 1]. Са Старасельскай валасной харчовай управы ў верасні 1917 г. пісалі ў Віцебск: "Вам не адаслалі спісы тых, хто валодае жывёлай з-за таго, што ў нас ніхто не жадае працаваць бясплатна. Справаводца А. Жыро прапрацавала 2 месяцы і атрымала 100 рублёў, больш працаваць не стала. Затым нанялі іншага Я. Сініцына, і ён папрацаваў штосьці каля 3-х тыдняў, і, бачачы, што ніхто амаль нічога не атрымлівае, адмовіўся. Цяпер больш ніхто не жадае наймацца, бо нічога не атрымлівае. А таксама члены ўправы не жадаюць выконваць свае службовыя абавязкі з-за неатрымання акладу. А таму просім Віцебскую павятовую харчовую ўправу паклапаціцца зараз жа даслаць Старасельскай харчовай управе грошай для ўплаты "жалавання" службоўцам і для найму справавода" [125, арк. 21–21 адв.].

Усё гэта вяло да шматлікіх збояў і непаразуменняў у вядзенні дакументацыі, што прыводзіла да значна больш цяжкіх наступстваў. Так, па спецыяльным журнале на 7 жніўня 1915 г. меркавалася прыняць на выпас у Любаніцкае лясніцтва Мінскай губерні 1000 галоў жывёлы, а ў Гарадзецкае – 500. А атрымалася так, што ў першым апынулася 7193 галавы, а ў другім толькі – 260 [287, арк. 81–81 адв.]. Лясныя рэвізоры неадкладна паведамлялі пра такія выпадкі ўпаўнаважанаму па размяшчэнні дзяржаўнай жывёлы.

У той жа час у прыватных жывёлагадоўчых гаспадарках з дакументацыяй быў поўны парадак. Напрыклад, у гаспадарцы "Расток", якая размяшчалася ля Гомеля і належала прадпрымальніку Сушкевічу, былі дакладна прапісаны ў журналах імёны і мянушкі кароў па алфавіце. Вясной і восенню вымяраліся іх даўжыня, абхват, жывая вага ў фунтах і пудах. Маладняку пры нараджэнні запісвалі мянушку, пол, масць, пароду, вагу; запісваліся 1-ая, 2-ая і 3-ая злучкі,

Витебский государственный технологический университет

лактацыйны і сухастойны перыяд у днях [316, арк.1 адв. - 4]. У журналах пазначалася, колькі жывёл прададзена, зарэзана ці пала, колькі атрымана малака і масла, і г. д.

Жахлівымі тэмпамі адбывалася скарачэнне пасяўных плошчаў і пагалоўя свойскай жывёлы на неакупіраванай тэрыторыі. Прычым, звесткі айчынных даследчыкаў аб дынаміцы пасяўных плошчаў падчас вайны вельмі адрозніваюцца ад звестак іх расійскіх калег. І гэта не дзіўна, бо агульнае скарачэнне пасяўных плошчаў у Еўрапейскай Расіі без уліку акупіраваных тэрыторый у 1915-1917 гг. было нязначным (да 1917 г. – 6,7 %). Перш за ўсё яно было звязана з істотным (каля 50 %) змяншэннем пасеваў на прыватнаўласніцкіх землях, у раёнах гандлёвага земляробства. Разам з тым яно суправаджалася ростам плошчаў сялянскіх пасеваў на 20-30 % у раёнах найбольшай аграрнай перанаселенасці. Узровень валавой вытворчасці хлеба ў 1914 – 1915 гг. амаль не змяніўся ў параўнанні з даваенным. На яго захаванне паўплывалі як інтэнсіфікацыя сялянскай працы, так і спрыяльныя прыродныя ўмовы [355, с. 98].

На неакупіраванай жа тэрыторыі Беларусі сітуацыя была зусім іншай. За 1914 – 1917 гг. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях агульныя пасяўныя плошчы скараціліся з 2,2 да 1,9 млн. дзесяцін, або на 15,6 %, у тым ліку пасевы бульбы – з 317,8 да 198,4 тыс. дзесяцін (37,6 %), пшаніцы – з 35, 2 да 27 тыс. дзесяцін (23,3 %), жыта – з 1,1 млн. да 916 тыс. дзесяцін (20,6 %) [81, с. 424].

Пагалоўе жывёлы за 1914 – 1916 гг. зменшылася на 671,1 тысячы галоў, або на 11,4 %. Асабліва значна скарацілася пагалоўе кароў – на 33,9 %. Ужо ў 1915 г. перавозкі хлеба па краіне склалі толькі 2/3 даваеннага аб'ёму. За першае паўгоддзе 1916 г. з запланаваных да перавозак 175000 вагонаў харчовых грузаў было перавезена толькі 84000 вагонаў, а далей перавозкі харчу складалі толькі 25 % ад плана [386, с. 5]. Мінская губерня мела дэфіцыт харчовага зерня ў межах 37 %, Магілёўская – 38 %, а Віцебская – 44 %. Гэтыя губерні маглі забяспечыць сябе харчовым зернем не больш чым 6 - 8 месяцаў на год [328, с. 483].

Змяншэнне пасяўных плошчаў, рэквізіцыі жывёлы для арміі, разрыў эканамічных сувязей паміж суб'ектамі гаспадарання, павелічэнне натуральных павіннасцей сялян, амаль поўнае спыненне ўвозу ежы ў прыфрантавыя раёны выклікалі шалёны рост цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю. Гэтая сітуацыя прывяла да дэзарганізацыі рынку і абумовіла радыкальныя меры ўрада па ўзмацненні дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў гаспадарчае жыццё. Так, 17 лютага 1915 г. быў выдадзены загад, які надзяляў мясцовыя ўлады правам забараняць вываз сельскагаспадарчай прадукцыі за межы сваёй губерні, устанаўліваў межавыя цэны на хлеб і фураж, якія набываліся для войска, рэквізоўваць

Витебский государственный технологический университет

прадукты па паніжаных на 15 % цэнах. Гэта паставіла сялян у невыгоднае становішча, бо цэны на нясельскагаспадарчую прадукцыю працягвалі расці хуткімі тэмпамі [355, с. 99]. Камандуючыя ваеннымі акругамі атрымалі паўнамоцтвы, якія дазвалялі ім рэалізоўваць асобныя прадукты па заніжаных цэнах, нават калі ўладальнікі прадуктаў адмаўляліся іх прадаваць [302, с. 485].

Значна скараціліся і аб'ёмы ўвозу сельскагаспадарчай прадукцыі на неакупіраваную тэрыторыю Беларусі. У Мінскую губерню перад вайной штомесяц увозілася каля 4500 вагонаў харчовых грузаў, а ў чэрвені 1916 г. было завезена толькі 784 вагоны, у ліпені – 773, у лістападзе – 196, у студзені і лютым 1917 г. – 106 вагонаў. Віцебская губерня за перыяд з кастрычніка 1916 г. і па сакавік 1917 г. атрымала жыта, жытняй мукі і крупаў толькі 6 % ад меркаванага плана, пшанічнай мукі – 20 %, хаця план завозу да гэтага часу быў зніжаны нават у параўнанні з веснавымі месяцамі 1916 г. у 10 разоў. Да сакавіка 1917 г. у Магілёўскай губерні цэны на жыта павялічыліся ў параўнанні з чэрвенем 1914 г. на 507 %, на жытнюю муку на – 524 %, на мяса – на 527 %, на масла – на 750 % [386, с. 5].

Да таго ж у сваім цывільным жыцці насельніцтва беларускіх неакупіраваных губерняў вымушана было прытрымлівацца пастановы Часовага Урада ад 25 сакавіка 1917 г., паводле якой былі забаронены прыватныя пагадненні па гандлі хлебам і іншыя хлебныя аперацыі. Пачынаючы з дня апублікавання гэтай пастановы, усе збожжавыя запасы прыватных прадпрымальнікаў, пераводзіліся пад апеку губернскага харчовага камітэта. Гандляры збожжам абавязаны былі неадкладна паведаміць губернскай харчовай управе пра месцазнаходжанне і колькасць іх запасаў. Калі ж знаходзілі "…незадэкларараваныя" рэшткі збожжа, то іх канфіскоўвалі па палавінным кошце ад цвёрдай цаны. За невыкананне дадзеных загадаў вінаватыя падвяргаліся адказнасці па артыкуле 29 (…зняволенне ў турме тэрмінам да 1 года і 6 месяцаў) [98, арк. 1 – 1 адв.].

Не маглі быць задаволены палітыкай урада ў сельскагаспадарчай галіне і буйныя землеўладальнікі нямецкага і аўстрыйскага паходжання. Царскі ўрад актыўна праводзіў канфіскацыю іх зямельных уладанняў. 2 лютага 1915 г. была прынята пастанова аб канфіскацыі нерухомай маёмасці германскіх, аўстрыйскіх і венгерскіх падданых. На аснове гэтай пастановы толькі ў Мінскай губерні ў красавіку 1915 г. планавалася канфіскаваць 49 зямельных уладанняў агульнай плошчаю каля 22 тысяч дзесяцін. Найбольшая плошча канфіскаванай зямлі прыходзілася на Мазырскі і Пінскі паветы [255, с. 82]. 13 снежня 1915 г. царскі ўрад выдаў новую пастанову аб канфіскацыі зямельнай уласнасці сялян, паноў і каланістаў – падданых краін аўстра-германскага блока. У выніку гэтай пастановы ў Мінскай губерні было канфіскавана 547 уладанняў, агульнай плошчай больш за 25701 дзесяцін [255, с. 83].

Витебский государственный технологический университет

## 3. 2 Гарадское насельніцтва і стан прамысловасці

Перыяд з 1908 г. па 1914 г. часам называюць “залатым векам капіталізму” ў Расіі. За гэтыя 5 гадоў аб’ёмы прамысловай вытворчасці выраслі на 54%, а агульная колькасць рабочых – на 31 % [53, с. 59]. У Беларусі прамысловы ўздым характарызаваўся яшчэ больш высокімі тэмпамі, чым у Расійскай імперыі. Ішоў працэс канцэнтрацыі вытворчасці, будаваліся новыя прадпрыемствы. Банкаўскі капітал (у тым ліку замежны) паступова зліваўся з прамысловым. Вядучымі накірункамі спецыялізацыі прамысловасці на той час былі перапрацоўка драўніны, мінеральнай сыравіны і сельскагаспадарчай прадукцыі. Прамысловы ўздым на нашых землях працягваўся да самага пачатку вайны.

Першая сусветная вайна істотным чынам паўплывала на жыццё гарадскога насельніцтва і стан прамысловасці. Шмат якія прадпрыемствы былі эвакуіраваны ўглыб Расійскай імперыі, некаторыя аб’екты з-за непасрэднай блізкасці да лініі фронту былі проста зліквідаваны. Значна змяніўся асартымент выробленых прадуктаў на большасці фабрык і заводаў з-за таго, што вытворчасць на іх была цалкам пераведзена на ваенныя рэйкі. Умовы існавання гараджан на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі год ад года пагаршаліся. Да самага заканчэння вайны востра стаяла пытанне аб размяшчэнні людзей, аб іх харчаванні, забеспячэнні палівам і неабходнай медыцынскай дапамогай. Гэта штурхала гараджан на розныя пратэстныя акцыі. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ва ўмовах блізкасці фронту жыццё тагачаснага гарадскога насельніцтва патрабавала ад яго пастаянных высілкаў і нястомнай працы.

Колькасць гарадскога насельніцтва на 1913 г. складала 983,3 тысячы чалавек (у межах сучаснай краіны). Для тэрыторыі ўсіх пяці беларускіх губерняў гэта лічба складала прыкладна 1 295 000 чалавек [216, с. 37]. На 1 студзеня 1914 г. у Віцебскай губерні было 12 гарадоў, у якіх пражывала 326,2 тыс. чалавек; у Мінскай – 11 гарадоў і 297,2 тыс. чалавек, у Магілёўскай – 13 гарадоў і 264,9 тыс. чалавек [371, с. 11 - 19]. Амаль усе павятовыя цэнтры названых 3-х губерняў стаялі прыблізна на адным узроўні па сваім развіцці, колькасці і шчыльнасці насельніцтва. З агульнага шэрага вылучаўся хіба толькі Гомельскі павет, які быў самы буйны па тэрыторыі і колькасці насельніцтва [159, арк. 33].

Варта зазначыць, што колькасць гарадскога насельніцтва не была пастаяннай на працягу ваенных гадоў. Дынаміка яе была даволі істотнай. Калі 1 студзеня 1914 г. у гарадах Магілёўскай губерні пражывала 264,9 тыс. чалавек, то па гарадскім перапісе 1917 г.: у гарадах жыло 199146 чалавек; а ў мястэчках, станцыях, раз’ездах, на заводах і фабрыках – 122738 чалавек [149, арк. 144].



Витебский государственный технологический университет

Калі ў Мінску на 1914 г. пражывала 100 тысяч чалавек, то ў 1915 г. – 250 [511, с. 178].

Значна падарвала айчынную прамысловасць тактыка “выпаленай зямлі”, якая актыўна выкарыстоўвалася расійскімі ўладамі. Ваенныя перад адступленнем ліквідоўвалі найбольш важныя гарадскія аб’екты, якімі мог пакарыстацца вораг. Так, за некалькі дзён да пакідання горада быў падпалены буйны спіртзавод у Баранавічах, а ў апошні дзень адступлення расійскіх войск салдаты пачалі ўзрываць чыгуначнае палатно, вакзалы, некаторыя майстэрні ваеннага прызначэння [76, с. 193]. Часам працэсы ліквідацыі выходзілі за межы здаровага сэнсу.

Асаблівым галаўным болем для ваенных і цывільных улад была эвакуацыя прадпрыемстваў з тых мясцовасцей, што знаходзіліся пад пагрозай хуткага нашэсця непрыяцеля. Яна праводзілася ў адпаведнасці з прынятай 2 кастрычніка 1915 г. “Пастановай аб камісіях па эвакуацыі” [517, с. 3].

Эвакуацыі ў першую чаргу належалі а) прамысловыя прадпрыемствы; б) гандлёвыя прадпрыемствы, якія мелі даволі істотныя запасы тавараў; в) установы і маёмасць, якія мелі важнае дзяржаўнае значэнне ці неабходныя для абароны краіны.

Эвакуацыя з раёна, які апынуўся пад пагрозай захопу, афіцыйна пачыналася з моманту выдання ваеннымі ўладамі загаду аб эвакуацыі. Затым, згодна з пастановамі мясцовых ваенна-прамысловых камітэтаў, ствараліся падрыхтоўчыя камісіі, якія павінны былі скласці падрабязны план эвакуацыі. Зразумела, што часу на гэта не заўжды хапала, і ў большасці выпадкаў такія планы складаліся непасрэдна эвакуацыйнымі камісіямі. Камісіі ствараліся пад верхавенствам асоб, якія прызначаліся старшынёй асобай нарады па абароне дзяржавы, і павінны былі быць узгоднены са штабам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Па адным прадстаўніку ў гэтыя камісіі маглі накіроўваць Цэнтральны ваенна-прамысловы камітэт (ЦВПК), Усерасійскія земскія і гарадскія саюзы, а таксама Цэнтральны камітэт ваенна-тэхнічнай дапамогі (ЦКВТД).

Пры выпрацоўцы плана эвакуацыі вызначаўся парадак перамяшчэння прадпрыемстваў, колькасць неабходных вагонаў і іншых перавозачных сродкаў, памер грашовай дапамогі рабочым і службоўцам, месца прызначэння кожнага аб’екта.

Даволі часта эвакуацыйныя камісіі накладалі значныя спагнанні і грашовыя штрафы на тыя прадпрыемствы, якія або не жадалі праводзіць эвакуацыйныя мерапрыемствы, або рабілі іх вельмі марудна.

Пра ўсе выпадкі адмовы ад выканання рашэнняў эвакуацыйных камісій іх старшыні неадкладна паведамлялі па тэлеграфе старшыні асобай нарады па

Витебский государственный технологический университет

абароне дзяржавы [517, с. 5]. Як правіла, меры ў адказ не прымушалі сябе чакаць.

У 1915 г. у сувязі з імклівым наступам нямецкіх войскаў былі вывезены ўглыб Расійскай імперыі 432 фабрычна-завадскія прадпрыемствы, асобныя фабрыкі і заводы былі дэманціраваны. Вельмі часта эвакуацыя праводзілася неарганізавана, з вялікімі стратамі абсталявання і гатовай прадукцыі. У той жа час у Беларусь эвакуіравалі заводы і фабрыкі з Польшчы і Прыбалтыкі. Так, з Варшаўскай губерні ў Мінск былі вывезены аўтамабільныя майстэрні і школа вадзіцеляў, у Нова-Барысаў – завод металічных вырабаў і алоўкавая фабрыка, у Магілёў – дзве фуфаечныя фабрыкі і гарбарны завод, у Гомель – чыгуначныя майстэрні і інш. [94, с. 187].

Прамысловыя прадпрыемствы перад пачаткам Першай сусветнай вайны на беларускіх землях размяшчаліся не зусім раўнамерна. У адной Мінскай губерні фабрык і заводаў было болей, чым у Віцебскай і Магілёўскай, разам узятых. У 1914 г. у Віцебскай губерні было 115 прадпрыемстваў, у Мінскай – 292, у Магілёўскай – 118 [166, с. 80 - 81]. Прыблізна такая ж сітуацыя назіралася і з колькасным складам рамесных майстроў: калі ў Віцебскай губерні іх было 21879 чалавек, то ў Мінскай – 57204 [166, с. 126]. Асобныя іх катэгорыі (фартэпіяншчыкі, іканапісцы, фатографы, рэзчыкі пячатак і інш.) з-за сваёй нізкай запатрабаванасці вымушаны былі шукаць сабе іншую магчымасць для атрымання заробку.

Умовы ваеннага часу наклалі значны адбітак на развіццё прамысловасці на беларускіх землях. У першыя месяцы вайны каля 20 % усіх беларускіх прадпрыемстваў спынілі сваю працу [79, с. 440 - 441]. У канцы 1914 г. у Беларусі былі закрыты 208 прадпрыемстваў [94, с. 187]. Амаль цалкам спынілі сваю працу вінакурна-гарэлачныя прадпрыемствы. У першую чаргу гэтаму паспрыяла прыняцце “сухога закону”.

У цяжкім становішчы апынуліся цагельныя і кафельныя заводы [322, с. 293]. Скарацілася вытворчасць кафлі, дахоўкі, цэглы. Амаль не паступалі заказы на прадпрыемствы, што адносіліся да шкларобнай галіны ці былі з ёю шчыльна звязаны. Да прыкладу, у Мінску з канца ліпеня 1914 г. прамысловыя прадпрыемствы сталі закрывацца адно за другім, шмат якія з іх вымушаны былі значна скараціць аб’ёмы вытворчасці. Да 25 ліпеня цалкам спынілі вытворчасць дрожджава-вінакурны завод Ракаўшчык, грабёначная фабрыка, чатыры шпалерныя фабрыкі і інш. На працягу кастрычніка-лістапада спыніліся амаль усе гарбарныя і піваваранныя заводы [207, с. 199].

Большая частка заводаў і фабрык у тэрміновым рэжыме была пераведзена на ваенныя рэйкі. Велізарная колькасць невайсковых прамысловых прадпрыемстваў была мабілізавана для абслугоўвання патрэб вайны [284, с. 106]. Ваенныя заказы выконвалі тэкстыльныя, швейныя, абутковыя,

Витебский государственный технологический университет

хлебапякарна-сухарныя, лесапільныя, ільнопрадзільныя, тытунёвыя, харчовыя прадпрыемствы. Усе мясцовыя металаапрацоўчыя заводы былі пераведзены на вытворчасць узбраення і боепрыпасаў. Да выпуску вайсковай прадукцыі былі таксама прыцягнуты рамесныя майстэрні і невялікія прадпрыемствы [490, с. 28].

Забеспячэнне армій бялізнай, вопраткай, абуткам, перавязачнымі і лекавымі сродкамі і інш. – усё гэта патрабавала ўзмоцненай і ўзгодненай работы адпаведных галін прамысловасці [284, с. 105]. Віцебская льнопрадзільная фабрыка “Дзвіна”, абутковыя фабрыкі “Скараход”, “Арол” і інш. выконвалі ваенныя заказы. У Беларусі сталі вырабляць кампрэсары, марлю, бінты, процівагазы і іншае ваеннае абсталяванне і амуніцыю. Лесаапрацоўчыя заводы Барысава, Бабруйска, Мазыра пастаўлялі для ваеннага ведамства дошкі, бярвенне, фанеру [94, с. 187]. У канцы першага года вайны заказы ваеннага ведамства выконвалі 217 прадпрыемстваў Беларусі. 2/3 рабочых цэнзавай прамысловасці былі заняты выпускам абароннай прадукцыі [79, с. 440 - 441].

Ваенныя заказы і пашыраны попыт на прадукцыю асобных галін прамысловасці паставілі пэўныя прадпрыемствы ў вельмі выгоднае становішча. Ажывілася вытворчасць на суконных фабрыках, якія выпускалі коўдры, неабходныя для лазарэтаў і лякарняў [322, с. 292]. Прыбытак Віцебскай махорачнай фабрыкі вырас утрая з-за ўзмоцненага попыту на гэты від сыравіны сярод салдат і афіцэрскага корпуса. Асаблівыя выгоды мелі і запалкавыя прадпрыемствы [298, арк. 8]. Гарбарная вытворчасць, дзякуючы ўзмоцненаму попыту на сваю прадукцыю з боку ваеннага ведамства і выгодным цэнам, атрымала ажыўленне, хаця на заводах адчуваўся недахоп неабходных ім дубільных экстрактаў, якія атрымлівалі раней з Гамбурга [322, с. 291].

Тым не менш, ваенны час уносіў свае карэктывы нават у працу прадпрыемстваў тых галін прамысловасці, што выконвалі ваенныя заказы. З пратакола пасяджэння Магілёўскага раённага камітэта па гарбарных справах ад 17 верасня 1917 г. бачна, як праходзіла рэвізія дзейнасці Быхаўскага гарбарнага аддзялення. Камісіяй была выяўлена поўная безадказнасць як матэрыяльная, так і грашовая: дакладных звестак аб наяўнасці скур не было; загадчык зборам скур у павеце А. Камароўскі зусім не валодаў інфармацыяй і не мог даць ніякіх звестак. Пры здачы сырых скур заводчыкам на выпрацоўку апошнія падпісвалі незапоўненыя бланкі дамоўленасцей, якія так і засталіся незапоўненымі. Тэрмін вырабу скур быў вельмі доўгі – да 10 месяцаў. Існуючая ў горадзе Быхаве шавецкая майстэрня грамадскай прыёмнай камісіі па пашыву ботаў для арміі знаходзілася ў жахлівым стане. Заробкі шаўцоў не перавышалі 6 рублёў на месяц. Па факце рэвізіі дзейнасці Быхаўскага гарбарнага аддзялення былі прыняты наступныя рашэнні: Быхаўскае павятовае аддзяленне было скасавана,

Витебский государственный технологический университет

праведзены разлік з А. Камароўскім, шавецкая майстэрня закрыта [150, арк. 20 – 20 адв.].

Размеркаванне абутку сярод гарадскога насельніцтва заўжды выклікала пэўныя эксцэсы і непаразуменні. З-за загружанасці гарбарнай галіны пастаўкамі ў армію гараджане вельмі часта ўвогуле заставаліся без абутку. Каб нейкім чынам унармаваць гэту сітуацыю, было прынята рашэнне выдаваць абутак і іншыя тавары са скуры толькі праз харчовыя ўправы [150, арк. 26 адв.]. А згодна з абавязковай пастановай Міністра гандлю і прамысловасці ад 20 сакавіка 1917 г., былі ўстаноўлены наступныя максімальныя цэны на рознічны продаж абутку механічнай і ручной вытворчасці: "…боты з лакіраванай скуры і казловай шагрэні для мужчын – 47 р. 50 капеек; рантавыя боты з выраставай скуры – 32 р. 50 к.; боты з конскай скуры – 16 р. 25 к.; жаночыя чаравікі на скураной падэшве на шнурках – 25 р. 50 к.; жаночыя паўчаравікі з парусіны ці брызенту на гумавай падэшве – 10 р.; дзіцячыя паўчаравікі з прунэлі – 6 р. 75 к." [135, арк. 1].

Улады ўвесь час настойвалі на "…самай строгай эканоміі ў расходаванні скуранога матэрыялу і ва ўстанаўленні неаслабнага і пільнага нагляду за правільным спажываннем гэтага тавару [150, арк. 13]. Магілёўскі раённы камітэт па гарбарных справах на працягу 1917 г. прасіў Галоўны камітэт аб выдачы як мага большай колькасці некандыцыйнага гарбарнага тавару, а таксама і сыравіны. Лічылася, што гэта дапаможа пазбегнуць эксцэсаў на глебе забеспячэння насельніцтва абуткам.

Але ж усе меры, якія прымалі ўлады, былі недастатковымі. Так, у пратаколе пасяджэння мясцовага камітэта станцыі Рудня ад 3 верасня 1917 г. зазначалася: "…служачыя не маюць магчымасці набываць абутак у прыватных гандляроў, плоцячы ім за дзіцячы абутак 60-70 рублёў, за дамскі – 95-105 рублёў і мужчынскі – 120-160 рублёў, і зусім побач той дзень, калі з-за адсутнасці абутку служачыя не будуць у стане з'явіцца на службу для выканання сваіх абавязкаў" [118, арк. 485 адв.].

Асобныя галіны прамысловасці значна пацярпелі з-за забароны на вываз за мяжу пэўных катэгорый тавараў. Згодна з цыркулярным прадпісаннем Міністэрства ўнутраных спраў (аддзяленне галоўнага ўпраўлення пошты і тэлеграфа) ад 3 жніўня 1915 г. за № 32942 толькі ў дадатковы спіс прадметаў, што былі забаронены да вывазу з Расійскай імперыі за мяжу, былі ўведзены: баваўняна-папяровыя тканіны; рыба, луска і клей з рыбы; цялячыя страўнікі; паліравальныя і шліфавальныя рэчывы; спіртавыя напоі; какава і шакалад; тканіны, прапітаныя гумай; карбід кальцыю; цэлюлоза і драўнінная маса; раслінны воск; торф і торфабрыкеты; цыянамід; алмазы; дэзынфіцыруючыя рэчывы; садавіна ўсіх відаў і нарыхтоўкі з яе; ферасіцылій; газы згушчаныя, зжыжаныя і адмысловыя сасуды для іх; газы і вадкасці ўдушлівыя, а таксама

Витебский государственный технологический университет

прадукты, якія служаць для іх вырабу: бром, хлор, хлорвокіс вугляроду, хлорацэтон, хлорысты мыш’як; розныя тлушчы абмыленыя (мыла) і неабмыленыя; плады маслянічныя; аптычныя прыборы і іх часткі; аптычнае шкло; машыны і інструменты; электрычныя прыборы і іх асобныя часткі; мінеральныя і зямельныя фарбы, у тым ліку сурык жалезны; металоіды; солі і кіслоты ад металаў хрому, марганцу, малібдэну, тытану, вальфраму, ванадыю, медзі, волава, ртуці, нікелю, свінцу і цынку; мінеральныя фасфаты і злучэнні фосфару; солі калію; камедзь; камедзістыя смолы і смала-вар; шоўк натуральны і штучны ў вырабах; руда серы; маса, якая атрымалася пры ачыстцы газу; маторы, лакамабілі і трактары розных сістэм; экіпажы і іх асобныя часткі; усякія шаўковыя рэшткі, у прыватнасці, фрызон, сарнак, абмоткі басінету, худыя і бракаваныя коканы, чхара; бурэтная шаўковая пража, пража бур-дэ-суа ці шапа; шаўковая вата часаная і нечасаная; шаўковае сырцовае рыззё; цукеркі, манпансье і іншыя прадукты перапрацоўкі цукру [189, арк. 17].

Апроч гэтага, існаваў і асобны спіс прадметаў, якія дапускаліся да вывазу непасрэдна ў саюзніцкія краіны: кукуруза, макуха сурэная, вотрубы і выжымкі; свініна-бекон; кішкі; тытунь вышэйшага гатунку (па сведчанні аб такой яго якасці з боку акцызнага нагляду); лясныя матэрыялы; насенне маслянічнае; футры (апроч авечых, барановых і казіных); смала; пянька і пяньковая кудзеля; вінны спірт, спіртавыя напоі; сантанін; волас; шпанскія мушкі; спарыння; фрукты ўсялякіх гатункаў і нарыхтоўкі з іх; вярблюджая грыва (загадвалася сачыць, каб пад выглядам вярблюджай грывы не вывозілася вярблюджая поўсць, якая выкарыстоўвалася для вырабу пражы) [189, арк. 18].

Першая сусветная вайна ўнесла значныя карэктывы ў гандаль і абмен таварамі паміж рознымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Так, у Віцебскай губерні з-за закрыцця Рыжскага порта назіраўся поўны застой у лясной прамысловасці. Амаль цалкам спынілася вытворчасць шчаціны, пуху і пер’я, знізіўся аб’ём гандлю лёнам [322, с. 291]. Апроч праблем з вывазам прадукцыі, існавалі і значныя цяжкасці з яе ўвозам. Ад гэтага цярпелі нязручнасць нават тыя прадпрыемствы, што працавалі на абарону. Так, 18 верасня 1915 г. механічная такарная ўстанова І. П. Курачкіна пісала ананімнаму таварыству льнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна”: “…маю гонар давесці да вашага ведама, што чыгунка катушкі ў Віцебск не прымае нават і багажом… партыя катушак – накладная за № 68 – да гэтага часу ляжыць у Шылаве” [312, арк. 1]. 2 лістапада 1915 г. бельгійскае ананімнае таварыства рускай фабрыкі рамянёў “Лёша”, якое спецыялізавалася на вырабе employee рознага кшталту прывадных рамянёў, пісала ананімнаму таварыству льнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна” “…чыгункі зараз не прымаюць грузаў на станцыю “Віцебск”, а таму просім паведаміць, як адправіць груз” [311, арк. 3]. Як бачна, нават статус прадпрыемства ці важнасць і тэрміновасць заказаў не спрыялі якім-небудзь паслабленням у ваенны час.



Витебский государственный технологический университет

Значна цяжэй, чым дзяржаўным, прыходзілася прыватным установам. Даходзіла да таго, што праводзіліся ў прыватных прамысловых прадпрыемствах масавыя рэквізіцыі станкоў, механізмаў, прадметаў завадскога абсталявання, матэрыялаў і паўфабрыкатаў для казённых заводаў [517, с. 30]. З абвяшчэннем прызыву і датэрміновых набораў многія вытворцы пазбавіліся работнікаў, а некаторыя, скараціўшы з-за ўмоў ваеннага часу сваю вытворчасць, або цалкам спыніўшы яе, увогуле разлічылі сваіх работнікаў [322, с. 173].

Даволі новай з'явай для прамысловасці Беларусі былі і спецыялізаваныя ваенныя перасоўныя прадпрыемствы. Месцазнаходжанне іх было даволі мабільным і карэкціравалася ў залежнасці ад лініі фронту. Напрыклад, у Полацку ў канцы 1914 г. дыслацыравалася авіяцыйна-аўтамабільная майстэрня, у якой праводзіўся капітальны рамонт рухавікоў. Збройныя майстэрні дзейнічалі ў Бабруйску і Навабеліцы [94, с. 187].

Тым не менш, ужо ў 1916 г. колькасць прадпрыемстваў на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі істотна скарацілася. У Віцебскай губерні іх засталося ўсяго толькі 61, у Мінскай – 134, у Магілёўскай – 99 [166, с. 85]. Адначасова са скарачэннем колькасці прамысловых прадпрыемстваў назіралася і значнае скарачэнне колькасці рабочых. Калі ў 1914 г. у Віцебскай губерні іх налічвалася 9118, то ў 1916 г. – 4171, у Мінскай губерні адпаведна 14609 і 7283 [166, с. 82 - 85].

Масавая мабілізацыя мужчын у армію выклікала шмат у якіх выпадках істотнае скарачэнне вытворчасці, замену вопытных рабочых новымі нявопытнымі, а таксама прыцягненне і павелічэнне жаночай і дзіцячай працы. Усё гэта негатыўным чынам уплывала на аб'ёмы вытворчасці і эфектыўнасць працы [322, с. 216 - 217]. На абаронныя і прамысловыя прадпрыемствы быў прыцягнуты вялікі кантынгент жанчын, падлеткаў, старых, інвалідаў. А яны былі недастаткова падрыхтаваныя да цяжкай і напружанай працы [363, с. 36].

Колькасць жанчын і падлеткаў сярод рабочых у параўнанні з даваеннай парой павялічылася ў 2 разы [94, с. 187]. Гэтаму істотна паспрыяў і закон ад 1 кастрычніка 1915 г., які дазваляў адступаць ад патрабаванняў закону аб працы непаўналетніх, падлеткаў і жанчын, занятых на прадпрыемствах, якія працавалі на вайну [264, с. 320].

Апроч унутраных рэзерваў беларускіх земляў, для падтрымкі існавання прамысловасці на патрэбным узроўні дзяржава актыўна выкарыстоўвала і знешнія. Так, у Оршы нават з'явіліся кітайцы, прыгнаныя з Сібіры ў жніўні 1916 г. У наступныя месяцы колькасць іх працягвала няўхільна расці [255, с. 106].

Умовы працы на ўсіх без выключэння фабрыках і заводах пакідалі жадаць лепшага. Істотна павялічыўся працоўны дзень (з улікам звыштэрміновых работ

Витебский государственный технологический университет

мог быць да 16 гадзін у суткі), значна вырас вытворчы траўматызм. Даволі часта можна было назіраць наступную карціну: “… служачыя, майстравыя і рабочыя паўгалодныя ідуць на працу і патрабуюць павялічыць паёк” [115, арк. 148]. Знясіленыя цяжкай працай, галодныя рабочыя часта паміралі, хварэлі, а замяніць іх не было каму. Да прыкладу, у Мінск з Гомеля была накіравана тэлеграма з наступнай просьбай: “…з-за хваробы 10-ці чыноўнікаў прашу распараджэння тэрмінова прыкамандзіраваць 7 чалавек. Непасільнай працай чыны надзвычай стомлены [140, арк. 227]. У адказе на яе было зазначана: “Свабодных чыноў у іншых установах няма. Абыходзьцеся наяўным складам” [140, арк. 228].

Да таго ж, у кастрычніку 1915 г. былі зацверджаны спецыяльныя “Правілы аб абавязковым нарадзе”, згодна з якімі для працы на ваенных заводах магло прыцягвацца ўсё працаздольнае насельніцтва з бліжэйшых мясцовасцей, за выключэннем асоб духоўнага звання, дзяржаўных служачых, навучэнцаў і выкладчыкаў. А пункты 15 і 16 гэтых “правілаў” сцвярджалі, што: “асобы, прыцягнутыя да выканання работ у парадку абавязковага нарада, не маглі спыняць свой удзел у іх … без пісьмовага дазволу адміністрацыі. Вінаватыя ў невыкананні гэтых правілаў альбо патрабаванняў маглі быць прыцягнуты мясцовым па вытворчасці работ губернатарам або градаaccount начальнікам да арышту тэрмінам да 3-х месяцаў альбо грашоваму спагнанню да 3-х тысяч рублёў” [264, с. 319].

Часам рабочыя шукалі хоць якой-небудзь дапамогі ў прафесійных саюзаў. Яны пісалі шматлікія заявы ў праўленні прафесійных саюзаў. Да прыкладу: “Аддаў на навучанне слесару механічнай працы свайго сына. Але з-за росту дарагавізны не маю магчымасці яго ўтрымліваць за такую мізэрную плату. А таму прашу ўстанавіць для майго сына адпаведны заробак. Бо мой сын выконвае ўсялякую працу ад 8-мі гадзін раніцы да 8-мі гадзін вечара” [104, арк. 3]. Такая заява была пададзена ў Віцебскі прафесійны саюз металістаў, які быў заснаваны 13 красавіка 1917 г. У ім быў зарэгістраваны 81 чалавек, з іх толькі 1 жанчына і 80 мужчын [104, арк. 19 – 19 адв.]. У гэтым выпадку просьба была задаволена, што было даволі рэдкай з’явай у той час. Між іншым, усяго рабочых гэтай галіны прамысловасці ў Віцебску налічвалася 300 чалавек. Гэта паказвае малую папулярнасць прафсаюзаў у рабочых горада.

Даволі часта ўзнікалі і канфлікты уладальнікаў з рабочымі, што працавалі на прыватных прадпрыемствах. Так, 21 мая 1917 г. у Савет рабочых дэпутатаў горада Віцебска паступіла заява ад загадчыка ігольнай фабрыкі І. Г. Левінсона. Там указвалася на некаторыя канфлікты з рабочымі, якія ўзніклі за апошні час: “Некаторыя рабочыя, спасылаючыся на рэзалюцыю цэнтральнага бюро прафесійных саюзаў, не дапускаюць на фабрыцы звыштэрміновай работы, што дужа негатыўна ўплывае на вытворчасць фабрыкі. Апроч таго, напярэдадні



Витебский государственный технологический университет

Святой Троіцы рабочыя пакінулі працу ў 11 гадзін раніцы, у той час як па правілах, напярэдадні святаў Троіцы, Вялікадня і Новага года праца павінна заканчвацца толькі на гадзіну раней звычайнага” [104, арк. 4]. Такія заявы і скаргі былі далёка не адзінкавымі. Але ж у пераважнай большасці выпадкаў спрэчкі і непаразуменні ўдавалася вырашаць мірным шляхам. Немалую ролю ў гэтым адыгрывалі і гэтак званыя “прымірэнчыя камеры”. Яны былі створаны, каб дапамагчы рабочым і прадпрымальнікам дасягнуць пэўнай згоды пры вырашэнні розных канфліктных сітуацый. Прымірэнчыя камеры арганізоўваліся ці пры прафесійных саюзах і іх секцыях, ці на буйных прамысловых прадпрыемствах. У іх уваходзілі не менш чым два прадстаўнікі ад рабочых і два – ад гаспадароў фабрыкі. Прычым, кожны бок меў і па два кандыдаты на выпадак хваробы або адсутнасці асноўных упаўнаважаных.

Умовы ваеннага часу вымагалі хуткага і аператыўнага вырашэння спрэчных сітуацый. Таму прымірэнчыя камеры прыступалі да ўрэгулявання канфлікту не пазней, чым за 24 гадзіны ад моманту паступлення скаргі [104, арк. 53]. Рашэнне прымалася большасцю галасоў, а старшынёй пасяджэння часцей за ўсё з’яўлялася спецыяльна запрошаная асоба, з правам дарадчага голасу. Грашовыя сродкі выдаткоўваліся на прымірэнчыя камеры як рабочымі, так і гаспадарамі прамысловых прадпрыемстваў. Калі ж члены прымірэнчай камеры не знаходзілі паміж сабой паразумення, то склікаўся трацейскі суд. Але ж гэта было хутчэй выключэннем з правілаў.

Адной з самых асноўных праблем, што ўзнікалі перад гарадскім насельніцтвам неакупіраваных беларускіх земляў у ваенны час, была забяспечанасць жыллём. Вельмі востра паўстала праблема проста знайсці сабе дах над галавой, не кажучы ўжо пра больш-менш камфортныя ўмовы пражывання. Зняць жа жытло з-за надзвычай высокіх цэн стала амаль нерэальна. Квартплата вырасла на 50 – 100 % [94, с. 187].

Пры велізарным наплыве прыезжых стала значна больш выгадна здаваць кватэры на суткі. Зняць жытло на месяц было амаль не магчыма. У гарадах расквітнеў новы прыбытковы бізнес. З’явіўся цэлы атрад пасрэднікаў, якія зводзілі ўладальнікаў кватэраў з кліентамі, за што мелі неблагія грошы.

Многія з тых, хто зняў жыллё раней, чым пачалася вайна, цяпер увогуле адмаўляліся плаціць арэндную плату. Гэта яскрава бачна з судовага іску І. Цітова да Р. Шчэдава, якія пражывалі ў Віцебску: “Сведка хадзіў па даручэнні істца да адказчыка па грошы, але жонка адказчыка праганяла яго, прычым, казала, што ў ваенны час можна не плаціць грошы за кватэру” [113, арк. 11 адв.]. Улічваючы гэтыя праблемы, 27 жніўня 1916 г. выйшла пастанова, якая забараняла павышаць кошт на кватэры ў гарадах Віцебскай губерні [113, арк. 13]. Аднак гэта была ініцыятыва выключна мясцовых улад, цэнтралізавана на неакупіраванай тэрыторыі такога распараджэння не было.

Витебский государственный технологический университет

Даволі часта парушаліся і правілы эксплуатацыі і ўтрымання жыллёвых памяшканняў. Вайна вымушала гараджан нават трымаць жывёлу ў сваіх кватэрах. Да прыкладу, у іску Фядота Пракоф'ева да грамадзянкі Марыі Асноўскай пазначана: "Утрымліваючы ў сябе ў доўг кватарантку Марыю Асноўскую, якая ўжо чатыры месяцы не плоціць за кватэру, спасылаючыся на тое, што я, з-за адсутнасці ў яе сродкаў не маю права з яе спаганяць матэрыяльныя сродкі, у кватэры ўтрымлівае коз, курэй і вылівае ў вокны памыі, з-за чаго ў кватэры збуцвелі вокны і бэлькі, на якіх стаяць печы, таму кватэра патрабуе ў самым хуткім часе капітальнага рамонту…" [112, арк. 228]. Цяжка было і рабіць рамонт у жыллёвых памяшканнях, бо катастрафічна не хапала прылад працы, кваліфікаваных майстроў, патрэбнай сыравіны, асабліва драўляных брусоў і балак.

Адсутнасць жылля стварала ў прыфрантавых раёнах шматлікія парушэнні заканадаўства і спекуляцыю ў гэтай сферы. Так, справаводца Упраўлення Чавускага павятовага ваеннага начальніка Гушча, апроч таго, што карыстаўся кватэрай у будынку ваеннага ведамства, у дадатак яшчэ і атрымліваў ад Бабруйскага аддзела па кватэрным забеспячэнні войскаў 17 рублёў 62 капейкі ў месяц і меў 60 рублёў "кватэрных" ад горада [162, арк. 1].

Асабліва цяжка было размяшчаць эвакуіраваныя сем'і. Эвакуіраваныя з Рыгі даслалі наступнае прашэнне начальніку чыгуначнай станцыі Віцебск: "…У горадзе Віцебску свабодных кватэр нават для адзіночак зусім нельга знайсці, нам жа як сямейным выключаецца ўсялякая магчымасць атрымаць кватэру, нягледзячы на розныя высілкі. …Ва ўмовах пастаянных канфліктаў з уладальнікамі кватэр, пазбаўленых прыбыткаў і сродкаў для прадастаўлення кватарантам неабходных умоў па асвятленні, дастаўцы вады, ачыстцы двара, карыстання кухнямі ці кухоннымі печамі і мэбляю. … Між тым як у нас няма ні стала, ні стула, ні ложка, ні нават матрацаў ці мяшкоў для набіўкі саломай [114, арк. 17].

Складана было і размяшчаць толькі што прыбыўшыя войскі і расквартароўваць афіцэрскі корпус. У адным толькі Мінску колькасць ваенных перавышала 100 тысяч чалавек. Перанасычанасць салдатамі назіралася ў Барысаве, Оршы, Гомелі, Магілёве. Гарадскія ўлады спрабавалі хоць нейкім чынам палепшыць гэтае становішча. Так, у жніўні 1915 г. Віцебская дума нават даручыла галосным думы і ганаровым грамадзянам горада абысці ўсе кватэры і скласці спісы кватэр, прыдатных для засялення [87, с. 195]. Зразумела, што прынятыя захады не маглі істотным чынам паўплываць на становучае вырашэнне праблемы.

Даходзіла да таго, што за шчасце лічылася пражываць нават у чыгуначным вагоне. Але так "шанцавала" не ўсім: "З вагона № 197 перавядзіце сям'ю тэлеграфіста Берзіна ў вагон № 2640, а халастых – у вагон № 2711.



Витебский государственный технологический университет

Класныя вагоны за № 2372, 2640, 2711, 315 і 309 часова пакінуць пад жытло, даўшы 10 дзён на пошук кватэры" [114, арк. 16]. Не зважаючы на маразы, вельмі часта людзей высялялі проста на вуліцу.

Вонкава амаль усе гарады нагадвалі ваенны лагер. Там заўсёды канцэнтравалася вялікая колькасць тэхнікі і ваенных, якія часам не займаліся выкананнем сваіх непасрэдных абавязкаў. Так, горад Мінск быў літаральна перапоўнены "…афіцэрамі, салдатамі, сёстрамі міласэрнасці, якія бязмэтна шлындалі, бадзяліся па вуліцах і плошчах" [131, арк. 205].

Вайна надзвычай ускладніла і працу работнікаў органаў аховы правапарадку. Іх катастрафічна не хапала, ды і заробкі ў гэтым ведамстве на той час былі ў параўнанні з іншымі не зусім вялікія. Дзеля прыкладу ў табліцы 3. 5 прывядзём каштарыс выдаткаў на ўтрыманне Віцебскай гарадской міліцыі ў 1917 г. [122, арк. 119].

Табліца 3. 5 - Каштарыс выдаткаў на ўтрыманне Віцебскай гарадской міліцыі ў 1917 г.

| Прадмет выдаткаў | Колькасць служачых | Месячны аклад у рублях |
|---|---|---|
| Начальнік міліцыі | 1 | 500 |
| Памочнікі начальніка міліцыі | 2 | 450 |
| Загадчык юрыдычным аддзелам | 1 | 500 |
| Сакратар | 1 | 400 |
| Справавод | 9 | 325 |
| Памочнік справавода | 17 | 275 |
| Канцылярскія служачыя | 24 | 250 |
| Машыністка | 1 | 250 |
| Рассыльны пры начальніку міліцыі | 3 | 125 |
| Вартаўнік | 5 | 250 |
| Начальнік участка | 4 | 425 |
| Памочнік начальніка ўчастка | 16 | 325 |
| Старшы міліцыянер | 28 | 300 |
| Міліцыянер паставы і для даручэнняў | 266 | 250 |
| Рассыльны пры начальніку ўчастка | 4 | 250 |
| На канцылярскія і гаспадарчыя выдаткі | | 300 |

Апроч сваёй непасрэднай дзейнасці, міліцыя даволі часта павінна была знаходзіць людзей, якія ўзялі пазыку і не аддалі яе. Так адбывалася нават з вайсковымі фарміраваннямі. Дзеля прыкладу: міліцыянеры мусілі пераслаць не



Витебский государственный технологический университет

вернутыя салдатамі грошы ў Казань у штаб 46-га армейскага корпуса ці запатрабаваць ад салдат апраўдаўчыя дакументы на выдаткаваныя грошы і таксама перасладь іх у штаб. Толькі за 1917 г. па даўгавых дакументах штаба 46-га армейскага корпуса не было вернута 7 тысяч 162 рублі 34 капейкі [122, арк. 128 - 129].

Пасля ўвядзення "сухога закону" надзвычай абвастрылася барацьба з самагонаварэннем. Адпаведна ўзраслі і патрабаванні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Яны павінны былі ўмець устанавіць прыроду і ўласцівасці вадкасцей, якія затрымалі, вымяраць колькасць і моцнасць напояў, даваць заключэнне аб прыдатнасці да патаемнага вінакурэння прыстасаванняў і матэрыялаў, весці перагонку знойдзеных вадкасцей, вызначаць від і гатунак тытунёвых вырабаў, каб устанавіць памер адказнасці [122, арк. 87]. Зразумела, што ўсё гэта адымала ад змагання з больш сур'ёзнымі небяспекамі шмат сіл і часу.

Ужо з пачатку 1915 г. амаль усе гарады неакупіраванай тэрыторыі Беларусі адчулі на сабе даволі істотны недахоп прадуктаў харчавання. Большая частка насельніцтва вымушана была весці напаўгалоднае існаванне. Пра скарачэнне паставак у беларускія гарады харчу яскрава сведчыць дынаміка паступлення пшанічнай мукі ў горад Мінск у 1916 г. Так, у студзені было прывезена 224000 пудоў, у лютым – 313000, у сакавіку – 222000, у красавіку – 204000, у траўні – 228000, у чэрвені – 257000, у ліпені – 133000, у жніўні – 45000. А за першы тыдзень верасня прыбыло ўсяго толькі 9580 пудоў [298, арк. 27 адв.]. Мінская губернская харчовая камісія зазначала, што калі такі парадак спраў захаваецца, яна будзе не ў стане выпісваць і дастаўляць насельніцтву пшанічную муку. Гэта пры тым, што запасы старой мукі былі ўжо амаль вычарпаны.

Органы дзяржаўнай улады па-свойму рэагавалі на такое становішча. Лічылася, што канцэнтрацыя вялікіх запасаў пшанічнай мукі ў непасрэднай блізкасці ад фронту не можа быць мэтазгоднай з-за магчымага імклівага наступу праціўніка. Таму лічылі неабходным "...па-магчымасці абмяжоўваць выдачу пасведчанняў прыватным асобам на яе правоз" [297, арк. 24 адв.].

Часта прывезеная мука была вельмі дрэннай якасці, а часам яе ўвогуле нельга было выкарыстоўваць. Да прыкладу, спецыяльная камісія, якая праводзіла агляд грэчневых круп, атрыманых 30 красавіка 1916 г. са станцыі Бярэзіна па накладной за № 7825, устанавіла, што "...крупы вельмі засмечаны, з вялікай прымессю свірэпкі, якую няма магчымасці вылучыць, на пах прэлая, не сухая, утварыліся камякі. Звараная з гэтых круп каша аказалася гаркавая, з прэлым пахам" [295, арк. 45].

У лютым 1916 г. жыхары Бабруйска наракалі на вялікі недахоп рыбы, вотрубаў, алею і на занадта высокія цэны на харчовую прадукцыю.

Витебский государственный технологический университет

Петраградская асобая нарада па харчы на гэта адказвала: “Устанавіць для Бабруйскага павета месячную норму вагонаў не ўяўляецца магчымым, бо агульная норма дазволеных да перавозкі грузаў мяняецца штомесяц [295, арк. 19].

Мінская губернская харчовая камісія на сваім пасяджэнні 20 верасня 1916 г. канстатавала, што “…адбываецца сістэматычнае скарачэнне нормаў цукру для Мінскай губерні, на чэрвень і ліпень была вызначана норма 123 вагоны, на жнівень і верасень – 100, пазней гэта сума была зменшана да 88 вагонаў, прычым, з гэтай колькасці толькі 54 вагоны абяцалі выслаць адразу, а 34 – пазней [298, арк. 7].

Інспектар Мінскай губерні паведамляў у Міністэрства гандлю і прамысловасці: “Цяпер жыць у Мінску, асабліва сямейным, становіцца амаль немагчымым. У сувязі з тым, што адсутнічае падвоз і горад перапоўнены войскамі, якія падчышчаюць запасы правізіі, што яшчэ захаваліся ў насельніцтва, цэны на харчаванне значна падняліся. Ні чорнага, ні белага хлеба ў горадзе купіць немагчыма, нават у рэстаранах, у тым ліку і першакласных, хлеб падаецца на абед не кожны дзень, цукар даўно не прадаецца. Няма свечак, газы” [44, с. 191]. У Мінску надзвычай вострая патрэба была ў масле і свіным сале [291, арк. 156].

Асобныя прыватныя прадпрымальнікі і дробныя гандляры харчовай прадукцыяй вымушаны былі ўвогуле спыніць сваю дзейнасць з-за значнага недахопу фінансавых сродкаў. Да прыкладу, Р. Л. Выгодскі 10 гадоў валодаў буйным бакалейным складам у Пінску, але з-за абставін ваеннага часу вымушаны быў усё кінуць і пераехаць да бацькоў у Слуцк [291, арк.160].

Тым не менш, былі і такія, хто прыстасаваўся выкарыстоўваць усе негатыўныя наступствы вайны. У гарадах квітнела спекуляцыя, “чорныя рынкі”, несанкцыянаваны ўладамі гандаль. Каб хоць якім-небудзь чынам супрацьдзейнічаць перакупшчыкам, дзяржава прымала пэўныя захады, але іх было недастаткова. Так, згодна з пастановай губернскіх харчовых камітэтаў ад 25 сакавіка 1917 г., “…усе прыватныя пагадненні па гандлі збожжам і іншыя збожжавыя аперацыі павінны былі быць неадкладна спынены. Усе гараджане губерні маглі мець у сябе запасы прадуктаў харчу толькі ў колькасці, неабходнай для пракорму членаў сваёй сям’і да 1 верасня, г. зн. не больш за 30 фунтаў align рознай мукі  і 3-х фунтаў круп у месяц на едака. Усе збожжавыя запасы прыватных прадпрымальнікаў пераходзілі ва ўладанне губернскага харчовага камітэта, таму такія ўладальнікі абавязаны былі неадкладна паведаміць губернскай харчовай управе пра месцазнаходжанне і колькасць іх запасаў. У выпадку выяўлення схаваных збожжавых запасаў яны адчужаліся на карысць дзяржавы па палавінным супраць цвёрдага кошце. За невыкананне гэтай пастановы вінаватыя падвяргаліся адказнасці па артыкуле 29 (…зняволенне ў

Витебский государственный технологический университет

турме тэрмінам да 1 года і 6 месяцаў)” [98, арк. 1]. Але ж на практыцы турэмнае зняволенне за дадзеныя віды правапарушэнняў прымянялася рэдка.

Многія гарады аказаліся нібы адрэзанымі ад месцаў забеспячэння іх самымі неабходнымі прадметамі спажывання [284, с. 105]. Згодна з паведамленнем харчовага камітэта ад 11 красавіка 1917 г., на складзе горада Віцебска на 1 красавіка меліся толькі наступныя прадукты: 16 вагонаў жытняй мукі, звыш за 10 тысяч пудоў цукру, каля 200 пудоў грэчневых круп, у нязначнай колькасці іншыя другасныя прадукты. Да таго ж зазначалася, што ”…прадукты, не атрыманыя служачымі за папярэднія месяцы, адпускацца не будуць, бо не адпускаюцца як Імперскім упаўнаважаным, так і інтэндантцвам. Пшанічнай мукі няма” [115, арк. 23].

З 1915 г. адчуваўся востры недахоп пшанічнай мукі, масла, яек у Оршы, Быхаве, Магілёве, Рагачове, Клімавічах [322, с. 118]. Пагроза голаду ні на адну хвіліну не пакідала гарадское насельніцтва, прымушала яго шукаць альтэрнатыўныя варыянты для пошуку ежы.

Апроч недахопу харчавання, месцічы пакутавалі на амаль поўную адсутнасць паліва для ацяплення. На дровы разабралі ўсе гарадскія драўляныя платы. Амаль цалкам спыніўся падвоз каменнага вугалю і газы. Большасць фабрык і заводаў перайшлі на ацяпленне дровамі [322, с. 116]. Цэны на дровы раслі бесперапынна. З 30-ці рублёў за сажань сасновых дроў і 40-ка рублёў за сажань бярозавых цэны выраслі адпаведна да 90 і 120 рублёў [322, с. 116].

Раслі цэны абсалютна на ўсе катэгорыі і віды тавараў. А рэальны заробак імкліва зніжаўся на ўсім працягу вайны (да 60-80 % ад даваеннага ўзроўню). Колькасць папяровых грошай вырасла за гады вайны ў 6 разоў, а іх залатое забеспячэнне скарацілася прыкладна да 15 % [64, с. 140].

Сярод насельніцтва актыўна распаўсюджваліся чуткі пра спыненне выплат па аперацыях ашчадных кас. Улады называлі іх “злоснай выдумкай” і рэкамендавалі захоўваць спакой [189, арк. 151]. Рабочыя і служачыя асобных прадпрыемстваў і ўстаноў не атрымлівалі зарплату па некалькі месяцаў [124, арк. 1]. Між тым касцюм, які ў кастрычніку 1914 г. каштаваў 25 рублёў, у кастрычніку 1916 г. прадаваўся ўжо за 130 [44, с. 19].

Зразумела, што такі стан рэчаў насельніцтва гарадоў неакупіраванай тэрыторыі Беларусі не магло ўспрымаць спакойна. Перыядычна ўспыхвалі забастоўкі на асобных фабрыках і заводах, у тым ліку і пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый, але часцей за ўсё яны былі дрэнна арганізаванымі і насілі стыхійны характар.

Витебский государственный технологический университет

## 3. 3 Паштова-тэлеграфная справа і чыгунка

Абставіны ваеннага часу вымагалі дасканалай, узгодненай і своечасовай працы работнікаў сувязі. Ад гэтага залежала аператыўнасць перадачы інфармацыі і каардынаванне дзеянняў паміж рознымі ведамствамі і рэгіёнамі, а таксама армейскімі падраздзяленнямі. Але ж ваеннае ліхалецце, недахоп фінансавых сродкаў і службовага персаналу, матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання, адсутнасць харчавання і фуражу, уносіла свае карэктывы ў функцыянаванне паштовай сістэмы.

Шмат хто з работнікаў паштова-тэлеграфнай службы эвакуіраваўся ўглыб Расійскай імперыі, бо проста не меў сродкаў для існавання. Некаторыя нават палічылі за лепшае "…застацца ў палоне ў Германіі па сваім жаданні…" [195, арк. 86], чым вяртацца на ранейшае месца працы. Але большасць служачых, у першую чаргу сямейных, эвакуіравалася на ўсход. Да прыкладу, у рапарце, які быў пададзены начальніку Полацкай паштова-тэлеграфнай канторы ад чыноўніка III разраду І. Баркевіча, зазначалася, што "…чыны Полацкага чыгуначнага паштовага аддзялення выехалі ўглыб Расіі, а я, выконваючы абавязак службы, не паспеў з'ехаць, прычым, дадаю, што ніякімі відамі грашовага забеспячэння ні за люты, ні за іншыя месяцы не забяспечаны" [195, арк. 72].

Не дужа ад яго адрозніваецца па змесце і рапарт ад наглядчыка Варанецкага паштова-тэлеграфнага аддзялення Ф. Ждановіча: "…начальнік Варанецкага паштова-тэлеграфнага аддзялення выехаў і да гэтага часу не вярнуўся. Аддзяленне афіцыйна мне не здаваў. Я, не атрымаўшы забеспячэння за тры месяцы наперад з-за адсутнасці сум у Варанецкім паштова-тэлеграфным аддзяленні, не маю гарантый на будучае атрыманне грошай, не разлічваю на далейшае пражыванне без забеспячэння і эвакуіруюся углыб Расіі, каб знайсці сабе хоць які пражытак" [195, арк. 86].

Фармальна ж работнікі пошты атрымлівалі даволі неблагі заробак. Гэта добра бачна з квітанцый для "…ўтрымання служачых Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі па часовых правілах ад 22 кастрычніка 1916 г.". Згодна з імі, чын 1-га разраду атрымліваў 1600 р. + 200 р. кватэрных; чын 3-га разраду – 1050 р. +140 р. кватэрных; чын 4-га разраду – 900 р. +150 р. кватэрных; чын 5-га разраду пры казённай кватэры – 600 р.; чын 6-га разраду 450 р. + 120 р. кватэрных; паштальёны, вартаўнікі і рассыльныя – ад 240 да 540 р. + ад 24 да 60 р. кватэрных; малодшы механік – 1050 р. + 210 р. кватэрных; старшы механік – 2000 р. + 325 р. кватэрных; начальнік тэлефоннай сеткі – 2400 р. + 400 р. кватэрных [189, арк. 219 - 219 адв.]. Але ж на самой справе заработная плата выплочвалася з затрымкамі ў некалькі месяцаў і не ў поўным аб'ёме.

Витебский государственный технологический университет

Нягледзячы на адсутнасць рэгулярнага заробку, некаторыя асобы спрабавалі ўладкавацца на працу ў паштова-тэлеграфныя аддзяленні, бо гэта давала ім права атрымаць легальнае вызваленне ад прызыву ў дзеючую армію. Скарыстаўшы такую магчымасць і атрымаўшы адтэрміноўку, многія неўзабаве пакідалі свае працоўныя месцы.

Лепельскі і Полацкі павятовыя камітэты па справах аб наданні адтэрміновак ваеннаабавязаным былі літаральна завалены прашэннямі, якія б скасоўвалі папярэднія хадайніцтвы аб вызваленні ад ваеннай службы. Найбольш часта яны прыходзілі з Чарсцвянскага і Гарбачова-Аляксандраўскага паштовых аддзяленняў [190, арк. 21-22]. Але ж знайсці гэтых людзей часта ўжо не было магчымасці.

Усё гэта не задавальняла кіраўніцтва краіны. Таму ў працэс мабілізацыі служачых пошты і тэлеграфа былі ўнесены даволі істотныя змены: адтэрміноўка давалася толькі ў выпадку заключэння новага кантракта на службу на новых умовах; адтэрміноўкі ад прызыву даваліся толькі фурманам, не маладзейшым за 36 гадоў [189, арк. 76 адв.]; адтэрміноўка паштова-тэлеграфным служачым, народжаным у 1898 г., давалася толькі тым, хто быў прыняты на службу паштова-тэлеграфнага ведамства да 1 лістапада 1916 г. [189, арк. 26]. Той жа, хто пакінуў службу, неадкладна прыцягваўся да выканання вайсковай павіннасці.

Паштова-тэлеграфныя станцыі зазналі надзвычай вострую патрэбу ў рабочых руках. Не хапала спецыялістаў пэўных профіляў. Таму была спрошчана нават працэдура прыёму на службу ў гэтыя ўстановы. Як адзначалася ў цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі, "…цяпер ніхто не карыстаецца асобымі перавагамі пры паступленні на службу, і права гэта ў аднолькавай ступені належыць усім грамадзянам Расійскай дзяржавы, без адрознення нацыянальнасці і веравызнання" [189, арк. 161].

Для паступлення на службу патрабаваліся наступныя дакументы: фотакартка, пашпарт, метрычнае пасведчанне, пасведчане ўрача аб стане здароўя, пасведчанне аб несудзімасці (за выключэннем выпадкаў суда па палітычных справах), пасведчанне аб адукацыі (для кандыдатаў на чыноўніка яно не павінна было быць меншае за курсы вышэйшага пачатковага вучылішча ці роўнае яму).

Выконваючы ўрадавую пастанову, начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі даслаў 27 лютага 1917 г. начальнікам паштова-тэлеграфных і паштовых устаноў Смаленскай акругі тэлеграму наступнага зместу: "Пан Смаленскі губернатар прызнаў магчымым дапушчэнне ў раёне Смаленскай губерні асоб іўдзейскага веравызнання да выканання абавязкаў фурманаў, але без права надання адтэрміновак ад прызыву ў войска" [189, арк. 76].

Витебский государственный технологический университет

Асоб, прызначаных на службу паштова-тэлеграфнага ведамства, сталі прыводзіць да прысягі новай формы, зацверджанай Часовым урадам. Былі заменены і бланкі клятвенных абяцанняў. А згодна з цыркулярам за № 5247, перасталі патрабаваць пасведчанні аб палітычнай добранадзейнасці і аб прыналежнасці да масонскіх ложаў [189, арк. 84].

З-за катастрафічнага недахопу мужчын на паштовай службе 12 лістапада 1916 г. МУС Расійскай імперыі (аддзяленне галоўнага ўпраўлення пошты і тэлеграфа) была прынята пастанова, згодна з якой быў дадзены дазвол на: "…прыняцце пісьменных жанчын на пасады паштальёнаў на аднолькавых з мужчынамі асновах і з тым, каб яны дапускаліся да ўсіх паштальённых абавязкаў, за выключэннем толькі суправаджэння пошты па трактах " [189, арк. 5]. Жанчын моцнага фізічнага складу, якія ўмелі кіраваць коньмі і былі не маладзейшыя за 25 гадоў, сталі браць на службу нават у якасці фурманаў [189, арк. 127].

Цяжкае становішча сваіх служачых, абумоўленае блізкасцю фронту, добра разумелі начальнікі паштова-тэлеграфных акруг. Персанал станцый вымушаны быў праводзіць большую частку дня на працы. Таму ўвесь час шукаліся шляхі, каб рабочыя мелі магчымасць "…атрымліваць па ўмераных цэнах гарбату, закуску, сняданкі і абеды" [189, арк. 29]. З гэтай мэтай непасрэдна пры ўстановах сталі арганізоўваць сталовыя. У тых выпадках, калі гэта было зрабіць немагчыма, пад сталовыя вызваляліся памяшканні, размешчаныя ў кватэрах саміх службоўцаў, якія знаходзіліся побач з месцам працы. За гэта ім плацілі невялікія грошы. Калі ж і такіх памяшканняў не хапала, то арандаваліся прыватныя кватэры.

І ўсё ж істотнай дапамогі з боку дзяржавы паштова-тэлеграфныя службы не мелі. На ўласныя патрэбы выкарыстоўваліся самастойна зробленыя грошы. Фонды паштова-тэлеграфных аддзяленняў папаўняліся ад продажу марак, канвертаў, бланкаў. Дадатковыя спагнанні браліся за міжнародныя паштовыя пераводы і накладныя плацяжы, за перасылку перыядычных выданняў. На карысць пошты ішла і палова камісійнага збору ад падпіскі на пачасовыя выданні; збор з праязджаючых на паштовых конях; зборы за міжнародныя пасылкі, што выдаюцца з мытняў і сумы, якія паступаюць па разліках за бандэрольную і пасылачную карэспандэнцыі [192, арк. 21 адв.].

Невялікую частку прыбытку складалі зборы за перадачу дэпеш; зборы ад эксплуатацыі ўрадавых  і прыватных тэлефонных сетак. Апроч гэтага, ішлі паступленні ад здачы ў арэнду казённых будынкаў, ад продажу даведнікаў, тэлеграфных тарыфаў, карт, часопісаў і г. д. [192, арк. 22 адв.]. Нерэгулярна прыходзілі паступленні ад розных спагнанняў і штрафаў (за парушэнне статутаў, законаў і пастаноў, за таемнае ўкладанне ў лісты і пасылкі і г. д.) [192, арк. 23 адв.].

Витебский государственный технологический университет

Невялікія грошы давалі гербавы збор і прабірны збор па каштарысе Міністэрства гандлю і прамысловасці [192, арк. 24 адв.]. А 24 лютага 1917 г. ва ўстановах паштова-тэлеграфнага ведамства адбылося ўвядзенне новай аперацыі – продаж гульнявых карт і марак ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі для аплаты збору з публічных відовішчаў і ўвесяленняў [192, арк. 75 адв.].

Згодна з пастановай міністра ўнутраных спраў па паштовай частцы ад 16 сакавіка 1917 г. на ўвесь час вайны і наступнага за ёй дэмабілізацыйнага перыяду на 60 % павялічвалася паштова-пасылачная такса на ўсе катэгоры малаважкіх пасылак. Самі стаўкі пасылачнай таксы паказаны ў табліцы 3. 6 [189, арк. 148 - 149].

Табліца 3. 6 - Стаўкі паштова-пасылачнай таксы

| За перасылку пасылак | У межах 1-га пояса | У межах 2-га пояса | У межах 3-га пояса | Паміж суседнімі паясамі | Праз адзін пояс |
|---|---|---|---|---|---|
| Першай катэгорыі (да 2-х фунтаў) | 40 капеек | 60 капеек | 75 капеек | 75 капеек | 1 рубель 5 капеек |
| Другой катэгорыі (ад 2-х да 7-мі фунтаў) | 75 капеек | 1 рубель 5 капеек | 1 рубель 40 капеек | 1 рубель 40 капеек | 2 рублі |
| Трэцяй катэгорыі (ад 7 да 12 фунтаў) | 1 рубель 5 капеек | 1 рубель 55 капеек | 2 рублі | 2 рублі | 3 рублі |

Калі ў лістах на імя салдат дзеючай арміі ваенная цэнзура знаходзіла грошы, то яны таксама канфіскоўваліся на патрэбу пошты [189, арк. 255]. Гэта выклікала справядлівыя нараканні з боку ніжэйшых чыноў, але ніякія меры па палепшванні сітуацыі не прымаліся.

Праца паштова-тэлеграфных службоўцаў надзвычай ускладнілася ў гады Першай сусветнай вайны. Апроч выканання сваіх непасрэдных функцыянальных абавязкаў, яны павінны былі пільна адсочваць і не дапускаць перасылкі за мяжу забароненых рэчываў або прадуктаў. На гэта існавала цыркулярнае прадпісанне ад 3 жніўня 1915 г. за № 32942 (са зменамі і дапаўненнямі ад 2-3 чэрвеня 1916 г. за № 16464) [191, арк. 16].

Витебский государственный технологический университет

8 лютага 1917 г. пастановай міністра ўнутраных спраў у адпаведнасці з загадам ад 8 жніўня 1916 г. быў забаронены прыём пасылак з рознымі моцнымі напоямі [187, арк. 52]. 10 траўня 1917 г. забаранілі вываз па ўсіх межах імперыі і ў Фінляндыю запалкавых аскепкаў і саломкі, а таксама маслянічнага насення [189, арк. 200]. А 18 мая 1917 г. быў забаронены вываз з Расіі па ўсіх межах неапрацаваных брыльянтаў, глюкозы і мяшкоў [189, арк. 208].

Але ж, нягледзячы на проста самаахвярную працу часткі паштова-тэлеграфных служачых, работа шэрага паштовых аддзяленняў выклікала справядлівыя нараканні з боку насельніцтва. З розных гарадоў і вёсак, а таксама і з розных часцей фронту паступалі скаргі на недастаткова ўважлівыя адносіны з боку паштова-тэлеграфных служачых да патрэб людзей і, у прыватнасці, на зусім недапушчальную з’яву: знікненне газет, лістоў, тэлеграм і пасылак [189, арк. 280].

Само ж кіраўніцтва поштай лічыла, што “…дрэнны стан паштова-тэлеграфнай справы залежыць у першую чаргу ад тэхнічнай адсталасці, атрыманай урадам рэвалюцыйнай Расіі ў спадчыну ад старой улады, ад недахопу штатаў, недахопу паштовых вагонаў, тэлеграфных апаратаў, паштова-тэлеграфных кантор. На працягу шэрага дзесяцігоддзяў тэхнічная пастаноўка справы адставала ад надзённых патрэб, і толькі прымяненнем патагоннай сістэмы старой уладзе ўдавалася падтрымліваць справу ў больш-менш здавальняючым стане” [189, арк. 262].

З перапіскі з паштовымі аддзяленнямі аб руху карэспандэнцыі можна даведацца пра “…масавыя недахопы наступнага характару: пераводы пры рэестрах праходзілі без суправаджальных дакументаў; на ярлыках у мяшках не пазначаліся нумары, і ярлыкі гэтыя, у большасці выпадкаў, не мелі адбітку штэмпеля, месца і часу адпраўлення; простая карэспандэнцыя атрымлівалася звязкамі вагой каля 3½ пудоў, без пазначэння на іх месца адпраўкі і прызначэння, прычым, карэспандэнцыя гэтая заўжды аказвалася несартаванай; даплатная карэспандэнцыя часта атрымлівалася ў выглядзе простай, і сума даплатнага збору выкарыстоўвалася няправільна” [191, арк. 49].

Адным з самых характэрных недахопаў у працы служачых пошты быў наступны: назіраліся шматлікія выпадкі засылак лістоў, адрасаваных у запасныя вайсковыя часці, аднайменным з назвамі вайсковых часцей дзеючай арміі (адрозніваліся ад апошніх толькі словам “запасныя”). У выніку чаго адбывалася масавая засылка лістоў і пасылак замест адной часці ў другую [195, арк. 19].

Многія з паштова-тэлеграфных устаноў імперыі пры прыёме і накіраванні пераводаў у дзеючую армію дапускалі істотныя адступленні ад правілаў, устаноўленых у адносінах да пераводаў: пераводы з адрасам у палкі, батальёны, дружыны і роты прымаліся без абазначэння роду зброі; пераводы ў

Витебский государственный технологический университет

палявыя шпіталі прымаліся без адрозных абазначэнняў “рухомы”, “запасны” ці “зводны”; шмат у якіх выпадках адсутнічалі лічбавыя найменні вайсковых часцей і ўстаноў; пераводы, адрасаваныя на імя воінскіх чыноў, якія знаходзіліся на фабрыках, заводах, лякарнях, а таксама і адрасаваныя за мяжу на імя ваеннапалонных, накіроўваліся ў галоўныя палявыя канторы; пост-пакеты з пераводамі на імя воінскіх часцей не прыпісваліся да звестак тых галоўных кантор, што іх складалі, а накіроўваліся да вузлавых пунктаў (гэта значыць з імі паступалі як з простай і пасылачнай карэспандэнцыяй); бясплатныя “салдацкія” пераводы, пры якіх часцямі войскаў вяртаюцца падавальнікам грошы, не выдадзеныя па тых або іншых прычынах, накіроўваліся на галоўныя палявыя канторы, між тым як такія пераводы варта адносіць было да ліку нераздадзенай карэспандэнцыі [189, арк. 31 – 31 адв.].

У гады вайны нярэдкімі сталі выпадкі, калі начальнікі паштова-тэлеграфных аддзяленняў задавольвалі прашэнні ад службоўцаў аб звальненні іх у водпускі і адгулы па хваробе, а таксама для суправаджэння хворых членаў сям’і да ўрача. Між тым, у такіх асоб вельмі часта адсутнічалі медыцынскія пасведчанні адпаведнага ўзору, якія б пацвярджалі факт хваробы служачага ці членаў яго сям’і [189, арк. 141]. Гэтым напоўніцу карысталіся асобныя супрацоўнікі пошты.

Некаторыя толькі што прызначаныя на службу паштальёны пад выглядам хваробы адмаўляліся ад выканання сваіх абавязкаў, асабліва ад разноскі карэспандэнцыі як галіны самай цяжкай, дзе патрабавалася вынослівасць і добрае здароўе. 30 снежня 1916 г. начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі зазначаў: “Хаця ад асоб, якія паступаюць на службу ў паштова-тэлеграфнае ведамства, і патрабуюцца медыцынскія пасведчанні, якія яны прад’яўляюць пры сваіх прашэннях, але гэтыя пасведчанні, як я мяркую, атрымліваюцца ад урачоў вельмі свабодна, без папярэдняга дэталёвага медыцынскага агляду. Таму здараюцца такія з’явы, што прынятая на службу асоба значыцца па выдадзеным яму пасведчанні абсалютна здаровай, а па прызначэнні яе да разносу карэспандэнцыі раптам заяўляе, што пакутуе ад рэўматызму ног і ў доказ гэтага прад’яўляе новае медыцынскае пасведчанне ад іншага ўрача” [189, арк. 9].

Калі такія выпадкі пачасціліся, было прынята рашэнне па магчымасці не прымаць на службу асоб са значным маёмасным цэнзам і ўвогуле матэрыяльнымі сродкамі. Бо яны ў пераважнай сваёй большасці імкнуліся паступіць на службу з мэтай пазбегнуць прызыву ў войска. Начальнікам устаноў было загадана кожны раз уступаць у зносіны непасрэдна з адпаведнымі паліцэйскімі ўладамі і прасіць іх паведамляць усе неабходныя звесткі пра асоб, што ўладкоўваліся на працу.

Витебский государственный технологический университет

З-за блізкасці фронту былі ў значнай ступені перагружаны тэлеграфныя лініі. Таму камісар Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі вымушаны быў даслаць ліст наступнага зместу начальнікам паштова-тэлеграфных і паштовых устаноў Смаленскай і Мінскай паштова-тэлеграфных акруг: “У апошні час у камісарыят паступае даволі значная колькасць тэлеграм па пытаннях, якія не маюць тэрміновага характару ці занадта распаўсюджаных. … Гэта замаруджвае перадачу на самой справе тэрміновых і важных на цяперашні момант тэлеграм. З-за гэтага загадваю, каб тэлеграмы дасылаліся толькі ў крайнім выпадку, калі на самой справе патрабуецца тэрміновае вырашэнне пытання, і пры тым іх змест павінен быць сціслым, але ў той жа час зразумелым. З вінаватых у парушэнні гэтага правіла будзе спаганяцца тарыфная аплата ў трайным памеры” [191, арк. 50].

Але ж асаблівага плёну такі загад не меў. Бо спецыяльныя меры па разгрузцы тэлеграфных ліній без якога-небудзь станоўчага выніку прымаліся яшчэ з вясны 1917 г. Так, яшчэ 8 сакавіка 1917 г. начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі лічыў неабходным: “Для большага скарачэння перапіскі і здымання з яе лішніх слоў у будучым як у рапартах, так і ў данясеннях на маё імя, так і пры зносінах паміж сабою зусім не ўжываць розныя тытулаванні (Высакароддзе і інш.)” [189, арк. 96]. 2 ліпеня 1917 г. прапаноўвалася ў выпадку змешанага зместу тэлеграмы (дзелавога-віншавальнага ці прывітальнага) віншавальную і прывітальную частку ліквідоўваць. А пры адмове тэлеграму з віншаваннем браць у шасціразовым памеры, з прывітаннем жа – увогуле не прымаць. Віншавальнымі лічыліся тэлеграмы з нагоды святаў дня анёла, дня нараджэння, юбілею і г. д. [189, арк. 247].

Шмат было хібаў і ў вядзенні дакументацыі работнікамі паштова-тэлеграфных аддзяленняў. Так, 29 снежня 1916 г. начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі наступным чынам ушчуваў начальнікаў паштова-тэлеграфных аддзяленняў: “Пры рэвізіі ўстаноў мною заўважана, што на некаторых паштова-тэлеграфных станцыях не вядуцца кантрольныя пераводныя журналы для запісу ўваходных і выходных пераводных дэпеш, а таксама і агульных пераводных кантрольных журналаў” [189, арк. 6]. Часам было немагчыма ўказаць з дакладнасцю час падачы тэлеграмы, таму што адбітак штэмпеля на квітанцыі не меў выразнага выгляду, пры слабым і няпоўным адлюстраванні лічбаў, якія абазначалі дату і месяц падачы тэлеграмы [189, арк. 56].

Некаторыя мясцовыя начальнікі няправільна забяспечвалі належным ім грашовым утрыманнем сваіх падначаленых, ад камандзіраваных на фронт для прызначэння ў палявыя ўстановы, а таксама не давалі гэтым асобам усіх

Витебский государственный технологический университет

патрэбных у такіх выпадках дакументаў, што прыводзіла да шматлікіх непаразуменняў і канфліктаў [189, арк. 42].

Журналы некаторых наглядчыкаў станцый увогуле не адпавядалі рэчаіснасці, вяліся фармальна і нерэгулярна. Часам там было занатавана, што ў адзін і той жа час наглядчык значыўся і дзяжурным пры апараце, і на лініі для ліквідацыі пашкоджанняў.  Альбо наглядчык у журнале ўказваў, што выехаць на лінію на працягу 4-5 гадзін не мог таму, што не было цягнікоў (не ўказваючы нумары цягнікоў і час следавання), між тым, згодна з даведкамі начальнікаў станцыі, цягнікі былі. Такія журналы начальнікі ўстаноў завяралі сваім подпісам, канешне, без усялякай праверкі адпаведнасці фактаў рэчаіснасці. Апроч таго, адсутнічалі распіскі рабочых аб атрыманні грошай, а калі такія і існавалі ў наяўнасці, то без указання губерні, павета, воласці і вёскі, адкуль быў наняты рабочы [189, арк. 48].

У некаторых выпадках на паштова-тэлеграфных станцыях мяшкі з простай і заказной карэспандэнцыяй набіваліся так шчыльна, што выманне яе не магло быць праведзена без пашкоджання пачак з простымі лістамі [189, арк. 135].

Адсутнасць дастатковай колькасці коней і фуражу для іх была ці не асноўнай праблемай для кіраўніцтва пошты. Аўтамабілі для гэтай справы яшчэ шырока не выкарыстоўваліся. У сакавіку 1916 г. Мінск і Магілёў атрымалі толькі 3 аўтамабілі для перавозкі пошты [519, с. 553]. А трэба ж было забяспечыць не толькі мясцовыя аддзяленні, але і палявыя пошты расійскай арміі. Таму асноўным сродкам перамяшчэння карэспандэнцыі служыла чыгунка і гужавы транспарт. Але ж нават пракарміць паштовых коней на той час было вялікай праблемай. Схема па задавальненні хадайніцтваў начальнікаў паштова-тэлеграфных акруг, аддзяленняў і кантор аб водпуску зернавога фуражу на ўтрыманне конных паштовых станцый была наступнай:

1. Усе паштовыя ўстановы па кожнай губерні заяўлялі кожны месяц сваю патрэбу ў зернавым фуражы начальніку належнай паштова-тэлеграфнай акругі з дакладным указаннем колькасці коней на асобных станцыях, сутачнай дачы ім моцнага корму (авёс, ячмень, вотрубы і макуха) і тэрміну, на які запрошваецца гэты корм.
2. Такая зводка па асобных губернях, пасля належнага пераканання начальнікаў акруг, накіроўвалася адпаведным губернскім упаўнаважаным старшыні асобай нарады па харчовай справе. Пасля чаго гэтыя зводкі ўключаліся ў план забеспячэння губерняў патрэбнай колькасцю вагонаў таго ці іншага зерневага фуражу.
3. Губернскія ўпаўнаважаныя па харчы ўключалі патрэбу харчовых устаноў у фуражы ў планавыя перавозкі і паведамлялі зробленыя нарады для



Витебский государственный технологический университет

наступнага ўліку ва ўправу асобаўпаўнаважанага па закупцы збожжа, цукру і солі для арміі [189, арк. 95].

Нягледзячы на ўсе прынятыя меры, фуражу ўсё роўна не хапала. З-за гэтага і з-за адсутнасці рэгулярнай заработнай платы масава пакідалі месца працы прыватныя перавозчыкі пошты. Начальнік Полацкай паштовай службы 17 снежня 1917 г. паведамляў: “Нягледзячы на тое, што падрадчыку перавозкі пошты Мядзведзеву павялічана плата за перавозку пошты з 4 да 16 тысяч рублёў у год і дадзена права яшчэ ўзбудзіць хадайніцтва аб дадатковай аплаце, ён, Мядзведзеў, катэгарычна адмовіўся ад далейшага выканання кантрактнага падраду і з 3 снежня спыніў перавозку, спасылаючыся на тое, што ў горадзе Полацку абсалютна нельга набыць фуражу для коней” [190, арк. 1].

Эмісару Полацкага павятовага харчовага камітэта паведамлялася пра ”…адсутнасць у горадзе Полацку ў дастатковай колькасці фуражу, неабходнага для ўтрымання 4-х коней для перавозкі пошты на 2 мясцовыя вакзалы і назад, а таксама і для ачысткі па горадзе паштовых скрыняў” [190, арк. 13]. Асаблівыя цяжкасці ўзнікалі пры перавозцы пошты з горада ў вёску: адсутнічалі добрыя шляхі зносін, а даплочваць за восеньскае і веснавое бездарожжа начальства адмаўлялася.

Пэўныя праблемы былі і з перавозкай пошты па чыгунцы. Паштовыя цягнікі амаль заўжды спазняліся. Не хапала персаналу для суправаджэння каштоўных грузаў. Таварныя вагоны, агульны кошт паштовага грузу якіх не перавышаў 5000 рублёў, пасылаліся без суправаджэння чыноў паштова-тэлеграфнага ведамства. Пры наяўнасці каштоўных пасылак агульным коштам болей за 5000 рублёў, таварныя вагоны накіроўваліся ў суправаджэнні аднаго ці больш паштальёнаў (у залежнасці ад памеру агульнага кошту грузу) [189, арк. 137].

Час знаходжання ў дарозе паштальёнаў павінен быў быць не болей за адны суткі, пасля чаго яны замяняліся паштальёнамі з іншых устаноў. На жаль, гэтыя патрабаванні вельмі часта заставаліся толькі на паперы. Пры суправаджэнні таварных вагонаў паштальёны мусілі размяшчацца альбо на пляцоўцы таго вагона, у якім накіроўваліся пасылкі, альбо на пляцоўцы суседняга таварнага вагона [189, арк. 138], але ж нават тэхнічна такой магчымасці часта не было.

Каб палепшыць працу паштова-тэлеграфнага персаналу пры суправаджэнні цягнікоў, 14 сакавіка 1917 г. начальнік аддзела вайсковага руху Упраўлення Ваенных Зносінаў тэатра ваенных дзеянняў тэлеграмаю за № 912/п, зрабіў распараджэнне аб”…бесперашкодным дапушчэнні чыноў паштова-тэлеграфнага ведамства ва ўсе цягнікі, апроч экстраных і літэрных, для следавання іх па справах службы, што выклікана ваеннымі абставінамі…”, а

Витебский государственный технологический университет

таксама аб забеспячэнні іх належнымі пасведчаннямі для бесперашкоднага праезду ў цягніках” [189, арк. 110].

Паштова-тэлеграфная служба ў гады вайны мусіла працаваць у шчыльным саюзе з усімі міністэрствамі Расійскай імперыі, а асабліва з Міністэрствам фінансаў. Прынамсі, пры прыёме адрасаваных за мяжу паштовых адпраўленняў, у якіх аказваліся ўкладзенымі рускія крэдытныя білеты, належала кіравацца цыркулярнымі прадпісаннямі ад 7 студзеня і 21 лютага 1916 г. за № 656 і 8742. У іх гаварылася, што ўкладанні названых адпраўленняў не могуць перавышаць 500 рублёў, незалежна ад таго, ці гэта рускія крэдытныя рублі прыватных асоб, ці крэдытных устаноў; прычым, ад адпраўшчыка трэба было патрабаваць пасведчанне асобы і асобых заяў аб тым, што грошы перасылаюцца на імя асоб, якія не належаць да падданства варожых Расіі краін. Паштовыя адпраўленні з укладзенымі рускімі крэдытнымі білетамі на суму звыш 500 рублёў маглі перасылацца за мяжу толькі з асобага ў кожным выпадку дазволу міністра фінансаў [189, арк. 20].

Шчыльна супрацоўнічала пошта і з ваеннай разведкай і цэнзурай. Так, згодна з цыркулярнымі прадпісаннямі ад 23 верасня 1915 г., 29 лістапада 1916 г. і 8 сакавіка 1917 г. за №42681, 36171 і 6193 і цыркулярнай тэлеграмы ад 3 кастрычніка 1915 г. за № 45061, не дапускалася ўкладаць у пасылкі, адрасаваныя на імя рускіх ваеннапалонных у непрыяцельскія краіны розныя пісьмовыя паведамленні (запіскі, лісты, паштовыя карткі) [189, арк. 216]. Уважліва праглядаліся і ўсе паштовыя пасылкі, адрасаваныя непрыяцельскім ваеннапалонным, якія знаходзіліся на сельскагаспадарчых і грамадскіх работах [189, арк. 214].

Не былі рэдкасцю для начальнікаў паштова-тэлеграфных аддзяленняў і наступныя загады ад ваеннага ведамства: “Спыніце прыём радыётэлеграм, якія падлягаюць перадачы праз радыёстанцыю Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў, размешчаную на берагах Атлантычнага акіяна і Мексіканскага заліва, а таксама па прызначэнні – Багамскія астравы. Тэлеграмы з прызначэннем Філіпінскія астравы дапускаюцца толькі на англійскай мове, прычым, з поўнымі адрасамі і подпісам“ [189, арк. 142].

Дзіўна, але ж цяжкае становішча паштовай справы часта ўскладнялася яшчэ і рознымі непаразуменнямі з боку мясцовага насельніцтва. Паведамлялася, што “…тэлеграфныя лініі, якія праходзяць праз павятовыя мясцовасці, асабліва па сёлах і вёсках, падвяргаюцца пастаяннаму псаванню, якое ўчыняюць маласвядомыя элементы. Да ліку звычайных такіх пашкоджанняў адносяцца: біццё падлеткамі і дзецьмі ізалятараў і накідванне на правады розных прадметаў” [189, арк. 268]. Зразумела, што на ліквідацыю наступстваў такіх учынкаў выдаткоўваліся пэўныя фінансавыя сродкі. І гэта ў

Витебский государственный технологический университет

той час, калі на асобных паштова-тэлеграфных станцыях не было грошай, каб набыць паперу [194, арк. 142].

Ад часу свайго з'яўлення на тэрыторыі Беларусі (сярэдзіна XIX стагоддзя) чыгунка займала надзвычай важнае месца ў жыцці нашага народа. Яшчэ болей узрасла яе роля і значэнне пасля пачатку Першай сусветнай вайны. Гэты від транспарта актыўна выкарыстоўвалі для перавозкі зброі і боепрыпасаў, салдат, пры эвакуацыі мясцовага насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей. Таму і ўвага да стану чыгуначных ліній, станцый, прыпыначных пунктаў з боку ўлад была вельмі пільнай. А ў загадах і тэлеграмах ваеннага часу чыгунку нярэдка называлі "…галоўным нервам дзяржавы" [122, арк. 75]. Да таго ж , насычанасць Беларусі чыгункамі была ў 1,8 раза вышэйшай, чым па Еўрапейскай частцы Расійскай імперыі [79, с. 365].

У гады Першай сусветнай вайны абслугоўванне чыгуначных ліній вельмі ўскладнілася. Да звычайных праблем дадалося і многа новых, непасрэдна звязаных з блізкасцю фронту і ваенным становішчам. У 1916 г. цалкам па імперыі ¼ частка лакаматыўнага парка выйшла са строю альбо была захоплена ворагам [53, с. 69].

Асабліва напружанай была сітуацыя з перанасычанасцю чыгуначных станцый вагонамі. З-за гэтага шмат якія цягнікі не паспявалі своечасова прыбыць у пункты прызначэння. Корань гэтай праблемы быў у тым, што каля чыгуначных станцый амаль не існавала складоў для захоўвання зброі, боепрыпасаў, інжынерных грузаў, ежы і абмундзіравання для фронту. А замест складоў выкарыстоўваліся звычайныя вагоны, якія часта стаялі непасрэдна на чыгуначным палатне.

У 1916 г. гэту праблему паспрабавалі вырашыць за кошт дакладнай рэгламентацыі для ўсіх вайсковых фарміраванняў і ўстаноў дапушчальнай колькасці выкарыстання імі вагонаў пад склады. Так, эканамічныя таварыствы мелі права "…трымаць на колах не больш за 4 вагоны на кожным пункце" [112, арк. 1 адв.] . Для ўсіх станцый і чыгуначных вузлоў была вызначана колькасць вагонаў "на колах", якія маглі там знаходзіцца адначасова: "Вілейка – 35 вагонаў, Сеславін – 20, Полацк – 10, Варапаева – 5, Пруды – 15…" [114, арк. 9]. Вагоны, занятыя звыш нормы, неадкладна вызваляліся падчас пастаянных праверак. Камендантам чыгуначных участкаў і начальнікам станцый за месяц прыходзіла да дзясятка тэлеграм, якія былі дужа падобныя па сваім змесце: "…прашу як мага больш хуткага распараджэння, калі маюцца занятыя звыш устаноўленых нормаў вагоны, зараз жа вызваліць іх і пра гэта паведаміць для хуткага данясення Загадчыку перамяшчэннем войскаў Мінскага раёна" [114, арк. 1 адв.].

Нормы занятых вагонаў і парадак іх разгрузкі часам змяняліся. Але заўжды заставалася нязменным правіла: "…вагоны з мукой і зернем для фронту

Витебский государственный технологический университет

прымаць і адпраўляць па прызначэнні з перавагай перад іншымі грузамі і маршрутнымі цягнікамі без ніякай затрымкі” [116, арк. 51]. На графікі адыходу цягнікоў уплывалі не толькі форс-мажорныя сітуацыі, звязаныя з перадыслакацыяй вайсковых груповак, нечаканым пачаткам якой-небудзь ваеннай аперацыі, але і звычайная патрэба “… для перавозкі адпускнікоў-салдат” [117, арк. 7]. Для гэтага выдзяляліся дадатковыя цягнікі, што стварала пэўныя цяжкасці для зладжанай працы чыгункі.

Часам на чыгуначных станцыях і прыпынках здараліся даволі значныя крадзяжы, асабліва харчовых запасаў, прызначаных для забеспячэння войска. Бывала, што забіралі толькі частку прадуктаў, а вагоны па-новаму пламбіравалі і ставілі пячатку: “…з-за заявы загадчыка галоўным харчовым складам аб тым, што па прыбыцці са станцыі Ягоцін вагона з цукровым пяском, пломбы на якім няясныя і стан іх выклікае недавер у цэласнасці грузу, прашу дэлегіраваць прадстаўніка ад Камітэта для прысутнасці пры ўскрыцці і аглядзе вагона” [115, арк. 6].

Сапраўдным бедствам для нармальнага функцыянавання чыгункі быў востры крызіс паліва для патрэб дарогі [116, арк. 44]. Катастрафічна не хапала дроў, вугалю, газы. У сувязі з гэтым Упраўленне Рыга-Арлоўскай чыгункі вымушана было выдаць пастанову, дзе між іншым загадвалася неадкладна і тэрмінова:

– скараціць выдачу газы для асвятлення сігналаў і паравозаў на 25%, службовых памяшканняў і ліхтароў “люкс” – на 50%;
– служачым, якія займаюць казённыя кватэры з асвятленнем, устанавіць нормы на газу, зніжаныя на 50% і ва ўсякім выпадку не вышэйшыя за нормы, прынятыя для жыхароў горада ці мястэчка;
– рэкамендаваць змяншаць колькасць слупавых ліхтароў, запальваць іх як мага пазней і тушыць як мага раней, у ночы, калі свеціць месяц, ні ліхтары слупавыя, ні “люксавыя” не запальваць [119, арк. 24].

У выніку дайшло да таго, што “…пачасціліся выпадкі следавання пасажырскіх цягнікоў у цёмны час з неасветленымі ці дрэнна асветленымі вагонамі. Праваднікі вагонаў часта адсутнічалі, а кандуктарскія брыгады за гэтым не назіралі ” [117, арк. 59]. Усё гэта істотным чынам адбівалася на росце крымінальных злачынстваў, асабліва разбояў і крадзяжоў.

Асобным галаўным болем для кіраўніцтва чыгункай былі пастаянныя скаргі пасажыраў. Пераважную большасць з іх складалі заявы на атрыманне без чаргі білетаў, якіх увесь час не хапала. Так, “…насільшчыкі багажу і станцыйныя вартаўнікі неаднаразова спрабавалі атрымаць білеты праз акенца касы па-за чаргой альбо заходзілі дзеля гэтай мэты ў касу праз бакавыя дзверы” [117, арк. 19]. Недахоп білетаў і беднасць пераважнай часткі насельніцтва прыводзіла да таго, што адбываліся “…частыя выпадкі праезду пасажыраў без

Витебский государственный технологический университет

білетаў і дакументаў, якія іх замянялі, або па няправільных білетах і дакументах” [117, арк. 41].

Гэта ўсё вяло да амаль поўнай адсутнасці сродкаў для абслугоўвання чыгункі. Выратоўвалі толькі крэдыты, якія Упраўленне чыгункай вымушана было браць у вялізнай колькасці для вырашэння наступных задач: аднаўленне зруйнаваных ліній; абсталяванне і ўтрыманне школы і курсаў для падрыхтоўкі лінейных служачых; выдача прэмій; нарыхтоўка дроў для пераходу з вугальнага на дрывяное ацяпленне; выраб здымных вагонных кузаваў для патрэб ваеннага ведамства; утрыманне цягніка Паходнага Атамана і асабістага складу пры ім; арганізацыя баз; абсталяванне і ўтрыманне танных сталовак; утрыманне штатаў галоўных рамонтных цягнікоў; арганізацыя харчовай часткі; утрыманне асабістага склада па арганізацыі харчовай часткі; эксплуатацыю далучаных да дарогі галін; плата служачым, майстрам і рабочым і г.д. [121, арк. 78 адв.].

Але ж далёка не ўсе просьбы па крэдытах задавальняліся. Так, былі значна зменшаны альбо ўвогуле адменены асігнаванні на выдачу прэмій агентам службы Руху і Цягі за паляпшэнне манеўравай працы, за фарміраванне цягнікоў дальняга руху і за паляпшэнне таварных і вайсковых цягнікоў; друк ілюстраванага паказальніка па Рыга-Арлоўскай чыгунцы; уплату часткі выдаткаў на ўтрыманне аддзела па нарыхтоўцы вугалю; узнагароджанне асабістага саставу доктарскай службы і г.д. [121, арк. 99].

Сапраўднай карай для работнікаў чыгункі быў пастаянны недахоп прадуктаў харчавання. Часам здаралася так, што з-за поўнай адсутнасці прадуктаў на бліжэйшых кірмашах прыходзілася іх прывозіць “…з такіх аддаленых мясцовасцей, як Самарская, Тамбоўская і Палтаўская губерні і Данская вобласць, з-за чаго пэўныя прадукты знаходзіліся доўгі час у дарозе” [126, арк. 29 адв.]. Калі ж прадукты ўсё ж прыходзілі на вузлавыя станцыі, то ўзнікалі значныя праблемы па іх размеркаванні. Асабліва цярпелі пры гэтым падзённыя рабочыя. Ім належала атрымліваць прадукты толькі на саміх сябе, а на жонак і дзяцей такія не выдаваліся: “Усім падзённым рабочым, хаця б і сямейным, варта выдаваць прадукты як адзінокім” [115, арк. 83].

Такая жорсткая мера была ўведзена ў сувязі з тым, што лічылася, быццам бы падзённыя рабочыя ў абсалютнай сваёй большасці пражывалі ў вёсках. А там яны мелі свой сялянскі надзел і, апроч таго, карысталіся правам атрымліваць прадукты ад гарадскіх, сельскіх або земскіх арганізацый. Зразумела, што гэта было не заўжды так. Толькі 1 мая 1917 г. выйшла пастанова, згодна з якой “…любы падзённы рабочы, які лічыў сябе на асобым становішчы, мог падаць хадайніцтва ў Камітэт з указаннем месца жыхарства сям’і і абавязкам прадаставіць пасведчанні аб неатрыманні прадуктаў у

Витебский государственный технологический университет

грамадскіх арганізацыях" [115, арк. 59 - 59 адв.]. Вядома ж, што далёка не ўсе такія хадайніцтвы задавальняліся.

Не лепшымі былі справы і з забеспячэннем харчам штатных работнікаў чыгункі: "Атрыманне прадуктаў харчавання сустракае каласальныя цяжкасці. Служачым, майстрам і рабочым дарогі, а таксама іх сем'ям прыходзіцца цярпець моцную патрэбу ў ежы" [115, арк. 59]. 6 красавіка 1917 г. харчовы камітэт устанавіў наступныя нормы выдачы прадуктаў і цэны на іх: "…жытняя мука – па 15 фунтаў на едака пры кошце 2 рублі 60 капеек за пуд; цукар – 2,5 фунта на едака пры кошце 28 капеек за фунт; грэчневыя крупы – па 10 фунтаў на картку сямейным, а халастым – па 5 фунтаў" [115, арк. 17]. Даволі частымі былі выпадкі страты прытомнасці работнікамі чыгункі на сваіх працоўных месцах.

Звычайнымі на той час былі і сітуацыі, калі абсалютная большасць работнікаў чыгункі не магла атрымаць прадукты па картках з-за іх адсутнасці. А на наступны месяц гэтыя карткі ўжо не прымаліся, бо лічыліся пратэрмінаванымі. Так, на станцыі Віцебск Рыга-Арлоўскай чыгункі па стане на 1 красавіка 1917 г. у наяўнасці было толькі: "…16 вагонаў жытняй мукі, звыш за 10000 пудоў цукру, каля 200 пудоў грэчневых круп і нязначная колькасць іншых другасных прадуктаў. Пшанічнай мукі ўвогуле не было" [115, арк. 23]. Прычым, паведамлялася, што прадукты, якія служачыя не паспелі атрымаць за папярэдні месяц, адпускацца не будуць, бо яны не адпускаюцца як імперскім асобаўпаўнаважаным, так і інтэнданцтвам.

Недахоп прадуктаў выклікаў розныя канфлікты паміж служачымі чыгункі. Даходзіла і да адкрытых рабаванняў. Так, служачы Стражаў заявіў, што: "…падчас атрымання 16 траўня 1917 г. сельскагаспадарчых прадуктаў з харчовай лаўкі ў яго была забрана дзяжурнымі членамі прадуктовая картка" [115, арк. 149].

Часам здараліся і супрацьстаянні паміж штатнымі супрацоўнікамі чыгункі і эвакуіраванымі з заходнебеларускіх земляў іх калегамі. Палескае Упраўленне чыгункі з цэнтрам у Гомелі ўвогуле адмовілася ўзяць на сваё забеспячэнне сем'і эвакуіраваных служачых з іншых чыгунак [115, арк. 30]. Матывавалася гэта тым, што харчовыя прадукты адпускаюцца строга па колькасці едакоў, а сем'і эвакуіраваных служачых могуць жыць у межах гарадоў і пасяленняў і атрымліваць прадукты ад грамадскіх арганізацый.

Яшчэ больш цяжкае становішча было на невялічкіх станцыях і прыпынках. Гэта яскрава бачна з тэлеграмы, дасланай са Старога Сяла ў Віцебск 21 красавіка 1917 г. "…спынена выдача харчу службоўцам чыгункі і іх сем'ям. У прыватным продажы харч адсутнічае пасля ўвядзення хлебнай манаполіі, запасаў хлеба няма. Харчовая лаўка апошні раз была на станцыі 21 сакавіка. Служачыя, каб не адрывацца ад выканання сваіх непасрэдных

Витебский государственный технологический университет

абавязкаў, не могуць ездзіць у горад па харч. Норма па 15 фунтаў жытняй мукі ў месяц дужа недастатковая. Патрэбна хуткая дапамога” [115, арк. 81].

Блізкая па змесце і тэлеграма са станцыі Болва ад 21 сакавіка 1917 г., у якой згадваецца, што служачыя станцыі Болва не атрымалі за люты месяц харчу з прадуктовай лаўкі [115, арк. 134]. Харчаванне на дробныя чыгуначныя станцыі дастаўлялася ў лепшым выпадку 1 раз на 2-3 месяцы. У харчовых лаўках адсутнічалі не толькі нормы выдачы прадуктаў на кожнага члена сям’і, але і цэны. А ўсё гэта прыводзіла да спекуляцый і эканамічных злачынстваў у сферы гандлю.

Амаль з усіх невялікіх станцый ішлі скаргі і патрабаванні забяспечыць рабочых і служачых хаця б хлебам: “…служачыя многіх станцый звяртаюцца са скаргамі на нерэгулярнае забеспячэнне іх прадуктамі” [115, арк. 143].

На некаторых прыпынках і станцыях існавалі буфеты. Але цэнтралізаванага забеспячэння іх прадуктамі не было, хоць яны і адносіліся да чыгункі. Некаторым буфетчыкам у адкрытую прад’яўляліся абвінавачванні ў камерцыйнай дзейнасці.

Апроч голаду, абсалютна на ўсіх чыгуначных станцыях катастрафічна не хапала жылля. Бо ў ім мелі патрэбу як мясцовыя рабочыя і служачыя чыгункі, так і эвакуіраванае насельніцтва. У дадатак да ўсяго патрэбна было недзе размяшчаць і салдат, якія ўвесь час прыбывалі. У прашэнні на імя начальнікаў станцый указваецца, што “ў гарадах свабодных кватэр нават для адзінокіх зусім немагчыма знайсці, а нам як сямейным выключана ўсякая магчымасць атрымаць кватэру, нягледзячы ні на якія высілкі” [114, арк. 17]. Тыя ж, хто ўсё-такі здолеў зняць кватэру, меў пастаянныя канфлікты з домаўладальнікамі з-за асвятлення, ацяплення, вады, карыстання кухнямі, печкамі і мэбляй. А пераважная большасць кватарантаў не мела не толькі стула, стала і ложка, але нават матрацаў ці мяшкоў, набітых саломай.

Даволі значная частка насельніцтва на станцыях увогуле жыла непасрэдна ў вагонах, з якіх іх пастаянна перасялялі ці проста выкідвалі на вуліцу. Начальнікам чыгуначных станцый пастаянна прыходзілі тэлеграмы ад вайсковага начальства. Прычым, змест іх за рэдкім выключэннем быў прыблізна наступны: “Прашу штомесяц не пазней кожнага 30 чысла паведамляць ведамасцямі пра ўсе занятыя пад жыллё ўстановамі ваеннага ведамства і Чырвонага Крыжа вагоны з указаннем нумара і фірмы вагона, а таксама пра ўсе змены ў саставе вагонаў” [114, арк. 4].

Былі ўстаноўлены цэлыя нормы, згодна з якімі чыгуначныя батальёны карысталіся вагонамі для пражывання. Ніжэйшыя чыны размяшчаліся ў “цяплушках” з разліку 24 чалавекі на вагон. Для штаба ж батальёна вылучаліся: ”…2 мяккія класныя, 3 вагоны чацвёртага класа, 3 “цяплушкі”, 4 крытыя нармальныя і 2 крытыя Фокс-Арбеля, усяго 14 вагонаў. У дадатак – адзін вагон



Витебский государственный технологический университет

чацвёртага класа, дзе маецца царква, 1 ”цяплушка” пад заразных хворых і 1 вагон чацвёртага класа пад лазарэт” [114, арк. 2].

З аналізу актаў агляду вагонаў, прыстасаваных пад жыллё, бачна, што ў большасці з іх не было кранаў для рукамыйнікаў, а з усяго ўнутранага абсталявання ў наяўнасці толькі змацаваныя між сабою дошкі [117, арк. 15]. Санітарны стан саміх станцый і чыгуначнага палатна таксама быў нездавальняючы: “Назіраннямі ўстаноўлена, што прыбіральні пасажырскіх саставаў пры падачы іх на станцыі для пасадкі, а таксама пры працяглых стаянках адкрыты і пасажыры карыстаюцца імі, пры гэтым страшэнна забруджваючы станцыйныя пуці. На дзвярах прыбіральняў адсутнічаюць аб’явы з просьбай не карыстацца імі на прыпынках” [117, арк. 65].

Апроч прыстасавання вагонаў пад жыллё, яны яшчэ выкарыстоўваліся ваеннымі службамі і арганізацыямі пад харчовыя пункты, перавязачныя пункты, лазні, лабараторыі, прыёмныя псіхіятрычныя пункты, месцы для выпрабавання процівагазаў; склады з бензінам і г.д.

Эвакуіраваным рабочым і служачым чыгункі, апроч жылля, трэба было знайсці і працу. А гэта было вельмі няпроста. Шмат хто з іх аказваўся “лішнім”, “непатрэбным”, бо закрываліся раз’езды, паркавыя пуці, вузлавыя станцыі і скарачаліся асобныя віды работ. Былі пастаянна запатрабаваны толькі памочнікі начальнікаў станцый і начальнікі раз’ездаў. Астатнім работнікам чыгункі часта прыходзілася мяняць сваю кваліфікацыю і шукаць новую працу. Так, у 1915 г. на Рыга-Арлоўскай чыгунцы з 47 начальнікаў станцый без працы засталіся 15, з 75 стрэлачнікаў – 10, з 42 вартаўнікоў – 12, з 10 сігналістаў – 3 [120, арк. 201].

Апрача эканамічных цяжкасцей, работнікі станцый зазналі на сабе і недахопы ў сістэме кіравання чыгункай. Само кіраўніцтва разумела, што адным з найбольш шкодных тормазаў работы дарогі з’яўляліся разрозненыя дзеянні мясцовых прадстаўнікоў асобных службаў, калі шмат якія пытанні вырашаліся без узаемадзеяння паміж сабой па адзінаўладным меркаванні і не заўжды на карысць справы або ўвогуле губляліся ў перапісцы. Упраўленне чыгункі не магло з належным поспехам кіраваць дзейнасцю мясцовых лінейных прадстаўніцтваў.

Каб палепшыць справу ў галіне кіравання, на ўсіх вялікіх станцыях пачалі ствараццца Тэхнічна-Гаспадарчыя Камітэты, якія павінны былі працаваць поруч з выбарнымі камітэтамі, не ўмешвацца ў іх працу, не тармазіць яе і тым больш не аказваць на гэтыя камітэты ніякага ўціску. Але асаблівага плёну гэтыя змены ў сістэме кіравання не далі. Даходзіла да таго, што пэўныя рашэнні не маглі давесціся да рабочых па простай прычыне – не было паперы, каб іх надрукаваць. У тэлеграме ад 22 снежня 1917 г. Упраўленне дарогі заклікае “…з-за абмежаванай колькасці бланкаў і недахопу паперы ўвогуле просім

Витебский государственный технологический университет

расходаваць іх вельмі ашчадна" [116, арк. 66]. Асобныя загады і распараджэнні перадаваліся толькі ў вуснай форме.

**Такім чынам**, сельская гаспадарка і сялянства неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны сутыкнуліся са шматлікімі цяжкасцямі. Востра стаяла праблема недахопу рабочых рук (больш за палову працаздольнага мужчынскага насельніцтва было адпраўлена на фронт). Іх не маглі ў поўнай меры замяніць ні шырокае выкарыстанне працы ваеннапалонных, бежанцаў і нават добраахвотных дружын навучэнцаў розных устаноў.

Недахоп рабочых рук, коней, сельскагаспадарчых прылад працы прывёў да скарачэння пасяўных плошчаў. Знізіўся жыццёвы ўзровень сялян. Вясковае насельніцтва стала пераходзіць ад рынкавай да натуральнай гаспадаркі. Гэта прывяло да істотных затрымак і перабояў з пастаўкамі харчовых прадуктаў у лаўкі і крамы.

Істотным чынам змянілася жыццё гарадскога насельніцтва ў гады вайны. Пагаршэнне ўмоў працы і эканамічнага становішча рабочых шмат у чым прывяло да сацыяльнага выбуху 1917 г. Найбольш важныя ў стратэгічным плане прамысловыя аб'екты былі эвакуіраваны на ўсход, а некаторыя фабрыкі і заводы – дэманціраваны.

Прадпрыемствы пераводзіліся на ваенныя рэйкі. Армейскія заказы выконвалі тэкстыльныя, абутковыя, харчовыя фабрыкі і заводы. Ужо ў канцы 1914 г. заказы ваеннага ведамства выконвалі 217 прадпрыемстваў Беларусі. Асобныя катэгорыі рамесных майстроў з-за сваёй нізкай запатрабаванасці вымушаны былі мяняць профіль дзейнасці.

Надзвычай востра перад гарадскім насельніцтвам стаяла "жыллёвае пытанне". Кватплата вырасла амаль у два разы. Адсутнасць жылля стварала спрыяльныя ўмовы для рознага кшталту спекуляцый і злоўжыванняў службовымі паўнамоцтвамі.

Паштова-тэлеграфная служба ў гады Першай сусветнай вайны сутыкнулася са шматлікімі праблемамі: катастрафічна не хапала грашовых сродкаў, асабліва на поўныя і своечасовыя выплаты заработнай платы. Адчувалася адсутнасць істотнай фінансавай падтрымкі і належнай увагі з боку дзяржавы. Недахоп кваліфікаваных кадраў урэшце прывёў да таго, што амаль не было каму працаваць (кіраўніцтва поштай нават вымушана было наймаць жанчын на працу фурманамі; уводзіць рознага кшталту паслабленні, ільготы і заахвочванні пры прыёме на працу і г. д.). Забяспечанасць коней фуражом была на нізкім узроўні. Бездарожжа ў восеньскі і веснавы час амаль цалкам паралізоўвала дастаўку карэспандэнцыі да асобных населеных пунктаў. Усё гэта адмоўным чынам уплывала не толькі на будзённае жыццё насельніцтва, але і на сам зыход ваеннага канфлікту, на яго слабае інфармацыйнае

Витебский государственный технологический университет

асвятленне, на адсутнасць узаемадзеяння паміж рознымі ведамствамі і населенымі пунктамі.

Рабочыя і служачыя чыгуначных станцый пакутавалі ад пастаяннага недахопу харчу, адсутнасці ўласнага жылля, належнага медыцынскага абслугоўвання, жорсткага рэжыму ўсеагульнай эканоміі. Пастаянная перагружанасць чыгуначных ліній прыводзіла да прамаруджвання пры перамяшчэнні войскаў і ваенных грузаў, слабага забеспячэння салдат усім неабходным на тэатры ваенных дзеянняў. Цэлыя гарады з-за малой прапускной здольнасці чыгуначных артэрый аказваліся перад пагрозай голаду і дэфіцыту прадметаў першай неабходнасці.

Витебский государственный технологический университет

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі даследавання**

1. Адносіны насельніцтва да вайны не былі аднароднымі. Маральна-псіхалагічная і ідэйна-палітычная кансалідацыя большасці насельніцтва, інтэграцыя яго высілкаў у барацьбе са знешнім ворагам адсутнічалі. Часовыя змены ў стаўленні да ваенных дзеянняў адбываліся з-за нестабільнай сітуацыі не толькі на фронце, але і ўнутры краіны. Актыўная агітацыя і прапаганда, якая толькі зараджалася на дзяржаўным узроўні і была скіравана ў першую чаргу на фарміраванне нянавісці да ворага, не здолела прынесці чаканых вынікаў. Салдаты не жадалі падаўляць пратэстныя настроі мясцовага насельніцтва, а часам і аказвалі ім спачуванне і падтрымку.

Абсалютная большасць насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі крайне негатыўна ўспрымала вайну, бо добра ведала, што тая ім прынясе.

2. У поўнай меры цяжкасці ваеннага часу адчула на сабе сельская гаспадарка краіны. З-за імклівага росту цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю былі зруйнаваны механізмы тавараабмену ў краіне, актыўна расквітнелі спекуляцыя і перакупніцтва. Адміністрацыйна-выканаўчая ўлада не магла належным чынам кантраляваць скупку і перапродаж прадуктаў з мэтай нажывы, самавольнае павышэнне цэн. Законы цэнаўтварэння перасталі функцыянаваць, і мясцовыя ўлады перайшлі да палітыкі таксавання цэн і нарміравання спажывання.

Пасяўныя плошчы і колькасць пагалоўя жывёлы зменшыліся амаль на 20 %. Цяжкім ярмом на гаспадарку краіны легла ўтрыманне бежанцаў: не хапала харчавання, ігнараваліся санітарна-медыцынскія ўмовы іх утрымання. Справядлівае абурэнне і хваляванні вясковага насельніцтва выклікалі шматлікія рэквізіцыі, абавязак забяспечваць армію ўсім неабходным і прымаць удзел у розных дапаможных абарончых работах: рыццё акопаў, ахова ваенных аб’ектаў, дарог, мастоў і г. д.. Сялянам не хапала сельскагаспадарчых машын і прылад працы, а пастаўкі з тылавых рэгіёнаў Расійскай імперыі змяншаліся год ад году.

3. Жыццё гарадскога насельніцтва ў гады вайны зазнала на сабе значныя змены. Блізкасць лініі фронту абумовіла зусім іншы, чым раней, лад жыцця. Надзвычай ускладніліся ўмовы працы, назіраўся амаль поўны застой у камунальнай гаспадарцы. Рост заробкаў не паспяваў за ростам цэн. Гараджане вымушаны былі працаваць паўгалоднымі да 16 гадзін у суткі ў халодных, неацепленых памяшканнях за мізэрную плату. З-за вялікай

Витебский государственный технологический университет

колькасці прызваных у армію катастрафічна не хапала вузкіх спецыялістаў, шырока выкарыстоўвалася праца жанчын і падлеткаў, нават на цяжкіх работах і ў начны час. Масавае бежанства прывяло да таго, што ў гарадах на ўсім працягу вайны не была вырашана праблема забеспячэння насельніцтва жыллём. Гэта стварала спрыяльную глебу для пашырэння інфекцыйных захворванняў.

Руйнаванне эканамічных механізмаў тавараабмену, выкарыстанне чыгуначных ліній у першую чаргу для ваенных патрэб негатыўна адбіліся на пастаўках у горад харчовых тавараў. Гэта вяло да імклівага росту цэн і спекуляцый. Увесь час існавала пагроза голаду. Адчуваўся недахоп прадуктаў першай неабходнасці. Тактыка "выпаленай зямлі", якая часам прымянялася беспадстаўна, прывяла да ліквідацыі важных прамысловых аб'ектаў. Цэлы шэраг прамысловых аб'ектаў быў эвакуіраваны на ўсход, углыб Расійскай імперыі. Толькі ў 1915 г. былі вывезены 432 фабрычна-завадскія прадпрыемствы.

Умовы ваеннага часу дыктавалі зусім іншыя патрэбы арміі і насельніцтва. У выніку ў пэўных галінах вытворчасці (цагельная, кафлявая, шкларобчая, вінакурна-гарэлачная і г. д.) назіраўся істотны крызіс, які прывёў да масавага закрыцця прадпрыемстваў адпаведнай скіраванасці. З другога боку, тэкстыльныя, швейныя, абутковыя, хлебапякарна-сухарныя, ільнопрадзільныя, тытунёвыя, харчовыя прадпрыемствы, усе мясцовыя металаапрацоўчыя заводы атрымлівалі безліч ваенных заказаў, што дапамагала ім не проста выжываць, але і павялічваць аб'ёмы вытворчасці. 2/3 рабочых цэнзавай прамысловасці былі заняты выпускам абароннай прадукцыі.

4. За гады вайны з неакупіраваных беларускіх земляў у рэгулярную армію было прызвана 682,2 тысячы чалавек, што склала крыху болей за палову ад агульнай колькасці працаздольных мужчын, якія пражывалі на гэтай тэрыторыі. Па сваім сацыяльным становішчы абсалютна большая частка прызыўнікоў была сялянамі. Мабілізацыйныя мерапрыемствы праходзілі ў напружанай абстаноўцы і нярэдка суправаджаліся актыўным супраціўленнем навабранцаў, якое яны аказвалі афіцэрам і мясцовай паліцыі. Мясцовае насельніцтва актыўна прыцягвалася да выканання акопных работ, аховы чыгуначных ліній і мастоў.

5. Насельніцтва неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны пакутавала ад недахопу кваліфікаваных медыцынскіх работнікаў, крытычнага недахопу матэрыяльных сродкаў. Шмат якія стацыянарныя лякарні і фельчарскія пункты перасталі функцыянаваць. Фінансаванне дзяржаўных лячэбных устаноў праводзілася па астаткавым прынцыпе. Маёмасна забяспечаныя катэгорыі насельніцтва аказвалі істотную



Витебский государственный технологический университет

дапамогу дзяржаве ў санітарна-медыцынскай справе. Назіраліся істотныя праявы людской салідарнасці, праводзіліся ахвяраванні як прыватнымі асобамі, так і грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі. Але дзяржаўная ўлада падазрона адносілася да любых праяў сацыяльнай актыўнасці і грамадскай ініцыятывы.

6. Ад узгодненай і якаснай працы чыгункі і пошты залежала не толькі становішча ўнутры краіны, але і сітуацыя на франтах. Але ж чыгуначнаму транспарту, які быў зарыентаваны на першачарговае забеспячэнне патрэб арміі, не ўдавалася падтрымліваць неабходны аб'ём перавозак грамадзянскіх грузаў. Улады сутыкнуліся з амаль поўнай адсутнасцю сродкаў для абслугоўвання чыгункі. Выратоўвалі толькі крэдыты, якія Упраўленне чыгункі вымушана было браць у вялізнай колькасці для вырашэння наступных задач: аднаўленне зруйнаваных ліній, абсталяванне і ўтрыманне школы і курсаў для падрыхтоўкі лінейных службоўцаў, выдача прэмій, нарыхтоўка дроў для пераходу з вугальнага на дрывяное ацяпленне; выраб здымных вагонных кузаваў для патрэб ваеннага ведамства.

Істотныя карэктывы ўнесла вайна і ў працу паштова-тэлеграфных аддзяленняў. Аператыўнасць перадачы інфармацыі пакідала жадаць лепшага. Адчуваўся істотны недахоп фінансавых сродкаў і службовага персаналу. Якасць працы пунктаў сувязі выклікала шматлікія нараканні з боку мясцовага насельніцтва.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў работы**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Фактaлагічны матэрыял будзе карысным пры распрацоўцы спецкурса "Беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны" і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі Беларусі. Практычная значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў іх магчымым ужыванні для працягу навуковых даследаванняў гісторыі Беларусі першай чвэрці XX стагоддзя.

Витебский государственный технологический университет

# ПЕРАЛІК УМОЎНЫХ АБАЗНАЧЭННЯЎ

**ГХК** – Губернскі харчовы камітэт
**ДАВВ** – Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
**ДАГВ –** Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці
**ДАМВ –** Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці
**ЗДАгП** – Занальны Дзяржаўны архіў у горадзе Полацку
**ЗемГор –** аб'яднаны камітэт Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам і Усерасійскага саюза гарадоў
**МАГУГШ** – Мабілізацыйнае аддзяленне Галоўнага Упраўлення Генеральнага штаба
**МТАДВ –** Мінскае таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам
**МУС** – Міністэрства ўнутраных спраў
**НГАБ** – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
**РСДРП(б)** – Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (бальшавікоў)
**УСРМ** – Усерасійскі саюз рабочых металістаў
**ЦВПК** – Цэнтральны ваенна-прамысловы камітэт
**ЦКВТД –** Цэнтральны камітэт ваенна-тэхнічнай дапамогі

Витебский государственный технологический университет

## Бібліяграфічны спіс


1. Абамелек-Лазарев, С.С. Задачи России и условия прочного мира / С.С. Абамелек-Лазарев. – Пг.: Тип. З. Соколинского, 1915. – 76 с.
2. Абрамович, Н.Я. Патриотизм и революционная Россия / Н.Я. Абрамович. – М.: Кошница, 1917. – 32 с.
3. Авилов, Б.В. Настоящее и будущее народного хозяйства России: влияние войны, возможные последствия её для народного хозяйства и проблема будущего / Б.В. Авилов. – Пг.: Жизнь и знание, 1916. – 86 с.
4. Аврамов, В.Г. Жертвы империалистической войны в России / В.Г. Аврамов // Известия Народного комиссариата здравоохранения РСФСР. – 1920. – № 1/2. – С. 39–42.
5. Адамушко, В. И. Архивные источники о событиях Первой мировой войны в Беларуси / В.И. Адамушко // Юстыцыя Беларусі. – 2008. – № 6. – С. 22–24.
6. Айрапетян, М.Э., Кабанов П.Ф. Первая мировая империалистическая война 1914–1918 гг. / М.Э. Айрапетян, П.Ф. Кабанов – М.: Просвещение, 1964. – 207 с.
7. Алёхина, Е.В. Тамбовское земство в годы Первой мировой войны 1914–1918 гг.: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.В. Алёхина; Тамбов. гос. ун-т. – Тамбов, 2005. – 25 с.
8. Анкета о дороговизне и борьбе с ней в губерниях Киевской, Подольской, Волынской, Полтавской и Черниговской. – Киев: Тип. Киевского коммерческого института, 1915. – 22 с.
9. Анфимов, А.М. Помещичье хозяйство России в годы первой мировой войны (до Февральской революции) / А.М. Анфимов // Исторические записки. – 1957. – Т. 60. – С. 121–175.
10. Анфимов, А.М. Российская деревня в годы Первой мировой войны (1914 – февр. 1917 г.) / А.М. Анфимов. – М.: Соцэкгиз, 1962. – 383 с.
11. Аранович, А.В. Интендантство русской армии накануне и в годы Первой мировой войны: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / А.В. Аранович; Санкт-Петерб. гос. ун-т. – СПб., 2000. – 21 с.
12. Ардашев, Н.Н. Великая война и женщины русские / Н.Н. Ардашев. – М.: Тип. Ф.Я. Пригорина, 1915. – 112 с.
13. Асіноўскі, С.М. Антынямецкі ўзброены рух на Беларусі ў 1918 г. / С.М. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2000. – № 6. – С. 110–120.
14. Асіноўскі, С.М. Беларусь у акупацыйных планах кайзераўскай Германіі / С.М. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2000. – № 4. – С. 105–113.


Витебский государственный технологический университет

15. Асіноўскі, С.М. Вакханалія рабавання: эканамічная палітыка нямецкіх акупантаў на Беларусі (1915–1918 гг.) / С.М. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 1999. – № 4. – С. 47–54; № 5. – С. 31–38.

16. Асташов, А.Б. Союзы земств и городов и помощь раненым в Первую мировую войну / А.Б. Асташов // Отечественная история. – 1992. – № 6. – С. 169–172.

17. Астрога, В.М. Вясковае настаўніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны / В.М. Астрога // Першая і Другая сусветныя войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7 мая 2005 г. / Гістарычная майстэрня; адк. рэд.: В.Ф. Балакіраў, К.І. Козак. – Мінск, 2006. – С. 20–23.

18. Багдановіч, М.А. Агляд працы за першы год Мінскага Аддзела Беларускага Таварыства для помачы пацярпеўшым ад вайны / М.А. Багдановіч // Полымя. – 1981. – № 12. – С. 189–191.

19. Базанов, С.Н. Национальное рыцарство / С.Н. Базанов // История: Изд. дом «Первое сентября». – 2004. – № 36. – С. 6–12.

20. Базилевич, М.П. Положение русских пленных в Германии и отношение германцев к населению занятых ими областей Царства Польского и Литвы: материалы, собранные доктором М.П. Базилевичем в плену и среди 110 вернувшихся из германского плена русских врачей / М.П. Базилевич. – Пг.: Тип. А.С. Суворова, 1917. – 208 с.

21. Барсуков, Е.З. Подготовка России к войне в артиллерийском отношении / Е.З. Барсуков. – М.-Л.: ГВИЗ, 1926. – 328 с.

22. Барынкин, В.П. Крестьянство западных губерний России накануне Октябрьской революции (население, социально-экономические отношения, аграрно-крестьянское движение в 1917 г., по материалам Калужской, Орловской, Смоленской губерний): автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / В.П. Барынкин; Брянский гос. ун-т. – Брянск, 1996. – 23 с.

23. Бахтурина, А.Ю. Государственное управление западными окраинами Российской империи (1905 – февраль 1917 г.): автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра ист. наук: 07.00.02 / А.Ю. Бахтурина; РГГУ. – М., 2006. – 46 с.

24. Бахтурина, А.Ю. Окраины Российской империи: государственное управление и национальная политика в годы Первой мировой войны (1914–1917 гг.) / А.Ю. Бахтурина. – М.: Росспэн, 2004. – 388 с.

25. Бахтурина, А.Ю. Политика Российской империи в Восточной Галиции в годы Первой мировой войны / А.Ю. Бахтурина. – М.: АИРО XX, 2000. – 263 с.

Витебский государственный технологический университет

26. Бежанства 1915 года / рэд. В.Луба. – Беласток: Праграм. рада тыднёвіка «Ніва», 2000. – 416 с.

27. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914 – 1918): сб. документов / сост.: В.В. Врублевский [и др.]; редколл.: В.И. Адамушко (председатель) [и др.]. – Минск: Беларусь, 2014. – 355 с.

28. Белевская, М.Я. Ставка Верховного Главнокомандующего в Могилёве, 1915–1918 гг.: личные воспоминания / М.Я. Белевская. – Вильно: М.Ф. Соколов, 1932. – 52 с.

29. Белявина, В.Н. Беларусь в годы Первой мировой войны / В.Н. Белявина. – Минск: Беларусь, 2013. – 398 с.

30. Белинский, А.И. Учащиеся средней школы на полевых работах в 1916 году / А.И. Белинский. – Могилёв: Тип. И.Б. Клаза и М.Л. Кагана, 1917. – 40 с.

31. Белогурова, Т.А. Отражение общественных настроений в российской периодической печати 1914 – февраль 1917 гг.: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / Т.А. Белогурова; Брянский гос. ун-т. – Брянск, 2006. – 28 с.

32. Бережной, А.Ф. Русская легальная печать в годы первой мировой войны / А.Ф. Бережной. – Л.: Изд-во Лениград. у-та, 1975. – 152 с.

33. Беркевич, А.Б. Крестьянство и всеобщая мобилизация в июле 1914 г. / А.Б. Беркевич // Исторические записки: [междунар. альманах] / РАН, Отд-ние истории. – М.: Наука, 1947. – Т. 23. – С. 3–43.

34. Биншток, В.И. Народное питание и народное здравие в войну 1914–1918 гг. / В.И. Биншток, Г.С. Каминский. – М.-Л.: Тип. Наркомздрава СССР, 1929. – 172 с.

35. Бобков, А.М. Беженцы в Беларуси в годы Первой мировой войны (1915–1917) / А.М. Бобков // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусі: усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Тэзісы дакладаў і паведамленняў, Мінск, 3–5 лют. 1993 г.: у 2 ч. / БДУ; Мінск, 1993. – Ч. 1. – С. 131–138.

36. Бобков, А.М. Политика германского империализма в Белоруссии в годы первой мировой войны: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / А.М. Бобков; Бел. гос. ун-т. – Мн., 1983. – 20 с.

37. Бовыкин, В.И. Из истории возникновения первой мировой войны: отношения России и Франции в 1912–1914 гг. / В.И. Бовыкин. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1961. – 208 с.

38. Болтин, Е. Очерки мировой войны 1914–1918 гг. / Е.Болтин, Ю.Вебер. – М.: Воениздат, 1940. – 148 с.

Витебский государственный технологический университет

39. Большевики в годы империалистической войны 1914 – февраль 1917 гг.: сб. док. местных большевистских организаций / Центр. архив революции. – М., 1939. – 228 с.

40. Большевики и армия в 1905–1917 гг. / М.И. Ахун [и др.]. – Л.: Красная газета, 1929. – 348 с.

41. Бородин, Ф.М. Мировая война 1914–1918 гг. / Ф.М. Бородин. – М.: Воениздат, 1939. – 72 с.

42. Брусилов, А.А. Мои воспоминания / А.А. Брусилов. – Мн.: Харвест, 2003. – 432 с.

43. Букшпан, Я.М. Военно-хозяйственная политика: формы и органы регулирования народного хозяйства за время мировой войны 1914–1918 гг. / Я.М. Букшпан. – М.-Л.: Гос. изд-во, 1929. – 541 с.

44. Бяспалая, М.А. Першая сусветная вайна на беларускіх землях ва ўспамінах відавочцаў / М.А. Бяспалая // Первая мировая война: история, геополитика, уроки истории и современность: к 90-летию окончания Первой мировой войны и нач. формирования Версальско-Вашингтонской системы междунар. отношений: материалы междунар. науч. конф., Витебск, 11–12 нояб. 2008 г. / редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: Витеб. гос. ун-т, 2008. – С. 189–192.

45. Важнейшие законы, указы и распоряжения военного времени: сб. законов, манифестов, указов Правительства Сенату и министрам / сост. С.М. Левин. – Пг., 1915. – 728 с.

46. Вардин, И.В. Российский пролетариат и мировая война / И.В. Вардин. – М.: Госиздат, 1924. – 64 с.

47. Введенский, И.Н. Опыт принудительной трезвости / И.Н. Введенский. – М.: Издание Московского Столичного Попечительства о Народной Трезвости, 1915. – 47 с.

48. Великая забытая война / А.А. Свечин [и др.]. – М.: Эксмо: Яуза, 2009. – 588 с.

49. Вельяминов-Зернов, А.В. К вопросу об организации первых трудовых дружин учащихся для оказания помощи семьям призванных в Минской губернии / А.В. Вельяминов-Зернов. – М.: Тип. т-ва И.Д. Сытина, 1916. – 35 с.

50. Венедиктов, А.В. Война, рост цен и старые контракты / А.В. Венедиктов. – Пг.: Изд-ие редакции «Вестника финансов». – 1917. – 40 с.

51. Вержховский, Д.В. Первая мировая война 1914–1918 гг. / Д.В. Вержховский. – М.: Воениздат, 1954. – 116 с.

52. Вержховский, Д.В. Первая мировая война 1914–1918 гг. / Д.В. Вержховский, В.Ф. Ляхов. – М.: Воениздат, 1964. – 274 с.

Витебский государственный технологический университет

53. Верт, Н. История Советского государства: 1900–1991 / Н. Верт. – М.: ИНФРА-М, 2001. – 544 с.

54. Верховский, А.И. На трудном перевале / А.И. Верховский. – М.: Воениздат, 1959. – 448 с.

55. Верховский, А.И. Россия на Голгофе: из походного дневника / А.И. Верховский. – Пг.: Пятая гос. тип., 1918. – 141 с.

56. Весялкоўскі, Ю. Беларусь у Першай сусьветнай вайне / Ю. Весялкоўскі. – Беласток, Лондан. – 1996. – 361 с.

57. В-ик, Л. Уголок немецкой оккупации: из жизни города Полоцка с момента оккупации его немецкими войсками (февраль–июнь 1918 года) / Л. В-ик. – Пг.: Изд. Петрогр. Совета рабочих и крестьянских депутатов, 1918. – 31 с.

58. Вильно-Молодеченская операция (август–сентябрь 1915 г.). – СПб, 1916. – 15 с.

59. Виноградов, В.Н. Ещё раз о новых подходах к истории Первой мировой / В.Н. Виноградов // Новая и новейшая история. – 1995. – № 5. – С. 112–123.

60. Виноградов, К.Б. Буржуазная историография первой мировой войны: происхождение войны и междунар. отношения, (1914–1917 гг.) / К.Б. Виноградов. – М.: Соцэкгиз, 1962. – 402 с.

61. Вітан-Дубейкаўская, Ю. Мае ўспаміны / Ю. Вітан-Дубейкаўская. – Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 1994. – 38 с.

62. Война в воздухе и наши герои-авиаторы. – Одесса, 1914. – 16 с.

63. Война и Костромская деревня: по данным анкеты стат. отд-ния. – Кострома: Тип. Х. А. Гелиш, 1915. – 125 с.

64. Война и общество в XX веке: Война и общество накануне и в период первой мировой войны / Рос. акад. наук, Институт всеобщей истории, Ассоциация историков первой мировой войны. – М.: Наука, 2008. – 611 с.

65. Война и промышленность: хроника с 1 января по 30 июня 1916 года. – Харьков, 1916. – 420 с.

66. Войнилович, Э. Воспоминания / Э. Войнилович. – Мн.: Минская римско-католическая парафия св. Симона и Елены, 2007. – 379 с.

67. Волобуев, П.В. Пролетариат и буржуазия России в 1917 году / П.В. Волобуев. – М.: Мысль, 1964. – 358 с.

68. Вопросы мировой войны: сб. ст. / под ред. М.И. Туган-Барановского. – Пг.: Право. – 1915. – 674 с.

69. Воронкова, С.В. Материалы Особого совещания по обороне государства: источниковедческое исследование / С.В. Воронкова. – М.: Изд-во МГУ. – 1975. – 147 с.

Витебский государственный технологический университет

70. Воронов, Д.Н. Жизнь в деревне в дни трезвости (по данным земских и других анкет) / Д.Н. Воронов. – Пг.: Госуд. типогр. , 1916. – 49 с.

71. Воронов, Л.Н. Война и народное хозяйство / Л.Н. Воронов. – М., 1915. – 64 с.

72. Всероссийская сельскохозяйственная перепись 1916 г.: Могилёвская губерния: итоги предварительного подсчета населения, скота и посевов / Могилев. губерн. земство, Стат. отд-ние. – Могилёв, 1916. – 72 с.

73. Гаврилов, М. Первая мировая империалистическая война (1914–1918): науч.-попул. очерк / М. Гаврилов. – Куйбышев: Куйбышевское обл. изд-во, 1939. – 72 с.

74. Гапоненко, Л.С. О численности и составе населения России накануне Великой Октябрьской социалистической революции / Л.С. Гапоненко, В.М. Кабузан, Т.Ф. Кузьмина // Исторический архив. – 1962. – № 5. – С. 57–82.

75. Гапоненко, Л.С. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов, 1917 / Л.С. Гапоненко. – М.: Гос. изд. полит. лит., 1953. – 194 с.

